WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 СТУДЗЕНЯ 2012 г.
АЎТОРАК
№ 9
(27124)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

З 1 СТУДЗЕНЯ ЎСТАНАЎЛІВАЮЦЦА ДАПЛАТЫ ДА ПЕНСІЙ АСОБАМ, СТАРЭЙШЫМ ЗА 75 ГАДОЎ

Адпаведны ўказ № 35 «Аб павышэнні пенсій» падпісаў 16 студзеня кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Дакумент прыняты ў мэтах дадатковай матэрыяльнай падтрымкі пажылых людзей. Указам прадугледжваецца ўстанавіць з 1 студзеня 2012 года даплаты да пенсій асобам, старэйшым за 75 гадоў, у тым ліку: 75 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце — асобам, якія дасягнулі ўзросту 75 гадоў; 100 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце — асобам, якія дасягнулі 80 гадоў.

Такім чынам, памер даплаты ў студзені 2012 года для асоб, старэйшых за 75 гадоў, складзе Br107,8 тыс., старэйшых за 80 гадоў — Br143,7 тыс.

Устанаўленне даплат да пенсій асобам ва ўзросце, старэйшым за 75 гадоў, дасць магчымасць знізіць вастрыню іх аб'ектыўнай патрэбнасці, а таксама падтрымаць найбольш малазабяспечаных пажылых грамадзян. Даплаты да пенсій будуць устанаўлівацца з 1-га чысла месяца, наступнага за месяцам дасягнення ўзросту 75 (80) гадоў, і выплачвацца ў парадку, прадугледжаным для выплаты пенсій.

Акрамя таго, згодна з указам, у 2012 годзе карэкціроўка фактычнага заробку пенсіянераў і перараслікі працоўных пенсій будуць праводзіцца з лютага, мая, жніўня і лістапада зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў па рэспубліцы за IV квартал 2011 года, I, II і III кварталы 2012 года адпаведна.

З 1 СТУДЗЕНЯ ПАВЫШАЮЦЦА ТАРЫФНЫЯ АКЛАДЫ НЕКАТОРЫМ КАТЭГОРЫЯМ МЕДСЯСЦЁР

У Беларусі павышаюцца тарыфныя аклады медыцынскім сёстрам, якія ўдзельнічаюць у ажыццяўленні высокатэхналагічных і складаных медыцынскіх умяшанняў. Адпаведны ўказ № 29 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2005 г. № 619» 16 студзеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, на 160 працэнтаў павышаюцца тарыфныя аклады медыцынскім сёстрам, якія прымаюць удзел у ажыццяўленні высокатэхналагічных медыцынскіх умяшанняў, выкананні анестэзіялагічнай дапамогі, а таксама ў ажыццяўленні інтэнсіўнай тэрапіі пацыентаў пасля высокатэхналагічных медыцынскіх умяшанняў.

Акрамя таго, на 130 працэнтаў павышаюцца тарыфныя аклады медыцынскім сёстрам, якія прымаюць удзел у ажыццяўленні складаных медыцынскіх умяшанняў, выкананні анестэзіялагічнай дапамогі, а таксама ў ажыццяўленні інтэнсіўнай тэрапіі пацыентаў пасля складаных медыцынскіх умяшанняў і ў правядзенні штучнага кровазвароту ў час кардыяхірургічных умяшанняў. Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2012 года.

РАБОТА БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКІ НЕ ПАТРАБУЕ ДАДАТКОВАЙ ПАДТРЫМКІ БАНКАЎСКАЙ СІСТЭМЫ

Работа беларускай эканомікі цяпер не патрабуе дадатковай падтрымкі банкаўскай сістэмы. Аб гэтым Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку 16 студзеня ў час рабочай сустрэчы далажыла старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзея Ермакова.

Прэзідэнт пацікавіўся, як развіваецца сітуацыя на фінансавых рынках, якія асноўныя тэндэнцыі канца мінулага і пачатку гэтага гадоў. «Розныя былі меркаванні, размовы аб тым, што мы тут амаль што не палітыку збіраемся змяняць у фінансавай сферы. Розных чутак хапала правакацыйных. Паводле маіх даных, Нацыянальны банк і ўрад дастойна прайшлі гэты перыяд. І як паказаў час, чуткі гэтыя былі ні на чым не заснаваныя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Золатавалютныя рэзервы ў нас упершыню ў гісторыі дастатковыя для таго, каб сёння любы курс нацыянальнай валюты падтрымліваць. Але ён павінен быць абгрунтаваным, разумным, як мы дамовіліся, і абавязкова свабодным», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Надзея Ермакова далажыла Прэзідэнту, што сітуацыя на валютнай біржы і ў банкаўскай сістэме ў цэлым складваецца нядрэнная. Па стане на 1 студзеня 2012 года сфарміраваны золатавалютныя рэзервы ў суме $7,9 млрд па міжнародных стандартах.

Ліквіднасць у банкаўскай сістэме знаходзіцца ў норме, росту праблемных крэдытаў не назіраецца, банкі і плацежная сістэма працуюць устойліва і без збояў. На наяўным рынку сітуацыя таксама спакойная. Насельніцтва прадае ў дзень на 5-7 млн валюты ў доларавым эквіваленце больш, чым купляе. «У эканоміцы склалася сітуацыя, калі яна забяспечвае сама сябе без дадатковай падтрымкі банкаўскай сістэмы», — канстатавала кіраўнік Нацбанка.

Аляксандр Лукашэнка даручыў і ў далейшым падтрымліваць устойлівую работу банкаўскага сектара Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

ТРАЎНІЦА З КАМУНЫ

ДОМ КУЛЬТУРЫ ў вёсцы Камуна Любанскага раёна можа пахваліцца сваёй незвычайнай карчмой — у ёй частуюць гарбатай з духмяных зёлак. Кіраўнік установы Ірына Яскевіч кажа, што для Камуны і бліжэйшых да яе вёсак збор і нарыхтоўка карыснага для здароўя разнатраўя з'ява не новая. Наадварот, даўняя і нават старажытная. Зусім нядаўна ў зёлкавай карчме «Чабарок» з'явілася «траўніца», якую ўжо паспелі назваць апякункай кветкавых палёў і абярэгам гэтага незвычайнага вясковага куточка. Ірына ЯСКЕВІЧ (на здымку злева) разам з супрацоўніцамі ўстановы культуры Наталляй БЫШЫК і Тамарай АКСЁНЧЫК аздобіла сваю «траўніцу» палатнянымі мяшэчкамі з духмянымі зёлкамі.

ЗАТРЫМАНЫ ПАДАЗРОНЫ Ў ЗАБОЙСТВЕ ДЗЯЎЧЫНЫ СА СТОЛІНСКАГА РАЁНА

Следчай групай Следчага камітэта ўстаноўлена асоба, якая падазраецца ў забойстве Юліі Ляшук, вучаніцы 8-га класа Лядзецкай сярэдняй школы Столінскага раёна, якая ў ноч на 1 студзеня не вярнулася дадому, паведамілі БЕЛТА ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі.

«Затрыманы паказаў месца пахавання забітай», — дадалі ў СК. Следчай групай праводзяцца мерапрыемствы па ўстанаўленні ўсіх акалічнасцяў здарэння, збору і замацаванні доказаў віноўнасці падазронага. Як паведамлялася раней, 13-гадовая жыхарка вёскі Лядзец Столінскага раёна ў ноч на 1 студзеня гэтага года пайшла ў Дом культуры на дыскатэку, адкуль не вярнулася дадому. Па факце яе знікнення ўпраўленнем Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці была ўзбуджана крымінальная справа па прыметах саставу злачынства, прадугледжанага арт. 139 «Забойства» КК Беларусі.

«Разборкі» вакол экалагічнага падатку: адзін парушае, а другі плаціць?

Сітуацыя

НЕПРЫЕМНЫ сюрпрыз атрымала некалькі дзясятка беларускіх прадпрыемстваў-вытворцаў і імпарцёраў пластыкавай упакоўкі — падатковая інспекцыя прасіць іх даплаціць экалагічны падатак, пачынаючы з... 2008 года! Шакіраваныя такой просьбай, кіраўнікі і заснавальнікі гэтых прыватных фірмаў сабраліся на экстранную нараду ў Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, каб разам вырашыць — што рабіць у гэтай сітуацыі, бо гаворка, па іх словах, ідзе пра далёка не маленькія сумы.

Як патлумачыў **начальнік юрыдычнага аддзела Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Вадзім БАРАДУЛЯ**, Указ Прэзідэнта № 215 «Аб стаўках падатку за выкарыстанне прыродных рэсурсаў (экалагічнага падатку) і некаторых пытаннях яго спагнання» ад 7 мая 2007 года прадугледжваў ільготу для вытворцаў ці імпарцёраў тары, калі яны або самі забяспечваюць збор і перапрацоўку пластмас у памеры не менш за 20% ад выпушчанай імі тары, або заключаюць дамову са спецыялізаваным арганізацыяй, якая тару збірае.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВОСЬ І ЗІМА СА СНЕГАМ І МАРАЗАМІ

У аўторак і сераду тэрыторыя Беларусі застанецца пад уплывам зоны паніжанага атмасфернага ціску, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Таму ў аўторак амаль паўсюдна, а ў сераду месцамі пройдзе невялікі снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. Удзень у аўторак тэмпература паветра 3—8 марозу. Уначы на сераду маразы ўзмоцняцца ад мінус 3 да мінус 13 градусаў, пры праясненнях — ажно да 17 марозу. Удзень у сераду будзе мінус 1—8 градусаў.

У другой палове тыдня атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы прынясуць да нас чарговую порцыю снегу. У чацвер у асобных раёнах прагназуецца мяцеліца, часам узмацненне ветру да 15—18 м/с. У ноч на чацвер чакаецца 7—14 марозу, удзень — ад мінус 2 да мінус 7 градусаў; на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці ўначы мінус 1—6 градусаў, удзень каля 0. Прыкладна такое ўмерана марознае надвор'е захаваецца ў Беларусі і ў пятніцу.

Сяргей КУРКАЧ.

АДМОЎНАЕ САЛЬДА ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ СКАРАЦІЛАСЯ Ў 1,7 РАЗА

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, аб'ём знешняга гандлю таварамі за студзень—лістапад 2011 года склаў 77,8 млрд долараў ЗША. Экспарт — 36,5 млрд долараў, імпарт — 41,3 млрд долараў.

Атрымліваецца, што за гэты перыяд сфарміравалася адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі ў памеры 4,792 млрд долараў. Гэты паказчык скараціўся ў 1,7 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам 2010 года.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

АЎТОБУСЫ ПАТРАПІЛІ Ў АВАРЫЮ...

...У «МАЗе» знаходзіліся 44 чалавекі, 19 з якіх, у тым ліку трое дзетак, былі шпіталізаваныя.

Здарэнне адбылося ўвечары 14 студзеня: у 19.48 у МНС ад дыспетчара хуткай медыцынскай дапамогі паступіла паведамленне пра дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам аўтобуса на аўтадарозе Р-58 Мінск — Мядзел паблізу вёскі Луская Мінскага раёна. Да месца здарэння былі накіраваны больш за 40 адзінак тэхнікі: МНС і брыгады хуткай медыцынскай дапамогі.

— Высветлілася, што аўтобус «МАЗ», рухаючыся па маршруце Паставы — Мінск, з'ехаў у кювет і перакуліўся на бок. У ім знаходзіліся 42 пасажыры, кіроўца і экскурсавод. Усе яны самастойна выбраліся з салона. Транспарт быў арандаваны для турыстычнай паездкі работнікаў аднаго са сталічных прадпрыемстваў і членаў іх сем'яў, — распавялі падрабязнасці здарэння ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

У бальніцы брыгадамі хуткай медыцынскай дапамогі, аўтамабілямі медыцынскай службы МНС былі дастаўлены 34 пасажыры. Паводле інфармацыі, атрыманай ад медыкаў, шпіталізацыя спатрэбілася 19 пацярпелым, у тым ліку тром дзецям. Астатнія пасажыры былі адпраўлены ў Мінск іншым аўтобусам прадпрыемства, якому належаў і «МАЗ», што трапіў у аварыю. З дапамогай 25-тоннага крана аўтобус паставілі на колы работнікі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння. Расследаваннем прычын і абставінамі дарожна-транспартнага здарэння займаецца ДАІ Мінскага раёна.

...Паводле інфармацыі Гродзенскай абласной дзяржаўтаінспекцыі, гэта здарылася з аўтобусам «Брэст—Ліда» прыкладна ў 50 кіламетрах ад райцэнтра.

За рулём «МАЗ — 256170», які належыць лідскаму аўтапарку № 2, быў кіроўца з 39-гадовым стажам, у салоне знаходзілася 6 пасажыраў. Паводле ацэнкі ДАІ, у складаных пагодных умовах снегападу кіроўца няправільна выбраў хуткасць руху, з'ехаў у левы кювет і ў выніку аўтобус лёг на дах. Пацярпелі дзве жанчыны. Як засведчылі пасажыры, за хвіліны да аварыі, на ўчастку перад закругленнем дарогі, кіроўца спачатку абагнаў легкавую машыну, а пасля фуру. Пасля чаго, вяртаючыся на сваю паласу руху, не ўтрымаў аўтобус.

Фота БЕЛТА.

Сяргей РАСОЛЬКА, Барыс ПРАКОПЧЫК.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Грошы

СТАЎКІ ПА ЎКЛАДАХ МОГУЦЬ ПАНІЗІЦЦА ТОЛЬКІ Ў ВЫПАДКУ ЗНІЖЭННЯ СТАЎКІ РЭФІНАНСАВАННЯ

На мінулым тыдні з'явілася інфармацыя, што некаторыя беларускія банкі пачалі трошкі зніжаць працэнтныя стаўкі па дэпазітах. Апошнія некалькі месяцаў банкі прыцягваюць грошы насельніцтва менавіта неверагодна вялікімі стаўкамі, асабліва па беларускіх рублях. Чым выклікана зніжэнне?

Сітуацыю растлумачылі ў прэс-службе ААТ «ААБ Беларусбанк»: «Паніжэнне ставак па дэпазітах абумоўлена запавольваннем інфляцыйных працэсаў. Менавіта зніжэнне пакупніцкай здольнасці беларускага рубля ў свой час вымушала банкі ўстанаўліваць такія высокія стаўкі па дэпазітах, якія дазвалялі б захаваць зберажэнні кліентаў. Зараз сітуацыя на фінансавым рынку стабілізуецца і адпала неабходнасць трымаць сродкі пад такія вялікія працэнты.

Што да Беларусбанка, то ён заўсёды прытрымліваўся ўзважанай палітыкі, не кідаўся ў крайнасці, не прапаноўваў неабгрунтаваных макраэканамічнымі працэсамі ставак, што не перашкаджала яму мець долю дэпазітаў у беларускіх рублях сярод іншых банкаў краіны ў памеры больш за 50%.

На сёння банк не разглядаў пытанне зніжэння ставак па дэпазітах. Яны, дарэчы, прывязаны да стаўкі рэфінансавання і панізіцца могуць толькі ў выпадку зніжэння апошняй».

Нагадаем, што Нацыянальны банк плануе зніжэнне стаўкі рэфінансавання ў 2012 годзе прыкладна да 20 % гадавых.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Небяспека

Дарогі нашы «салёныя»...

У нядзелю на рэспубліканскай сетцы дарог было задзейнічана 393 снегаачышчальнікі і 497 пескасолеразмеркавальнікаў.

Толькі за апошні тыдзень на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах адбылося 39 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінула 6 і было паранена 55 чалавек. За гэты перыяд адбылося 10 ДТЗ з удзелам пешаходаў, у якіх два чалавекі загінулі, раненні атрымалі дзевяць чалавек. У двух ДТЗ з удзелам гужавога транспарту два чалавекі былі параненыя.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ірына НОВІКАВА:

«НАВУКА ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ НА НАШУ ЭКАНОМІКУ»

У сярэдзіне мінулага года была прынята Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця краіны на 2011—2015 гады. Аб магчымым эфекце рэалізацыі праграмы, яе моцных і слабых баках карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з прафесарам, доктарам эканамічных навук, загадчыкам кафедры эканамічнай тэорыі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Ірынай НОВІКАВАЙ.

— Для чаго ўвогуле гэтая праграма была прынята?

— Зараз любая сучасная краіна для таго, каб «упісацца» ў працэсы глабалізацыі і фарміравання геаэканомікі, павінна займацца нейкімі абсалютна новымі вытворчасцямі. Як правіла, гэта вытворчасці, звязаныя з 5-м і 6-м тэхналагічнымі ўкладамі. У праграме і запісана, што ўсе пастаўленыя задачы — гэта фарміраванне тых самых двух найвышэйшых укладаў. Аднак дзеніздзе сустракаецца і 4-ы тэхналагічны ўклад. Ён з'явіўся ў 40-я гады мінулага стагоддзя і закранае прыборабудаванне і электроніку. На тую хвалю, якая падымала ўсю сусветную эканоміку за кошт электронікі, ускочылі першымі японцы. А вось інфармацыйныя тэхналогіі — гэта ўжо 5-ы ўклад. Да 6-га ў нас адносяцца толькі нанатэхналогіі. Аднак біятэхналогіі, калі ў нас будзе нейкая біясумяшчальная вытворчасць і гэты кірунак атрымае развіццё ў навуцы (напрыклад, вырошчванне асобных органаў і частак чалавечага арганізма), то гэта будзе таксама 6-ты тэхналагічны ўклад.

Прыняцце гэтай праграмы азначае, што ва ўрадзе зразумелі: па-іншаму эфектыўна развівацца эканоміка не будзе. Акрамя таго, ёсць вельмі важная праблема: у нас значны імпартны складнік у ВУП, а займацца выключна імпартазамяшчэннем малаперспектыўна — гэта прызнана паўсюль у свеце. Вось мы ў многім бяром прыклад з кітайцаў, а яны адмовіліся ад імпартазамяшчэння даўно, пратрымаўшыся на ім у 90-х гадах толькі каля года. Вы ж самі разумееце, што нельга выбраць усё «ўнутры сябе». Тым больш што ў нас няма і такіх спецыялістаў, вучоных, каб распрацаваць усе кірункі. Мы ўсё ж такі маленькая краіна. Таму нам трэба развіваць менавіта тыя вытворчасці, якія могуць пашырыць экспартны складнік. Калі мы сканцэнтруемся не на імпартазамяшчэнні, а на пашырэнні экспарту, то гэта будзе правільна. У прынцыпе, у праграме аб гэтым і гаворыцца. Як і аб тым, што за кошт яе рэалізацыі мяркуецца пашырыць экспартны складнік у 2,2 раза. А што тычыцца высокіх тэхналогій, аб якіх я казала, экспарт павінен у 2015 годзе павялічыцца ў тры разы.

СТАР. 6

Беларусы з Costa Conkordia вяртаюцца дадому

УНОЧ з 13 на 14 студзеня ў Міжземным моры каля ўзбярэжжа Тасканы пацярпеў крушэнне круізны лайнер «Коста Канкордзія». Ён наляцеў на скалы на неглыбокім участку, атрымаў прабоіну даўжынёй каля 70 метраў, заваліўся на бок на 80° і амаль цалкам апусціўся пад ваду. Пасажыраў судна, якое села на мель, ратавалі ў тым ліку і пры дапамозе верталётаў, дастаўляючы потым іх у гарады паблізу.

Як перадаюць інфармацыйныя агенцтвы, на борце карабля знаходзілася больш за 4,2 тысячы чалавек — пасажыраў і членаў каманды. На стане на сярэдзіну дня 16 студзеня было вядома пра 5 загінулых, 15 прапаўшых без вестак і 67 пацярпелых. Пераважная колькасць пасажыраў — гэта замежныя грамадзяне: італьянцы, іспанцы, французы, японцы. Аднак на круізным лайнеры падарожнічала і больш за 100 рускамоўных турыстаў, у асноўным расіян. Па звестках адной з крыніц інфармацыі, гаворка ішла пра 111 грамадзян Расійскай Федэрацыі, уключаючы трох членаў экіпажа. Як высветлілася, на борце судна знаходзіліся і тры беларусы.

Іх дакументы і рэчы, як і ў многіх іншых пасажыраў, патанулі. Таму Пасольству Беларусі ў Рыме давялося тэрмінова іх аднаўляць, каб нашы суайчыннікі змаглі вярнуцца на радзіму. Пасля эвакуацыі з лайнера беларусы знаходзіліся ў адной з гасцініц італьянскага горада Савона. Яны не пацярпелі.

— Усе неабходныя дакументы для выезду нашых суайчыннікаў з Італіі ўжо падрыхтаваныя і дастаўленыя ім, — сказалі «Звязде» ва ўпраўленні інфармацыі Міністэрства замежных спраў. — Вяртацца дадому людзі вырашылі аўтамабільным транспартам. Яны ўжо ў дарозе.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.01.2012 г. (для б/н разлікаў)			
1 долар ЗША	8 400,00	1 чэшская крона	415,70
1 еўра	10 650,00	1 польскі злоты	2 412,30
1 латвійскі лат	15 198,12	1 расійскі рубель	263,00
1 літоўскі літ	3 081,55	1 украінская грыўня	1 047,25

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	31,9344
10 UAH	39,8135
10000 BYR	38,0171
EUR	40,3842

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «СБЕРЕГАТЕЛЬНЫЙ БАНК «БЕЛАРУСБАНК»,
расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 23 ЯНВАРЯ 2012 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об утверждении нормативов расходования средств из прибыли в 2012 году.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросу повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 20 января), а также с решением, принятым внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 23 января) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 20 января 2012 года.

Телефоны для справок: (8 017) 200 15 56, 218 84 73.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «Поречье Белкоопсоюза» (продавец)

проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом** недвижимого имущества, расположенного по адресу: **Минская область, Минский район, район агрогородка Острошицкий Городок,** в составе: спальный корпус (инв. № 600/С-57829), об. пл. **3113 кв.м;** лечебно-профилактический блок со столовой (инв. № 600/С-57830), об. пл. **2409,6 кв.м;** гараж (инв. № 600/С-125975), об. пл. **124,4 кв.м.**

Начальная цена с НДС – 8 945 307 984 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,9494 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10 (десяти) дней** после проведения аукциона. **Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора аукциона www.rlt.by.

Аукцион состоится **17.02.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.02.2012** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

БЕЛАРУСЬ УСТАНАЎЛІВАЕ БЯЗВІЗАВЫ РЭЖЫМ ДЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ ПА ХАКЕІ 2014 ГОДА І ТУРЫСТАЎ

Беларусь устанаўлівае бязвізавы парадак уезду ў перыяд з 25 красавіка па 31 мая 2014 года для афіцыйных удзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі і замежных турыстаў. Адпаведны ўказ № 28 «Аб некаторых пытаннях правядзення чэмпіянату свету па хакеі 2014 года ў г. Мінску» Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 студзеня.

Падставай для бязвізавага ўезду ў Беларусь для афіцыйных удзельнікаў чэмпіянату з'яўляецца ўключэнне іх у спісы афіцыйнай акрэдытацыйнай сістэмы чэмпіянату Міжнароднай федэрацыі хакея, а для турыстаў — наяўнасць арыгінальнага або электроннага білета на матчы чэмпіянату. Для афіцыйных удзельнікаў чэмпіянату і замежных турыстаў не патрабуецца дагавор медыцынскага страхавання.

Як адзначылі ў прэс-службе, указ накіраваны на вырашэнне пытанняў падрыхтоўкі і правядзення чэмпіянату.

Акрамя таго, вызваляюцца ад абкладання ўвазнымі мытнымі пошлінамі з улікам міжнародных абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь і падаткам на дабаўленую вартасць тавары, за выключэннем падакцызных, што ўвозяцца на тэрыторыю Беларусі для правядзення чэмпіянату свету па хакеі 2014 года. Асноўнай умовай для такога вызвалення з'яўляецца пацвярджэнне мэтавага прызначэння тавараў, якое будзе выдавацца Мінскім гарвыканкамам адносна тавараў, што ўвозяцца для будаўніцтва, рэканструкцыі і аснашчэння спартыўных збудаванняў, гасцініц і іншых аб'ектаў інфраструктуры, і Міністэрствам спорту і турызму — адносна іншых тавараў.

ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Леаніда Захлеўнага з 65-годдзем.

«Самабытным, шматгранным талентам і нястомнай працай Вы ўносіце важкі ўклад у развіццё розных жанраў і напрамкаў музычнага мастацтва. Уся Беларусь добра ведае і спявае Вашы цудоўныя, мілагучныя песні, якія арганічна спалучаюць народныя традыцыі з сучаснымі творчымі дасягненнямі. Ансамбль «Бяседа», які Вы ўзначальваеце шмат гадоў, набыў сусветнае значэнне і сапраўдную народную любоў», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт выказаў надзею, што Леанід Захлеўны і ў далейшым будзе радаваць сваімі выдатнымі творамі, далучаючы мільёны слухачоў да чыстых вытокаў духоўнасці і нацыянальнай культуры. Аляксандр Лукашэнка пажадаў кампазітару здароўя, натхнення, поспехаў, шчасця і дабрабыту.

АЛЕГ ПЯКАРСКІ ВЫЗВАЛЕНЫ АД ПАСАДЫ ПЕРШАГА НАМЕСНІКА МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

Прэзідэнт Беларусі вызваліў палкоўніка міліцыі Алега Пякарскага ад пасады першага намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка крымінальнай міліцыі. Указ аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 студзеня.

Алег Пякарскі звольнены з органаў унутраных спраў у запас Узброеных Сіл у сувязі з учыненнем праступкаў, якія дыскрэдытуюць званне супрацоўніка органаў унутраных спраў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ВЯРТАЕЦЦА ДА ПРАМЫХ ВЫБАРАЎ ГУБЕРНАТАРАЎ?

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў унёс у Дзярждуму законапраект аб прамых выбарах губернатараў. Як адзначае большасць экспертаў, гэтыя прапановы сталі рэакцыяй улад на акцыі пратэсту, якія пракаціліся па Расіі пасля снежаньскіх парламенцкіх выбараў.

Унесены прэзідэнтам законапраект прадугледжвае, што вышэйшая службовая асоба суб'екта федэрацыі абіраецца грамадзянамі Расіі на аснове ўсеагульнага роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Кандыдаты на пасаду вышэйшай службовай асобы суб'екта РФ вылучаюцца палітычнымі партыямі, а таксама ў парадку самавылучэння. Вылучэнне палітычнымі партыямі сваіх кандыдатаў можа ажыццяўляцца пасля кансультацый з прэзідэнтам. У праекце закона гаворыцца, што вышэйшая службовая асоба суб'екта РФ абіраецца на тэрмін не больш за 5 гадоў.

ПАРТЫЯ НАЗАРБАЕВА НАБРАЛА НА ВЫБАРАХ БОЛЬШ ЗА 80%

Паводле папярэдніх звестак, на пазачарговых выбарах дэпутатаў мажыліса (ніжняй палаты) парламента Казахстана большасць галасоў выбаршчыкаў атрымала правячая партыя «Нур Атан» («Светлая Айчына»), узначаленая прэзідэнтам краіны Нурсултанам Назарбаевым. Яшчэ дзвюм партыям удалося пераадолець 7-працэнтны бар'ер.

За партыю «Нур Атан» прагаласавала 80,74% выбаршчыкаў, за «Ак жол» — 7,46%, за Камуністычную народную партыю Казахстана — 7,2%. Сам кіраўнік краіны пракаментаваў гэты вынік, заявіўшы, што казахстанцы зноў далі яго партыі карт-бланш на правядзенне далейшых рэформаў у рэспубліцы.

УКРАІНА ПЕРАВЯДЗЕ ЎСЕ ЦЭЦ НА ВУГАЛЬ ДЗЕЛЯ ЭКАНОМІІ ГАЗУ

Украіна плануе перавесці ўсё ЦЭЦ на вугаль, які дазволіць эканоміць каля 6 млрд кубаметраў газу. Пра гэта заявіў міністр энергетыкі і вугальнай прамысловасці Украіны Юры Бойка, паведамляюць інфармагенцтвы.

Для рэалізацыі гэтай праграмы — пераводу ЦЭЦ на водна-вугальную тэхналогію, — па словах міністра, спатрэбіцца каля года, а таксама прыняцце адпаведнага закона, які дазволіць прыватызацыю цеплаэлектрацэнтраляў Украіны і перадачу іх у канцэсію. Пра ўкараненне адпаведнай тэхналогіі, распрацоўка якой ужо пачата, Украіна дамаўляецца з кітайскімі партнёрамі. Кіраўнік ведамства заявіў таксама, што Украіна мае намер павялічыць уласную здабычу вуглеводародаў, у тым ліку сланцавага газу і вугальнага метану. Для гэтых мэтаў на працягу мінулага года ўкраінскім бокам было прыцягнута больш за 20 замежных кампаній.

У ЛІВІІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА БАІ: ПАЎСТАНЦЫ ВАЮЮЦЬ ПАМІЖ САБОЙ

На паўночным захадзе Лівіі ўспыхнулі сутыкненні паміж дзвюма канфрантуючымі групоўкамі, якія раней удзельнічалі ў звяржэнні рэжыму Муамара Кадафі.

Баявыя дзеянні пачаліся ў мінулую пятніцу ў наваколлі горада Гар'ян у 80 кіламетрах на поўдзень ад Трыпалі і працягваліся ўсе выхадныя. Агонь вёўся з аўтаматычнай зброі і ракетных установак. Загінулі сама меней два чалавекі, яшчэ каля 40 атрымалі раненні.

У нядзелю ў Гар'ян прыбыла дэлегацыя племянных старэйшын, якая паспрабавала пагадніць бакі і спыніць кровапраліцце. Але супрацьстаянне працягваецца, сітуацыя застаецца напружанай, адзначае ВВС. Па словах прадстаўнікоў мясцовых улад, яны не маглі дабіцца выканання загадаў ад некаторых уласных падраздзяленняў, якія прынялі ўдзел у перастрэлках.

Зараз пераходныя ўлады Лівіі спрабуюць узяць пад свой кантроль розныя ўзброеныя групоўкі, якія прымалі ўдзел у звяржэнні былога лідара краіны Муамара Кадафі. Але пасля забойства апошняга некаторыя з іх выйшлі з-пад кантролю і адмаўляюцца прызнаць цяперашнія ўлады краіны.

«СУМНЫ ПАНЯДЗЕЛАК» 16 СТУДЗЕНЯ НАЗВАНЫ САМЫМ ДЭПРЭСІЎНЫМ ДНЁМ ГОДА

Навукоўцы з брытанскага Універсітэта Кардзіфа прызналі панядзелак 16 студзеня самым дэпрэсіўным днём у годзе, піша The Wall Street Journal.

Паводле «формулы шчасця», распрацаванай экспертамі, менавіта ў гэты дзень англічане і іншыя еўрапейцы адчуваюць «посткаляднае» і паслясвяточнае засмучэнне, якое наштурхне іх на думку пра тое, што хуткім часам іх чакае мала прыемнага. Сярод галоўных прычын дрэннага настрою эксперты называюць халоднае надвор'е, назапашаныя даўгі і неаплачаныя рахункі, а таксама факт таго, што да заработнай платы за студзень застаецца яшчэ два тыдні.

ОТКАЗ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

УП «Минский городской центр недвижимости» извещает об отказе от проведения 23.01.2012 открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Гродноопторг» и расположенного по адресу: Гродненская область, Лидский район, Третьяковский с/с, в р-не дер. Долина (извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.12.2011).

Телефон для справок: (017) 227 48 36. УНП 190398583

«Разборкі» вакол экалагічнага падатку...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

І вось тыя, хто выбраў апошні варыянт, зараз апынуліся ў незайздросным становішчы:

— Прадпрыемствы заключылі дамовы, выканалі ўсё, што было прадугледжана ўказам, а арганізацыя, што збірала, прадставіла ім адпаведныя справаздачы, завераныя інспекцыяй Міністэрства прыроды. Падатковая правярала — таксама прэтэнзій не было. І вось праз два гады прыходзіць Камітэт дзяржаўнага кантролю, правярае збіраючыя арганізацыі (у прыватнасці, ААТ «Белэкасістэма», адным з заснавальнікаў якога з'яўляецца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. — **Аўт.**) і робіць выснову, што перапрацоўка адходаў не была выканана ў патрэбным аб'ёме. І атрымліваецца парадаксальная сітуацыя: прадпрыемствам-вытворцам і імпарцёрам, якія заключылі дамовы, аплацілі паслугі і выканалі ўсе патрабаванні са свайго боку, раптам кажуць, каб яны зрабілі перараразлік і заплацілі за два ці тры гады экалагічны падатак (маўляў, калі перапрацоўка не была выканана ў пэўным аб'ёме, то, значыць, вы не мелі права на льготу. — **Аўт.**)... Мы лічым, што гэта няправільна і несправядліва, — сказаў Вадзім Барадуля.

Усяго пад патрабаванне даплаціць экалагічны падатак патрапіла як мінімум 28 прадпрыемстваў, якія мелі дамовы з ААТ «Белэкасістэма». Адным з першых «пад раздачу» трапіла ЗАТ «Мінскі завод безалкагольных напояў».

— У нас была планавая праверка Камітэта дзяржаўнага кантролю на пачатку 2011 года — правяралі ўплату экалагічнага падатку, — расказвае **юрыст-консульт завода Іна БУРШ.** — І вынеслі рашэнне па выніках праверкі аб даналічэнні падаткаў (таксама з-за ААТ «Белэкасістэма». — **Аўт.**). Мы абскарджвалі рашэнне спачатку старшыні КДК, потым у судзе. Суд прызнаў рашэнне законным і абгрунтаваным, і ў нас падатковая інспекцыя, выконваючы гэтае рашэнне, спісала суму экалагічнага падатку і пеню з нашых рахункаў.

Разам падатак і пеня, забраныя ў Мінскага завода безалкагольных напояў, склалі каля 3,8 мільярда рублёў. Іншым прадпрыемствам пашанцавала трохі болей — іх Дзяржкантроль не правяраў, таму праз тое, што ім трэба даплаціць экалагічны падатак, яны даведаліся толькі ў снежні мінулага года: з інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах яны атрымалі паведамленні з прапановай «на працягу некалькіх дзён з моманту накіравання гэтага паведамлення ўнесці змены ў падатковыя дэкларацыі па экалагічным падатку за вытворчасць і імпарт пластмасавай тары... і заплаціць належную суму падатку». А гэтыя сумы, як тлумачаць бізнэсмены, не маленькія, у некаторых яны амаль роўныя месячнаму кошту сыравіны, што закупляецца.

І калі з Мінскага завода безалкагольных напояў сродкі ўжо спагналі, то астатнія прадпрыемствы пакуль разважаюць — змірыцца з несправядлівасцю і аддаць добраахвотна гэтыя сумы або ўсё ж паспрабаваць «пабадацца» з чыноўнікамі:

— Я думаю, што пасля рашэння па Мінскім заводзе безалкагольных напояў у нас судовых перспектыў не шмат. Таму, калі кожны з нас будзе спрабаваць паасобку адстойваць свае правы, то нічога не атрымаецца, — лічыць **Аляксей ПІЛІНКА, дырэктар ТАА «Рэалпак»** — Я пагутарыў з некаторымі з кіраўнікоў, і я адчуваю песімістычныя настроі — маўляў, калі мы аплацім, то, можа, нам пеню не налічаць і г. д. Такім чынам, людзі гатовыя да таго, каб з дзяржавай не спрачацца. Але я лічу, што нам больш правільна будзе аб'яднацца і зрабіць нейкі калектыўны зварот. Бо калі ўся галіна атрымае такія санкцыі, то будзе парушана структура рынку, будуць падымацца цэны на нашу прадукцыю, мы будзем менш канкурэнтаздольныя ў параўнанні з прадпрыемствамі Расіі і Казахстана і г. д.

У выніку нарады прадпрымальнікі вырашылі напісаць зварот да прэм'ер-міністра краіны з просьбай сабраць нараду па разглядзе гэтай сітуацыі з удзелам прадстаўнікоў міністэрстваў эканомікі, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, па падатках і зборах, а таксама Дзяржкантролю і Генпракуратуры.

— Мы выбіраем метад дыялогу бізнэсу і ўлады і звяртаемся да дзяржструктур. Сітуацыя вельмі канфліктная і небяспечная, бо тэрміны санкцый наступілі — і людзі вымушаны плаціць, — сказаў **Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.**

А наступствы ад таго, што прадпрыемствы аднамомантава выплацяць такія вялікія сумы могуць быць сапраўды непрадбачанымі. Са слоў прадстаўнікоў фірмаў, яны ўжо пачынаюць праяўляцца: прадпрыемства не можа заплаціць свайму партнёру за тавары (бо абаротныя сродкі пайшлі на даплату недалічанага падатку), той у сваю чаргу не можа разлічыцца са сваім партнёрам, пачынаецца затрымка з выплатай зарплаты і гэтак далей па ланцужку...

КДК: ПАРТНЁРАЎ ТРЭБА ПРАВЯРАЦЬ

Мы паспрабавалі звязацца з ААТ «Белэкасістэма»: трубку падняў дырэктар гэтага прадпрыемства, але сказаў, што даваць інтэрв'ю не будзе, «пакуль пытанне не будзе вырашана да канца», і што «калі будзе заключэнне Генеральнай пракуратуры, тады і будзем размаўляць».

Як патлумачыла **прэс-сакратар Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Алена ПЕНЯЗЬ**, пра ўзніклую праблему ў міністэрстве ведаюць і будуць разбірацца ў сітуацыі, таму нейкую дакладную інфармацыю змогуць прадставіць толькі праз пэўны час.

Што тычыцца Міністэрства па падатках і зборах, то, як паведаміў Вадзім Барадуля, ён меў гутарку са спецыялістамі з міністэрства і яны з разуменнем ставяцца да сітуацыі. Але справа ў тым, што праверку праводзіў КДК. А Міністэрства па падатках і зборах выступае толькі як прылада для «спагнання грошай і не болей» — гэта паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе міністэрства.

У Камітэце дзяржкантролю, куды звярнулася «Звязда» па каментар, патлумачылі сваё бачанне сітуацыі. У прыватнасці, вось што расказала ў гутарцы з карэспандэнтам газеты **Вольга ДАШКЕВІЧ, галоўны спецыяліст КДК:**

— ААТ «Белэкасістэма» мы правяралі ў снежні 2010 года. А яшчэ раней, у студзені-лютым 2010 года, мы правяралі іншае прадпрыемства, якое таксама займаецца зборам і перапрацоўкай адходаў пластмасы — «Экапластсэрвіс» (Гомель). Пры яго праверцы мы знайшлі вельмі шмат парушэнняў — у прыватнасці, прадпрыемства збірала не адходы спажывання, а адходы вытворчасці. А для прадастаўлення льготы па экалагічным падатку гэта вельмі важны нюанс — павінны быць **не адходы вытворчасці** (гэта было запісана і ва Указе Прэзідэнта № 215, і ў Падатковым кодэксе), а абавязкова **адходы спажывання.** Бо для чаго была гэтая льгота ва ўказе і потым у Падатковым кодэксе — каб стымуляваць збор менавіта адходаў спажывання, тых бутэлечак і пластмас, якія валяюцца ў нас на вуліцы, каб стымуляваць нашых людзей на раздзельны збор, каб прадпрыемствы за кошт гэтай ільготы неяк стымулявалі насельніцтва гэта рабіць — кантэйнеры ўстанаўлівалі, агітацыйную працу праводзілі і г. д. Што ж гэтыя прадпрыемствы, якія як быццам збіралі і перапрацоўвалі адходы пластмас, зрабілі за грошы (і добрыя грошы!), якія ім плацілі прадпрыемствы-вытворцы? Атрымліваецца, што яны грошы ўзялі, а збіралі адходы вытворчасці, бо гэта зрабіць прасцей, чым праводзіць вялізную работу і збіраць адходы спажывання.

— А якія парушэнні былі ў ААТ «Белэкасістэма»?

— Калі ўжо казаць пра «Белэкасістэму», то там у ходзе праверкі мы выявілі зусім іншае парушэнне. ААТ «Белэкасістэма» ўстанавіла кантэйнеры па ўсім горадзе Мінску і прывозіла да сябе на сартаванне ўсё тое, што было ў гэтых кантэйнерах. А там была і пластмаса, і шкло, і металалом, і будаўнічыя адходы, і харчовыя і г. д. Пасля сартавання атрымалася толькі адна траціна пластмас, бо асобна здавалі макулатуру, шкло, вялікую частку ад усіх сабраных адходаў вывозілі на палігон цвёрдых бытавых адходаў. Такім чынам, у перапрацоўку пайшла прыкладна траціна. А ў нас умова — «сабраць і перапрацаваць». Калі мы не перапрацавалі, значыць, мы не выканалі ўмову. Як гэтым можна закрываць нарматывы? Вось і атрымалася такая сітуацыя: пры праверцы мы ўбачылі, што яны не сабралі і не перапрацавалі тую колькасць пластмас, якую трэба было па заключаных дамовах. Але грошы за гэта атрымалі і далі дакументы прадпрыемствам, якія з імі заключылі дамовы, што вось столькі сабрана і перапрацавана.

Калі ж казаць аб прадпрыемствах-вытворцах пластыкавай тары, то ўсяго мы праверылі два ў 2010 годзе і сем прадпрыемстваў у 2011 годзе (у гэтым спісе ёсць і «Аліварыя», і «Мінскі завод безалкагольных напояў», і «Кока-Кола Беверыджыз Беларусія») . І з 9 прадпрыемстваў 7 добраахвотна даплацілі падатак. Дзве арганізацыі не пагадзіліся ў добраахвотным парадку заплаціць падатак — гэта «Кока Кола» і МЗБН. Яны звярнуліся ў суд, і мы выйгралі гэтыя суды — Вышэйшы Гаспадарчы Суд прыняў рашэнне, што дзеянні КДК былі законныя. Хоць арганізацыі лічылі, што яны выканалі ўсё, каб мець ільготу. Яны зрабілі гэта ўскосна: заключылі дагавор, прымалі дакументы, але нічога не правяралі. Так, яны кажуць, што не мелі права праводзіць праверкі. Але і не трэба было праводзіць праверку, дастаткова было проста прыехаць і паглядзець на ўмовы — там такія аб'ёмы нават нерэальна было перапрацаваць. Калі б яны паглядзелі, ці можна давяраць гэтай арганізацыі, з якой заключаюць дагавор — як яна збірае, што яна збірае, у якіх аб'ёмах — то такой сітуацыі, можа, і не атрымалася б.

— У прынцыпе, атрымліваецца, што трэба было правяраць партнёра, каб ён іх не «падставіў»?

— Так, калі яны заключылі дагавор, то трэба было правяраць, як ён выконваецца. У дагаворы ўсё было правільна прапісана і пра збор, і пра перапрацоўку, і пра бытавыя адходы — але пункты гэтай дамовы не правяраліся, усё было пушчана на самацёк. І тыя дакументы, якія прыкладаліся да справаздачы, пакорліва прымаліся. Але самае цікавае, што на адным прадпрыемстве вельмі граматны галоўны бухгалтар не прымала палову таварна-транспартных накладных, якія ёй прыкладвалі. Яна казала: «Адкуль у гэтага прадпрыемства адходы спажывання? Не можа такога быць, я дакумент не прыму. Нам патрэбны менавіта адходы спажывання». І ў гэтага прадпрыемства было вельмі мала парушэнняў, бо галоўны бухгалтар кантралявала свайго партнёра.

— Як можна патлумачыць, што справаздачы, якія падаваліся, былі зацверджаныя Мінпрыроды, але ў выніку аказаліся «памылковымі»?

— Узгадненне было толькі ў 2008-2009 гадах, а ў 2010 годзе па Падатковым кодэксе гэтага ўжо не патрабавалася. Як патлумачыць? Напрыклад, плацельшчык МЗБН прыносіць акты выкананых прац ад «Экапластсэрвіса», які знаходзіцца ў Гомелі, у інспекцыю па месцы сваёй рэгістрацыі. А гэтая сталічная інспекцыя не можа праверыць «Экапластсэрвіс», таму яны, відаць, правяралі толькі дакументы. Глядзіце, у Падатковым кодэксе чамусьці ўжо такога абавязку ўзгаднення з Мінпрыродай не стала. Так што, магчыма, заканадаўца ўлічыў гэтыя нюансы і палічыў, што Мінпрыроды не ў стане пракантраляваць гэтую льготу?..

— Ці былі якія-небудзь санкцыі да ААТ «Белэкасістэма»?

— Мы далічылі ім падатак на захаванне адходаў вытворчасці, бо яны свае адходы вывозілі на палігон як камунальныя. А прад'явіць ім вось гэты экалагічны падатак мы не можам, бо яны не з'яўляюцца яго плацельшчыкамі. Дарэчы, адно з прадпрыемстваў-вытворцаў звярнулася ў гомельскі суд з іскам да «Экапластсэрвіса» аб парушэнні дагаварных адносін, і там, здаецца, «Экапластсэрвіс» пагадзіўся добраахвотна вярнуць тыя грошы, якія атрымаў за паслугі — каля 30 мільёнаў рублёў. Я не ведаю, ці звярталіся іншыя прадпрыемствы ў суд за тое, што не выкананы дагаворныя адносіны. Бо грошы, якія былі заплачаны па дамовах, не маленькія. Напрыклад, у залежнасці ад прадпрыемства, плацілі ад 500 да 700 тысяч за 1 тону сабраных і перапрацаваных адходаў пластмас. Палічыце: 20% ад аб'ёму выраблена прадукцыі памножце на 500-700 тысяч (а падатак, дарэчы, быў каля 250-274 тысяч за тону). Яны складаюць мо каля паловы ад сумы падатку.

— А могуць прадпрыемствы-вытворцы спагнаць не толькі грошы, якія плацілі па дамовах, а яшчэ і сумы для аплаты падатку як урону?

— Мяркую, што так. Бо дагаворныя адносіны не выкананы.

— Паколькі, калі можна так сказаць, пад нечаканыя «санкцыі» трапіла каля 30 прадпрыемстваў-вытворцаў, то ці не будзе парушана структура рынку?

— У паловы з гэтых прадпрыемстваў зусім малыя аб'ёмы і сумы, і гэта зусім не ўплывае на фінансавы стан прадпрыемства. Некаторыя з іх перастрахаваліся і заключалі дамовы на большы аб'ём, чым гэтага патрабавала заканадаўства, так што тут усё трэба глядзець індывідуальна. Вось, напрыклад, некаму недаставілі за ўвесь перыяд 0,4 тоны, 3,8 тоны, 3,2 тоны, 2,3 тоны, 8,2 тоны, 1,7 тоны, 0,6 тон. Вядома, ёсць паказчык і ў 213 тон, але нельга агулам казаць, што вялізныя сумы ва ўсіх.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Дзеля памяці

НАРОДНЫ СКУЛЬПТАР

Пра Уладзіміра Жбанава нагадаюць бронзавыя героі, якімі ён насяліў Мінск і іншыя гарады

БЕЛТА.

Народны — гэта не абавязкова званне, яго можна не мець, але пры гэтым быць зразумелым ці не кожнаму. Скульптуры Уладзіміра Жбанава вызначаюцца чалавечасцю — над імі не трэба доўга думаць, каб пранікнуць у аўтарскую задуму, іх трэба ўспрымаць без напружання, таму што самі яны скіроўваюць да таго, каб разняволіцца, адпачываць. Яны даступныя для людзей і ў тым, што стаяць у людных месцах, з імі можна сфатаграфавацца па-сяброўску. Ці не гэта зрабіла Уладзіміра Жбанава вельмі папулярным скульптарам, асабліва ў сталіцы шмат яго твораў, якія з'явіліся ў апошнія два дзесяцігоддзі.

Скульптар Жбанаў памёр у шпіталі, трошкі не дажыўшы да 58 гадоў. Але памяці пра яго ў Беларусі будзе шмат. Ён стаў папулярным аўтарам у скульптуры, умеў не толькі прыдумаць вобраз, вылепіць, але пераканаць: вось такіх зразумелых герояў нестае краіне, якая доўгі час на скульптуру глядзела толькі праз прызму ідэалагічна правільных падыходаў. У нас за савецкім часам былі цудоўныя скульптурныя работы выдатных майстроў, але галоўным кірункам у гэтым відзе мастацтва былі помнікі героям рэвалюцыі, вайны, асобам, якія праявілі сябе ў культуры. У гэтым сэнсе вялікая заслуга Жбанава ў тым, што ён на ўласнай працы прадэманстраваў: скульптура можа быць абсалютна чалавечай па сэнсе, форме і прызначэнні. Калі няма з кім сфатаграфавацца — то, калі ласка, кампанію можа скласці «Мінчанка» з Міхайлаўскага сквера сталіцы. Калі хочацца адчуць сябе панам у брычцы — калі ласка, ля гарадской ратушы яна чакае, запрэжаная і нібыта гатовая да руху. А дама з сабачкам чакае ў цэнтры менавіта вас...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зварот да чалавека з яго простымі інтарэсамі — пэўная заслуга гэтага скульптара. На асэнсаванне важнасці «чалавечага» пачатку ў мастацтве гледачам патрэбны быў час, як і патрэбны былі майстры, якія далі разуменне таго, што гарады могуць быць упрыгожаны не толькі помнікамі. Ці майстар... Жбанаў стаў, напэўна, самым папулярным скульптарам, а для некаторых, магчыма, увасабленнем самога мастацтва скульптуры (бо не надта добра мы ведаем сваіх майстроў) яшчэ і таму, што яго творы знайшлі выхад з майстэрні на вуліцы. Але ж і ваенна-патрыятычныя помнікі ён рабіў таксама. Уладзімір Жбанаў паходзіў з сям'і вайскоўца, і самому давялося служыць у Афганістане. Але ён абраў шлях мірны з дзяцінства, калі пайшоў у Мінскую мастацкую вучэльню імя Глебава, скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, прайшоў праз творчыя майстэрні Акадэміі мастацтваў СССР.

Пахаваны Уладзімір Жбанаў будзе ў сераду на Маскоўскіх могілках, развітанне са скульптарам адбудзецца ў гэты ж дзень а 14-й гадзіне ў Тэатры беларускай драматургіі.

Абзац

◢ Учора ў Мінску пешаход паслізнуўся і загінуў пад коламі грузавіка. Трагедыя адбылася каля 16 гадзін. Пешаход ішоў па тратуары ў раёне вул. Маскоўскай, паслізнуўся і трапіў пад колы «МАЗа». Ад атрыманых траўмаў ён загінуў на месцы. Як патлумачыў кіроўца грузавіка, ён не заўважыў чалавека, які ўпаў на праезную частку. МАЗ спыніўся на некаторай адлегласці ад месца гібелі пешахода, калі яго дагналі іншыя кіроўцы і паведамілі аб надзвычайным здарэнні. Вядзецца разбор.

◢ **У Мінску абрабавалі распаўсюдніка латарэй. Справа за рабаванне распачата аддзелам Следчага камітэта Беларусі па Фрунзенскім раёне Мінска ў дачыненні да 27-гадовага раней судзімага непрацуючага мінчука. Ён падазраецца ў тым, што ўвечары 13 студзеня ў падземным пераходзе станцыі метро «Каменная горка» адкрыта выкраў 680 тыс. рублёў у распаўсюдніка латарэйнай прадукцыі. Падазронага затрымалі супрацоўнікі аддзела ўнутраных спраў па ахове метрапалітэна.**

◢ Буйная партыя кантрабандных сродкаў сувязі і навігацыі затрымана на тэрыторыі аўтастаянкі ГЦ «Ждановічы» ў Мінску. 751 мабільны тэлефон, 11 камплектных частак, 11 навігатараў без дакументаў аб легальнасці тавару знаходзіліся ў «БМВ» 24-гадовага непрацуючага жыхара сталіцы. Кошт тавару перавысіў 1 млрд 43 млн рублёў.

Поўны абзац

◢ **Піва для сабак можна купіць у Брытаніі. У горадзе Ньюкастл адкрыўся бар Brandling Villa. Як патлумачыла адміністрацыя, многія ўладальнікі жывёл не супраць прыйсці ў бар і выпіць піва з уласным сабакам. Уладальнік пітной установы Дэйв Кар сцвярджае, што ў бары ствараецца асаблівая атмасфера любові і дружалюбнасці, тут і гаспадары, і іх гадаванцы расслабленыя і задаволеныя. Піва для чатырохногіх, вядома ж, не змяшчае алкаголю, затое мае ў сваім саставе солад і пахне бісквітамі з ялавічыны. У выніку ўсе кліенты — і сабакі, і іх гаспадары — задаволеныя навінкай. У бары ўжо ўтвараюцца чэргі з тых, хто хоча пасядзець за столікам з куфлем безалкагольнага пеністага напою для сабакі і куфлем натуральнага — для сябе.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Минский районный исполнительный комитет 26 января 2012 г. повторно проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Горанский с/с, д. Новое Поле	623681315101000236	0,1531 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 193 777	32 000 000	3 200 000
2	Горанский с/с, д. Тейки	623681317601000038	0,1546 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 354 540	19 000 000	1 900 000
3	Горанский с/с, д. Черемуха	623681319601000064	0,1371 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 834 512	26 000 000	2 600 000
4	Горанский с/с, д. Черемуха	623681319601000066	0,1400 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 866 252	27 000 000	2 700 000
5	Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Жемчужная	623681702601002170	0,1237 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	3 000 000	170 000 000	17 000 000
6	Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Жемчужная	623681702601002171	0,1236 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	3 000 000	170 000 000	17 000 000
7	Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Чистая	623681702601002168	0,1424 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	3 000 000	370 000 000	37 000 000
8	Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 31	623687507101000500	0,1520 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 050 840	39 000 000	3 900 000
9	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 283	623687508101000898	0,1462 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	41 000 000	4 100 000
10	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 433	623687508101000770	0,1352 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	38 000 000	3 800 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **26.01.2012 г. в 9.45.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **20.01.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–4 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 60052360, код платежа – 04901.

На Лоты 5–7 перечисляется на расчетный счет № 3641621030047 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На Лоты 8–10 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный

Урач-педыятр Брагінскай раённай бальніцы Ігар ШАПІЛАЎ разам з пацыентамі дзіцячага аддзялення.

ЗДАРОЎЕ... СЕЛЬСКАЙ МЕДЫЦЫНЫ

Так здарылася, што Ганна Сакоўская засталася жыць у сваёй роднай Галубоўцы, калі іншыя аднавяскоўцы пасля чарнобыльскай аварыі шукалі прытулак па ўсім былым Саюзе. Жанчына, якой сёння 58 гадоў, у канцы 80-х працавала ў краме, муж — у мясцовым аўтапарку. Яго, як і многіх, у першую чаргу прыцягвалі да працы ў 30-кіламетровай зоне вакол рэактара... Прайшло чатыры гады пасля таго, як, не дажыўшы да асабістага 60-годдзя, муж Ганны Іванаўны памёр ад анкалагічнага захворвання.

— Да нас, калі муж ужо ляжаў, на дом прыязджалі медыкі, капельніцы ставілі і абязбольваючыя калолі, — расказвае жыхарка вёскі, ад якой, калі ехаць па прамой, каля 18 км да Чарнобыльскай АЭС. — Малайцы дзяўчаты, дапамагалі нам вельмі.

МЕДЦЭНТР У ГЛЫБІНЦЫ

Медыкі не забываюць вёску Галубоўка Брагінскага раёна, якая знаходзіцца ў зоне забруджвання ад 5 да 10 кюры. Тут цяпер афіцыйна пражывае 64 чалавекі, абсалютная большасць — старыя. Яны за жыццё хвароб дастаткова назапасілі, і дапамога ім патрабуецца часта. Хворых абслугоўвае Нова-Іалчанская амбулаторыя — гэта за 3 км ад Галубоўкі. Памочнік урача агульнай практыкі Таццяна Катлабай ведае сваіх пацыентаў не па паперах. Яна тут галоўная апошнія 16 гадоў. Між тым, амбулаторыя зусім нядаўна мадэрнізаваная і цяпер лічыцца адной з узорных ва ўсёй Гомельскай вобласці: гэткі сучасны медцэнтр, у якім ёсць поўны набор неабходных кабінетаў, у тым ліку і дзённы стацыянар, разлічаны на 3 ложкі. Ён запоўнены пастаянна. Людзям такая форма лячэння падабаецца: і ўсе працэдуры пройдзеш, і дома пераначуеш. Радыус абслугоўвання амбулаторыі — 28 км, аўтатранспарт — у наяўнасці, таму да кожнага пацыента, якому патрэбна тэрміновая дапамога, медыкі дабіраюцца вельмі хутка.

Таццяна Катлабай расказвае, што на яе ўчастку — больш за 1150 чалавек. 420 маюць статус «ліквідатара», 123 — доўгажыхары, узрост якіх перавышае 80 гадоў.

У БРАГІНЕ — ЯК У ШВЕЦЫІ

— «Прыедзьце на мяне паглядзець!» — менавіта з такой просьбай часцей за ўсё звяртаюцца бабулькі да мяне па тэлефоне, — гаворыць Таццяна Катлабай. — Іх можна зразумець: галава баліць, ціск падняўся, пагутарыць таксама трэба з жывой душой. Менавіта таму з дазволу Міністэрства аховы здароўя мы пачалі ўвасабляць на сваёй тэрыторыі праект, які прадугледжвае медыка-сацыяльнае абслугоўванне пацыентаў па прыкладзе краін Балтыі. Мне давялося пабываць у Швецыі і Фінляндыі. Там медыкі працуюць разам з прадстаўнікамі сацыяльнай службы. І нашых цяпер важна навучыць выконваць самыя элементарныя медыцынскія працэдуры.

У Нараўлянскім раёне сітуацыя аналагічная. Бліжэйшы да «зоны» сельсавет — Кіраўскі. Наталля Сазанчук, якая выконвае абавязкі старшыні, кажа, што скаргаў ад насельніцтва наконт медабслугоўвання не чуе.

Урач агульнай практыкі Уладзімір Заварохін у Кіраўскай амбулаторыі працуе больш за 15 гадоў.

— Добра, што ў свой час захавалі ФАПы, — кажа ён. — Былі думкі ліквідаваць іх. Але ж не тыя даходы ў нашага насельніцтва, каб чалавек мог сесці ў машыну і даехаць да бліжэйшай бальніцы. Тут усе пацыенты ў аднолькавых умовах. Калі нехта два дні папрацаваў недалёка ля рэактара і мае статус «ліквідатара», іншы не меншую «дозу» атрымаў паступова за 25 гадоў пражывання ў тым жа Кіраве. Таму хварэюць яны аднолькава. Самі ведаеце, наколькі нятанныя цяпер медыкаменты, і пенсіянеру, які льгот не мае, цяжка набыць неабходныя прэпараты.

НОВЕНЬКІ ПУЛЬМАСКАН

— Правядзенне агульнай дыспансэрызацыі насельніцтва прыносіць свой плён, — адзначае галоўны ўрач Брагінскай раённай бальніцы Ігар Кірэня. — Мы з 90-х гадоў праводзім у раёне спецыяльную дыспансэрызацыю пацярпелага насельніцтва. Людзі на сённяшні дзень разумеюць адказнасць за стан свайго здароўя, але хацелася б большага. Што датычыцца дыспансэрызацыі, ёсць, зразумела, элементы фармалізму, але ж мы імкнёмся праводзіць яе поўна і сістэмна. Сістэма бясплатнай медыцыны, якая ў нас захавалася з савецкіх часоў, дае насельніцтву мінімальныя гарантыі абслугоўвання. Ну а той, хто хоча большага, можа атрымаць гэта за дадатковыя грошы.

Стацыянарны корпус Брагінскай раённай бальніцы быў пабудаваны па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы. У межах праграмы адраджэння і развіцця вёскі мадэрнізаваныя многія амбулаторыі і ФАПы, зроблена рэканструкцыя Камарынскай бальніцы.

— Абсталяванне абнаўляецца штогод, нягледзячы на эканамічныя праблемы ў рэспубліцы. Безумоўна, медыкам хочацца большага, але ж скардзіцца грэх. Летась атрымалі новы стацыянарны дыягнастычны комплекс «Пульмаскан», які дае магчымасць значна знізіць дозавую нагрузку пры рэнтгеналагічным абследаванні. Ёсць новенькія кардыёграфы, абсталяванне для «вузкіх» спецыялістаў — Брагіншчыне дапамагаюць і вобласць, і рэспубліка.

— Нельга сказаць, што нашы людзі хварэюць больш за тых, хто жыве на іншых тэрыторыях, — гаворыць і галоўны ўрач Нараўлянскай раённай бальніцы Яўгеній Тапчый. — Рак шчытападобнай залозы — як і паўсюль у зонах, што былі падвержаны забруджванню, — 1-2 выпадкі ў год фіксуем. Паказчык запушчанасці ў нас адносна невысокі — да 13 %. Працуюць скрынінгавыя праграмы, робім ультрагукавыя даследаванні, накіроўваем нашых пацыентаў на абследаванне ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр радыяцыйнай медыцыны і экалогіі ў Гомелі.

КАДРЫ ТРЭБА ЗАЦІКАВІЦЬ

Асобная праблема, якой надаецца дзяржаўная ўвага, — забяспечанасць постчарнобыльскіх тэрыторый медыцынскімі кадрамі. Яўгеній Мікалаевіч адзначае, што цякучасць кадраў у Нараўлянскім раёне ёсць:

— Улічваючы нашы невялікія штатныя магчымасці, адсутнасць таго ці іншага спецыяліста адразу адчуваецца. Там, дзе ёсць некалькі спецыялістаў вузкага профілю, можна перараэмеркаваць іх нагрузку. А калі ад нас з'язджае адзіны лор-урач — дзе яго тэрмінова ўзяць? Не хапае ў бальніцы ўрача-фтызіятра і аталарынголага. Яны адменавіта ў наш рэгіён, і магчымасць атрымаць адразу якаснае жыллё. Дарэчы, усе 7 спецыялістаў, якія размеркаваліся да нас сёлета, адразу атрымалі добраўпарадкаванае жыллё ў новенькім доме. Акрамя таго, я заўсёды прапаную: калі вы жадаеце мець кар'ерны рост або прайсці курс перападрыхтоўкі і атрымаць новую вузкую спецыяльнасць — калі ласка. Але ж замест двух гадоў вы адпрацуеце ў нас тры. Урачу-анестэзіёлагу Андрэю Казлову мы прапанавалі атрымаць спецыяльнасць яшчэ і дзіцячага анестэзіёлага-рэаніматолага. І заключылі з ім кантракт на 3 гады. З урачом-тэрапеўтам Вікторыяй Сцяпанчык заключылі кантракт на тры гады — з дамовай, што яна атрымае спецыяльнасць кардыёлага, бо нам вельмі патрэбны такі спецыяліст. Хірург Дзмітрый Мехаў атрымаў спачатку дадатковую спецыялізацыю эндаскапіста і пасля трох гадоў застаўся на чацвёрты — ужо ў якасці намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай часці. Магчыма, застанецца тут назаўсёды.

* * *

Дзеці і ўнукі Ганны Сакоўскай, жыхаркі вёскі Галубоўка, што знаходзіцца ў зоне забруджвання ад 5 да 10 кюры, жывуць не вельмі далёка ад яе — у райцэнтры Брагін. Пра сваіх нашчадкаў, якія не забываюць яе, Ганна Іванаўна адзываецца вельмі добра. Праўда, кажа, «унукі слабаватыя, хварэюць часта».

Нягледзячы на ўсе вядомыя забароны, расказвае яна, мясцовыя жыхары ўсё роўна ходзяць у лес у грыбы-ягады:

— Бярэм пакрысе і белых, і маслякоў, і зялёнку. І закаткі робім. У нас паўсюль, у тым ліку ў амбулаторыі, можна правяраць прадукты на радыяцыю. Кажуць, яна ў нас у межах нормы — можа, толькі крыху яе перавышае. Але дзецям есці грыбы не даём...

— Калі і ёсць на Брагіншчыне медыцынскія праблемы, дык яны больш датычацца ладу жыцця, а не Чарнобыля, — лічыць памочнік урача агульнай практыкі Нова-Іалчанскай амбулаторыі Таццяна Катлабай.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Урач-рэнтгенолаг Брагінскай раённай бальніцы Алена АСТАПАВА праводзіць рэнтгеналагічнае даследаванне пацыенткі на сучасным пульмаскане.

ДЗЯРЖРЭГІСТР ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

Штогод у забруджаныя радыяцыйныя раёны Гомельшчыны прыязджаюць выязныя лабараторыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека, які знаходзіцца ў абласным цэнтры. Высокакваліфікаваныя спецыялісты дапамагаюць праводзіць спецыяльную дыспансэрызацыю насельніцтва. Як расказаў начальнік упраўлення аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама Мікалай Васількоў, дзяржрэгістр грамадзян, якія пацярпелі ў выніку катастрофы на ЧАЭС, быў створаны яшчэ ў 1993 годзе — каб забяспечыць кантроль за станам здароўя і атрымліваць інфармацыю пра медыка-біялагічныя наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС:

— Гэтая база звестак пастаянна папаўняецца неабходнай інфармацыяй пра захворванні і лячэнне людзей. У ёй утрымліваюцца звесткі аб дыспансэрных аглядах і дозах апраменьвання. Інфармацыя Дзяржрэгістра выкарыстоўваецца для вывучэння структуры, дынамікі, тэндэнцый захворвання, інваліднасці, выходаў захворванняў грамадзян, аналізу і кантролю за дыспансэрызацыяй у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя, распрацоўкі метадаў і крытэрыяў вызначэння груп павышанай радыяцыйнай рызыкі на аснове комплекснага радыяцыйна-эпідэміялагічнага і статыстычнага аналізу. У цэлым структура першасных і агульных захворванняў пацярпелага насельніцтва аналагічная той, што і ва ўсяго насельніцтва Беларусі.

Здарэнні

«ФОЛЬКСВАГЕН» З'ЕХАЎ У ВАДАСХОВІШЧА

«Каля вёскі Лістападавічы ў ваду Салігорскага вадасховішча з'ехаў аўтамабіль. Магчыма, у салоне знаходзяцца людзі, — такое паведамленне паступіла выратавальнікам а палове пятай гадзіны вечара ад відавочцы здарэння.

Потым было ўстаноўлена, што кіроўца легкавіка «Фольксваген Пасат», рухаючыся па аўтадарозе Салігорск — Сквошын, не справіўся з упраўленнем і з'ехаў у ваду. Легкавы аўтамабіль часткова знаходзіўся ў вадзе на адлегласці трох метраў ад берага. Людзей у ім, на шчасце, не было: да прыбыцця падраздзялення выратавальнікаў чатыры чалавекі — кіроўца і тры пасажыры-мужчыны — самастойна выбраліся з машыны і знаходзіліся на беразе. У медыцынскай дапамозе яны патрэбы не мелі. Пры дапамозе аўтамабільнай лябёдкі, устаноўленай на «КаМАЗе», работнікі МНС выцягнулі «Фольксваген» з вады.

ПАЙШОЎ ПАД ЛЁД З ВЕЛАСІПЕДАМ

Раніцай у МНС патэлефанаваў рыбак, які распавёў, што разам з калегам у раёне вёскі Красны Мост Рэчыцкага раёна на рацэ Днепр выцягнуў мужчыну, які тануў. І цяпер яго неабходна пераправіць па лёдзе на бераг для перадачы супрацоўнікам хуткай медыцынскай дапамогі.

Высветлілася, што мужчына ехаў на веласіпедзе праз колішняе рэчышча ракі і правалiўся пад лёд. Да прыбыцця падраздзялення МНС і АСВОДа рыбакі самастойна паўзком пераправілі пацярпелага па лёдзе на бераг і перадалі яго медыкам. З дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» апошнія даставілі мужчыну дадому, аказаўшы яму першую медыцынскую дапамогу. Ад шпіталізацыі пацярпелы адмовіўся.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Год кнігі

Нямецкая — на беларускай

Баранавіцкая цэнтральная гарадская бібліятэка падтрымлівае шчыльныя стасункі з Інстытутам імя Гётэ. Пра асаблівасці супрацоўніцтва нам расказала Наталля СТАНКЕВІЧ, якая працуе загадчыцай аддзела культурных праектаў і знешніх сувязяў бібліятэкі.

— Наталля Анатольеўна, як падтрымліваецца кантакт з Інстытутам імя Гётэ?

— Двойчы на месяц да нас прыязджае з Мінска бібліябус з кнігамі, і ўсе ахвотныя могуць з імі пазнаёміцца, пачытаць. А пачалося ўсё з таго, што ў нашай бібліятэцы існуе куток «Нямецкая мова як замежная». А Інстытут імя Гётэ — нямецкая няўрадавая арганізацыя, задачай якой з'яўляецца папулярызацыя нямецкай мовы за мяжой і спрыянне міжнароднаму культурнаму абмену.

— Якія кнігі найбольш папулярныя і хто іх чытае?

— Найбольшая цікавасць да нямецкіх падручнікаў, да кніжак па кулінарыі, модзе, да краіны ў цэлым... Чытаюць мастацкую літаратуру — класіку і сучасную. Сярод чытачоў многа студэнтаў, медыкаў, пенсіянераў.... Бывае, што да аўтобуса выстройваецца чарга. Ёсць магчымасць заказаць патрэбную кнігу і па інтэрнэце — дастаткова зайсці на сайт Інстытута. А хто вывучае нямецкую мову, можа набыць запіс на дысках.

— А які ўзровень валодання нямецкай мовай у вашых наведнікаў?

— Да нас прыязджаюць нямецкія пісьменнікі і музыканты. Людзі ідуць з імі на кантакт, задаюць пытанні, размаўляюць, бо многія валодаюць нямецкай мовай даволі добра.

— І тым не менш, ваш чытач у асноўным аддае перавагу нямецкім кніжкам у перакладзе на рускую мову, а на беларускай можна хоць нешта ўбачыць?

— Не толькі ўбачыць, але і пачытаць. Пераклады на беларускую мову ёсць. Напрыклад, раман Паўля Коля «Найлепшыя прывітанні з Мінска» ці раман Катрын Шміт «Ты не памрэш».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Адным словам...

У РАЗЛІКУ НА «ПРАСЦЯКОЎ»?

ДЗЕ атаварыцца танней? Вядома ж, на рынку. Так ужо склалася ў свядомасці многіх пакупнікоў. І яны, перакананыя ў гэтым, нават не шукаюць іншыя, больш выгадныя для ўласнага кашалька варыянты. А трэба, у чым на ўласным вопыце пераканаўся аўтар гэтых радкоў.

Цэнтральны рынак у Гродне, апошні дзень мінулага года, каля дзесяці гадзін раніцы. Гандаль, вядома ж, бойкі, у тым ліку і мясам. Цікаўлюся, колькі каштуе свіная выразка: цана «зашкальвае» за 60 тысяч, а некаторыя гандляры просяць і 70 тысяч рублёў. Вось дык «фокус»! У гандлёвым доме «Нёман» ледзь не на кожным кроку кідаюцца ў вочы цэннікі са зніжкамі на бытавую тэхніку, адзенне і іншыя тавары (ад 5 і нават да 25 працэнтаў), а мяса значна даражэйшае, чым яшчэ тры дні таму.

Цікаўлюся ў прадаўца за мясным прылаўкам: «Чаму вось так?» Дыялогу не атрымліваецца, што з пункту гледжання прадаўшчыцы зразумела. Яе задача — атрымаць як мага больш грошай. Тут і цяпер. А нейкія разважанні пра перадсвяточныя «правілы гульні», зніжкі — зусім не па «тэме».

Праўда, і ў мяне, пакупніка, свая задача, якую таксама трэба вырашыць тут і цяпер. З той толькі розніцай, зразумела, каб заплаціць як мага менш, з найбольшай выгадай для сямейнага бюджэту. Аднак ці атрымаецца? Спробы збіць цану ў іншых гандляроў поспеху не прыносяць. Такое ўражанне, што яны цвёрда перакананыя ў адсутнасці канкурэнтаў. А значыць, трэба раскашэльвацца альбо пакідаць рынак ні з чым?

Але тут прыгадваю, што на рынку прадстаўлены не толькі прыватнікі, але і фірменныя гандлёвыя пункты мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў, спажыўкааперацыі. Цікава, што там сёння прапануецца да святочнага стала і па якіх цэнах?

Зала для шэрагу раённых прадпрыемстваў спажыўкааперацыі — літаральна побач з вышэйзгаданымі прылаўкамі. Заходжу. Паколькі чэргаў няма, то першая думка, якая ўзнікае, — што гэта прыватнікам не канкурэнты. Аднак цэннікі адразу ж пераконваюць у адваротным: тая ж свіная выразка тут таннейшая ажно на 20 тысяч рублёў з «гакам». Праўда, у адной прадаўшчыцы заставаўся апошні кавалак (кажа, што з самай раніцы было шмат), затое ў іншай сваё пытанне «закрыў» цалкам. І пры гэтым даведаўся, што тут, бывае, атаварваюцца не толькі звычайныя пакупнікі, але і... прыватныя гандляры, якія працуюць па-суседску.

— Вы што, за прасцякоў нас лічыце? — пытаюся на развітанне ў аднаго з прыватнікаў. — Якія цэны побач і якія ў вас?

Аднак мужчына, які лузгаў семкі ў чаканні кліентаў, адказваць не пажадаў. І гэта яго права — па якіх цэнах гандляваць, размаўляць альбо маўчаць. Але ж і нам, пакупнікам, ніхто не забараняе паводзіць сябе так, каб нас сапраўды не лічылі прасцякамі, якія «клююць» на любую цану.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

КАМЕНСКАЯ ВАЛЮТА, альбо «Каменьчык» супраць долара

У аграгарадку Каменка знаходзіцца адзіная ў Чавускім раёне школьная калекцыя манет і папяровых грошай.

Не ў грошах шчасце...

Сям'я 7-класніка Каменскай школы Жэніса Алімбекава калісьці прыехала з Казахстана, але сам хлопчык нарадзіўся ўжо ў Беларусі і ніколі не быў на радзіме продкаў. Бацькі захавалі рэцэпты казахскіх страў, а вось грошы пад назвай «тэнге» хлопчык убачыў упершыню ў школьным музеі.

— Так, цікава, — усміхаецца Жэніс, разглядаючы выявы казахскіх герояў на каляровых купюрах. — Праўда, ніхто з нас чалму ўжо не носіць, а толькі звычайныя шапкі.

На прыкладзе калекцыі дзецям расказваюць пра нумізматыку — навуку, якая вывучае манеты. І баністыку, якая вывучае папяровыя грошы. А таксама размаўляюць пра стаўленне да грошай. Калі грошы зароблены самім чалавекам, яны асабліва цэняцца, нагадваюць настаўнікі.

Манеты продкаў.

Эвалюцыя чырвонцаў.

Манеткі маленькія і вялікія. Адны цёмна-карычневага, «старажытнага», колеру, другія пакрыты ярка-зялёнай пацінай. Вось вялізныя «5 капеек» з зацёртым двухгаловым арлом. І надпіс: «Расійская імперыя, 1761 год».

Сучасных школьнікаў цікавяць манеты, якімі цяпер не расплачваюцца ў Беларусі. «Капейкі СССР — прыгожыя», — гавораць дзеці. Старшакласніцы Нася Наважылава і Вольга Васількова разглядаюць старыя савецкія грошы і параўноўваюць з цяперашнімі, а таксама з амерыканскімі.

— Не ведаем, што можна было набыць за 10 рублёў у савецкія часы. А вось што набыць за 10 долараў, можна адразу сказаць, — усміхаюцца дзяўчаты.

Грашовая тэма — даволі далікатная, асабліва для моладзі. Грошы — гэта добра ці дрэнна? Усяк! Гэта ўжо старэйшае пакаленне, якое мае досвед жыцця, больш за купюры цэніць здароўе, сваіх дзяцей, якое толькі часткова вымяраецца і здабываецца грашыма. А маладых людзей, якія гадуюцца, як ні круці, у сучасным грамадстве спажывання, грашовыя знакі вабяць і прыцягваюць — яны падаюцца часам вяршыняй усіх жаданняў.

Школьніцы падтрымліваюць такую думку: грошы не даюць шчасця, але ўсё ж значна скарачаюць шлях да яго.

Патрымаць гісторыю ў руках

Ініцыятарам стварэння грашовай калекцыі стала **Таццяна Анісімава, дырэктар адукацыйнага комплексу «Дзіцячы сад-школа» ў Каменцы**. У школе калісьці стварылі этнаграфічны куток. Ён атрымаўся вельмі сімпатычным: там ёсць традыцыйныя прыгожыя вышыванкі, знойдзены ў хатнім смецці ткацкі станок, старажытныя пацеркі (адшукалі дзеці на полі), гільза ад снарада часоў першай сусветнай вайны і нават іржавыя кайданы, у якіх любяць фатаграфавацца госці.

Аднак многія цікавяцца менавіта манетамі і папяровымі грашыма, якія за дзясятак гадоў сабралі школьнікі і настаўнікі.

— Мы не хвалімся сваімі грашыма: для нас гэта гісторыя, — гаворыць Таццяна Пятроўна. — Трэба ўявіць сабе, што шмат гадоў таму нейкі чалавек трымаў у руках гэтую манету, зарабляў яе і нешта потым набываў за яе. Гэтыя грошы можна выкарыстоўваць на ўроках гісторыі. І важна тое, што, як ні ў адным з музеяў, нашы экспанаты дзеці могуць узяць у рукі і патрымаць. Гэта жывое дакрананне да гісторыі, літаральна.

Пачыналася калекцыя менавіта з манет, а потым у ёй з'явіліся і папяровыя грошы. Цяпер у альбоме ёсць і сучасныя грашовыя знакі з дароўнымі надпісамі.

— Аднойчы прадстаўнік мясцовай улады, які прысутнічаў на дні самакіравання ў школе, заўважыў, што ў грашовай калекцыі няма актуальных цяпер долараў. І падарыў 1-доларавую купюру. Потым з'явіліся амерыканскія грошы і іншага наміналу. А вось 500 еўра — безумоўна, фальшывыя, проста для ўяўлення пра еўрапейскія грошы.

Што больш — адзін долар альбо адзін «каменьчык»?

Чырвонцы, талоны і дысконтныя карткі

Эвалюцыю знакамітых чырвонцаў можна прасачыць у калекцыі: ад дзяржаўнага крэдытнага білета Расійскай імперыі 1909 года да банкнотаў з Леніным самых розных савецкіх часоў.

— А вось і 100 савецкіх рублёў, — каментуе Анісімава. — Гэта быў сярэдні месячны заробак у СССР. Калі я прыйшла працаваць у школу, мой заробак складаў 93 рублі — менш, чым гэтая купюра.

Грошы прыносяць дзеці, дастаюць настаўнікі, дораць сябры і госці. Канадскія долары, італьянскія ліры, шведскія кроны...

— Некалькі гадоў таму шведская дэлегацыя наведала мясцовую сельскую гаспадарку «Светлы шлях», і дзеці выступілі перад гасцямі з канцэртам. Цяпер ёсць купюра з даравальным надпісам: на ёй — выява дамы ў капелюшы і футры.

Грошы з прыбалтыйскіх краін, купюры з прыгожымі птушкамі. Білеты «МММ» з партрэтам заснавальніка сумнавядомай фінансавай піраміды Сяргея Маўродзі. А таксама пакупніцкая кніжка і талоны на цукар, тытунь, віно: гэта датычыцца 1990-х гадоў. Побач — дабрачынны білет праваслаўнай царквы таго ж часу. Ужо забытыя беларускія «зайчыкі». І адначасова — гісторыя развалу адной дзяржавы і станаўлення іншай.

Самая старая манетка ў калекцыі належыць 1620 году. Гэта паўтараграшовік часоў Рэчы Паспалітай, Сігізмунда III Вазы. Ёсць таксама орт (сярэбраная манета) 1668 года. Адна капейка 1797 года. Сярод іншых — кавалак царскай манеты: з яе, відаць, хацелі зрабіць медальён альбо нацельны талісман, але не атрымалася.

Усё хочацца пабачыць і патрымаць у руках... Па падлозе разлятаюцца грошы з абменнага фонду. «Але гэта добрая прыкмета!» — супакойвае Таццяна Пятроўна і прапануе гасцям абмяняцца, калі ёсць чым, са школьным музеем. Мы вырашылі адкрыць новую старонку ў грашовай калекцыі: банкаўскіх картак (калі яны ўжо не патрэбныя гаспадарам), а таксама і дысконтных, якія даюць скідкі на тавары. А чаму не? Можна сказаць, што гэтыя рознакаляровыя кавалкі пластыку — найсучаснейшыя грошы.

«Каменьчыкі» з дырэктарскай выявай

У школе не ведаюць, колькі цяпер каштуе іх грашовая калекцыя:

— Для нас гэта не матэрыяльная каштоўнасць, таму мы не ацэньвалі, — прызнаецца Анісімава. — Хаця калі нам дарылі ў калекцыю долары, мы жартавалі: можа, давядзецца абмяняць на слоік фарбы на рамонт школы ў які-небудзь «галодны» год. Але да гэтага не дайшло, і вельмі спадзяёмся, што не дойдзе.

Дарэчы, ёсць у Каменцы і незвычайная валюта — яна дзеючая, і з выявай жывога правіцеля. Гэта «каменьчык»— грашовы знак, які прыдумалі і зрабілі ў школе. Невялікі папяровы прамавугольнік з размытым партрэтам дырэктара Анісімавай мае хаджэнне найперш 10 снежня, у Дзень правоў чалавека, калі ў школе аб'яўляецца дзень самакіравання. Кожны клас зарабляе: прадае вырабы і паслугі. Але гэтым днём дзеянне ўласнай каменскай валюты не абмяжоўваецца.

— «Каменьчыкі» выдаюцца за перамогі ў алімпіядах, конкурсах, спаборніцтвах, — тлумачыць Таццяна Пятроўна ўласную грашовую палітыку адукацыйнай установы. — І напрыканцы навучальнага года, клас, які мае найбольшую колькасць «каменьчыкаў», атрымлівае ў падарунак вялікі торт.

Гэта стала добрай школьнай традыцыяй, якая аб'яднала ўсе «грашовыя патокі»: каб атрымаць торт, трэба спачатку зарабіць «каменьчыкі», а потым набыць салодкі «прыз» у краме за беларускія рублі. І на шчасце пакласці адзін «каменьчык» у школьную калекцыю — каб грошы ва ўсіх вадзіліся.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Чавускі раён.

Жэніс Алімбекаў упершыню ўбачыў казахскія тэнге ў школьным музеі ў беларускай Каменцы.

Дырэктар Каменскай школы Таццяна Анісімава: «Давайце абмяняемся!»

Нячыстыя на руку

БРАЛІ І БУДУЦЬ БРАЦЬ?

ХАБАРНІЦТВА з'яўляецца найбольш тыповай праявай карупцыі — канстатуюць у пракуратуры Віцебскай вобласці. Летась на тэрыторыі Віцебшчыны былі выяўлены 73 факты атрымання хабараў (у 2010 годзе былі ўстаноўлены 47 такіх злачынстваў), 107 фактаў дачы хабару (91 — у 2010-м) і два выпадкі пасрэдніцтва ў хабарніцтве (у 2010-м — дзевяць).

Як паведаміў пракурор аддзела **пракуратуры Віцебскай вобласці па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Ігар МАРОЗАЎ**, статыстыка сведчыць аб тым, што пераважная большасць злачынстваў гэтай катэгорыі здзяйсняецца ў гарадах. У сельскай мясцовасці распаўсюджанасць хабарніцтва значна ніжэйшая.

Цікава, што найбольш «схільнай» да хабарніцтва аказалася прамысловасць, дзе зарэгістраваны 26 фактаў атрымання хабараў і 31 факт дачы хабараў. Шэраг злачынстваў названай катэгорыі здзейснена і ў сферы дзяржаўнага кіравання — 16, у галіне аховы здароўя — 23, у галіне адукацыі — 22.

Праваахоўнымі органамі выяўлены шэраг фактаў атрымання хабараў медыцынскімі работнікамі за незаконнае афармленне бальнічных лістоў. Напрыклад, адзін з выкладчыкаў вышэйшай навучальнай установы Віцебска браў грошы ў студэнтаў за вырашэнне пытанняў аб атрыманні станоўчых адзнак пры здачы імі экзаменаў. Па ўсіх гэтых фактах распачаты крымінальныя справы і вядзецца следства.

Маюць месца факты атрымання хабараў і сярод работнікаў праваахоўных органаў, органаў выканаўчай улады. Так, зараз на разглядзе ў судзе знаходзіцца крымінальная справа ў дачыненні да адказнай асобы Віцебскага аблвыканкама, які атрымліваў грашовыя ўзнагароды ад іншых асоб за рашэнне розных пытанняў з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў.

Судом Кастрычніцкага раёна Віцебска летась да пяці гадоў абмежавання волі з пазбаўленнем права займаць пасады ў праваахоўных органах быў асуджаны за атрыманне хабару былы інспектар батальёна Упраўлення ДАІ Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. Ён падчас нясення службы схіліў вадзіцеля, які кіраваў аўто ў стане алкагольнага ап'янення, да дачы хабару ў памеры мільён рублёў — за непрыцягненне яго да адміністрацыйнай адказнасці. Не лішнім будзе адзначыць, што ў Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь за атрыманне хабару прадугледжана пакаранне да сямі гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. За атрыманне хабару паўторна альбо шляхам вымагальніцтва, а таксама ў буйным памеры, можа быць прызначана да дзесяці гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. У сваю чаргу асобу, якая займае адказную пасаду, могуць пазбавіць волі тэрмінам да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Былы камандуючы ВПС і СПА І. Азаронак планаваў зарабіць на адкатах $233 тыс.

ПАДЧАС следства па справе былога камандуючага ВПС і войскамі СПА Беларусі Ігара Азаронка аператыўнікі ўстанавілі, што ён планаваў зарабіць $233 тыс. у 2011 годзе на лабіраванні інтарэсаў пэўнага прадпрыемства. Такую суму ён разлічваў атрымаць адкатам пры пастаўках абсталявання для абаронных патрэб Беларусі. Рэпартаж па гучнай карупцыйнай справе прайшоў 15 студзеня ў эфіры тэлеканала «Беларусь-1», паведамляе БЕЛТА.

Былы камандуючы ВПС і войскамі СПА Ігар Азаронак 12 снежня 2011 года асуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага Суда да 9 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі ўзмоцненага рэжыму і з канфіскацыяй усёй маёмасці. Ён прызнаны вінаватым па ч. 3 арт. 430 (атрыманне хабару ў асабліва буйным памеры) КК, пазбаўлены звання генерал-маёра.

Другі фігурант справы — грамадзянін Расіі Андрэй Машкаўцан — прызнаны вінаватым па ч. 5 і 6 арт. 16 (саўдзел у злачынстве) і па ч. 3 арт. 430 (падбухторванне і дапамога ў атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры). Ён асуджаны да 6 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі ўзмоцненага рэжыму.

А. Машкаўцан, цяпер ужо ў мінулым начальнік аддзела аднаго з расійскіх заводаў, выйшаў на свайго былога аднакласніка І. Азаронка з прапановай пралабіраваць інтарэсы прадпрыемства пры правядзенні дзяржзакупак абсталявання на патрэбы ВПС і СПА Беларусі. Станоўчае рашэнне пытання было ацэнена ў $46 тыс., з іх былому генерал-маёру належала больш за $32 тыс. Палову гэтай сумы ён атрымаў 19 снежня 2010 года наяўнымі. Астатнія грошы А. Машкаўцан прывёз у Мінск 20 снежня на банкаўскіх картках. Пры спробе зняць з іх грошы прыяцелі былі затрыманыя супрацоўнікамі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі (ГУБЭЗ) МУС Беларусі.

Пры гэтым былы камандуючы ВПС і СПА быў нямала здзіўлены, што яго дзеянні палічылі супрацьпраўнымі. «Ён да апошняга лічыў, што не здзейсніў нічога заганнага. Выказаў версію, што яго сябар прыехаў купляць машыну. Але гэтым уласна і абмяжоўвалася ахоўная лінія паводзін», — адзначыў начальнік ГУБЭЗ МУС Эдуард Нікіцін. Што датычыцца грошай, атрыманых напярэдадні, то палову з іх, больш за $16 тыс., І. Азаронак паспявае патраціць за ноч, нібыта на асабістыя патрэбы. Паводле яго слоў, гэтую суму яму пазычылі.

І. Азаронак і А. Машкаўцан супрацоўнічаць са следствам адмовіліся, абодва сцвярджалі, што іх падставілі. Аднак на пытанні, адкуль узяліся грошы і на якія патрэбы яны былі прызначаны, адказаць так і не змаглі. Больш за тое, як удалося ўстанавіць аператыўнікам, «у Машкаўцана і Азаронка былі вялікія планы: на наяўныя ў іх карткі маглі ў далейшым бесперашкодна пералічвацца сродкі для рашэння пытанняў па пастаўцы абсталявання» па шэрых схемах, распавёў Эдуард Нікіцін.

Істотную падтрымку ў раскрыцці гэтай справы беларускім праваахоўнікам аказаў Следчы камітэт Расіі.

Ну і ну!

НЕ ПРАПАДАЦЬ ЖА ГРОШАМ!

Пенсіянер, сельскі жыхар, купляў на фальшывыя грошы выключна каўбасу і гарэлку.

Жыхар Лепельскага раёна яшчэ летам, калі ішоў на рыбалку, выпадкова знайшоў на беразе канала пад альтанкай вялікія грошы — аж 16 купюр наміналам па 50 тысяч рублёў кожная. У гэтым месцы вельмі любяць адпачываць кампаніі, у тым ліку і вясельныя. Нягледзячы на тое, што ўсе купюры былі надарваныя прыкладна да паловы, дзядуля, вядома, парадаваўся каштоўнай знаходцы. Напэўна, спачатку нават і не здагадваўся, што знойдзеныя купюры могуць быць фальшывымі.

Як расказаў «Звяздзе» **Дзмітрый ПРУДНІК, старшы ўпаўнаважаны групы па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Лепельскага раённага аддзела ўнутраных спраў**, гэты грамадзянін двойчы разлічваўся фальшыўкамі за пакупкі ў аўталаўцы. Безумоўна, гандлярка адразу звярнула ўвагу на парваную купюру, але ж улічваючы, што яе склеілі, грошы ўзяла. Бо такія ў банку прымаюць. У першы раз пенсіянер расплаціўся фальшыўкай падчас каталіцкіх Каляд. А пазней зноў разлічыўся парванай 50-тысячнай купюрай.

Між іншым, калі прадукты і віно ён купляў у аўталаўцы за сапраўдныя грошы, дык за гарэлку і каўбасу чамусьці разлічваўся фальшывымі. Пра апошняе стала вядома, калі касір раённай сістэмы спажывецкай кааперацыі аднесла ў банк грошы, якія збіраюць ад гандляроў аўталавак і ў крамах. Падчас праверкі здадзенай выручкі высветлілася, што дзве купюры па 50 тысяч — грубая падробка.

Уладальніка фальшывак міліцыянеры адшукалі без праблем, бо гандляр аўталаўкі добра запомніла «таго дзеда».

У доме старога знайшлі яшчэ 14 банкнот наміналам 50 тысяч рублёў кожная. Цяпер міліцыянеры шукаюць аўтараў фальшывых грошай. Што датычыцца пенсіянера — улічваючы, што ён ва ўсім добраахвотна раскаяўся і актыўна дапамагае следству, — наўрад ці суд пакарае яго сурова.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Да ведама

РАСКЛАД НА «ПЕРАНЕСЕНЫ» ДЗЕНЬ

У сувязі з пераносам працоўнага дня з 2 на 21 студзеня УП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі» праінфармавала, як у гэты дзень будзе арганізаваны рух прыгарадных паяздоў.

На ўчастках Мінск — Маладзечна, Мінск — Асіповічы, Мінск — Баранавічы, Мінск — Орша 21 студзеня яны будуць хадзіць як па суботах. У гэты дзень таксама дадаткова прызначаюцца электрапаязды: Аляхновічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 6.15; Пухавічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем са станцыі Пухавічы ў 6.41; Мінск-Пасажырскі — Пухавічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 6.41, адпраўленнем са станцыі Пухавічы ў 7.59; Стоўбцы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем са станцыі Стоўбцы ў 6.31.

У Маладзечанскім вузле рух прыгарадных электрапаяздоў 21 студзеня ўстанаўліваецца як па выхадных днях, на участку Орша — Лепель — як па працоўных днях.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Май на ўвазе

МАЁМАСЦЬ ДАЎЖНІКОЎ МОЖНА КУПІЦЬ ON-LINE

Атрымаць судовае рашэнне эканамічнай спрэчкі на сваю карысць — гэта, як кажуць, паўсправы. Каб справядлівасць была адноўлена, пастанова суда павінна быць выканана, нярэдка — у прымусовым парадку, у рамках выканаўчай вытворчасці. І часам каменем спатыкнення становіцца немагчымасць хутка рэалізаваць маёмасць даўжніка...

Яшчэ з 30 лістапада на інтэрнэт-партале гаспадарчых судоў Рэспублікі Беларусь пачаў функцыянаваць новы сэрвіс — «Электронныя таргі». Што паслужыла падставай да яго запуску? І як гэтае наваўвядзенне можа паўплываць на якасць выканання судовых рашэнняў? Аб гэтым у інтэрв'ю газеце «Звязда» распавядае намеснік Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь Віктар РАБЦАЎ.

— Віктар Мікалаевіч, адкрыццё электронных таргоў канфіскаванай маёмасцю даўжнікоў па выканаўчай вытворчасці — гэта нейкая «даніна модзе»? Або вынік мэтанакіраванай працы Службы судовых выканаўцаў гаспадарчых судоў, якую вы курыруеце?

— Гэта дакладна не «даніна модзе». Яшчэ ў канцы 2010 года на выніковым пасяджэнні Пленума Вышэйшага Гаспадарчага Суда была пастаўлена задача па пашырэнні ўжывання элементаў «электроннага правасуддзя» ў гаспадарчым працэсе, эфектыўным выкарыстанні і ўкараненні сучасных інфармацыйных тэхналогій у мэтах аптымізацыі судаводства і павышэння яго эфектыўнасці. Укараненне працэдуры электронных таргоў у выканаўчую вытворчасць — гэта частка працы ў рамках выканання вышэйзгаданай задачы.

Асноўная мэта адкрыцця электронных таргоў — удасканаліць працэдуру рэалізацыі арыштаванай маёмасці, павялічыць яе эфектыўнасць за кошт спрашчэння самой працэдуры, скараціць тэрміны яе правядзення, забяспечыць дыстанцыйны доступ да працэдуры ўсім патэнцыйным пакупнікам, якія жадаюць прыняць удзел у таргах. Натуральна, укараненню электронных таргоў папярэднічала вялікая папярэдняя праца.

— Якая менавіта? Што паслужыла заканадаўчай асновай для ўкаранення электронных таргоў? Верагодна, прыйшлося вывучыць досвед і замежных дзяржаў у гэтым кірунку?

— Для выпрацоўкі канцэптуальнага падыходу да правядзення электронных таргоў у рамках выканаўчай вытворчасці мы, перш за ўсё, вывучылі нацыянальнае заканадаўства, якое рэгулюе як уласна правядзенне электронных таргоў (аўкцыёнаў), так і сумежныя пытанні — дзейнасць таварных біржаў, выкарыстанне нацыянальнага сегмента інтэрнэту, сферу гандлю і інш.

Зразумела, даследаваўся намі і досвед правядзення электронных таргоў у замежных дзяржавах, у першую чаргу, досвед нашых партнёраў па Адзінай эканамічнай прасторы — Расійскай Федэрацыі, Казахстана, а таксама іншых краін (у прыватнасці, Арменіі, Фінляндыі). Прычым мы не толькі вывучылі дзейную ў гэтых краінах нарматыўную базу, але і азнаёміліся з планаванымі зменамі, якія ўлічваюць ужо напрацаваны ў гэтай сферы досвед. У прыватнасці, вывучылі праект закона «Аб унясенні змен у Федэральны закон Расійскай Федэрацыі «Аб выканаўчай вытворчасці».

Падрыхтоўцы ўласнага дакумента папярэднічала і знаёмства з працай ужо дзейных у Беларусі электронных пляцовак па рэалізацыі тавараў. Напрыклад, скрупулёзна вывучана праца электроннай гандлёвай пляцоўкі ААТ «Беларуская ўніверсальная таварная біржа», РУП «Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн», ТАА «БелАўтаЛот», інтэрнэт-аўкцыёну ay.tut.by і інш.

У выніку было распрацавана Палажэнне аб парадку правядзення электронных таргоў па рэалізацыі маёмасці ў выканаўчай вытворчасці, якое 5 жніўня 2011 года зацверджана загадам Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларусі. Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з нормамі Гаспадарчага працэсуальнага і Грамадзянскага кодэксаў, Інструкцыі па выканаўчай вытворчасці ў гаспадарчых судах Беларусі.

А ўжо з 30 лістапада на інтэрнэт-партале гаспадарчых судоў пачаў функцыянаваць сэрвіс «Электронныя таргі».

— Які ў агульных рысах механізм працы электроннай гандлёвай пляцоўкі, створанай на партале гаспадарчых судоў?

— Перш за ўсё растлумачу, што на электронныя таргі выстаўляецца маёмасць, арыштаваная ў рамках выканаўчай вытворчасці. Аднак на такія таргі не можа быць выстаўлена маёмасць, якая выключана з абарачэння альбо абарачэнне якой абмежаванае ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а таксама нерухомая і закладзеная маёмасці і іншая маёмасць, рэалізацыя якой, у адпаведнасці з заканадаўствам, ажыццяўляецца з публічных таргоў.

На старонцы сэрвісу «Электронныя таргі», адкрытым на нашым партале www.court.by, можна азнаёміцца з фота выстаўленай судовымі выканаўцамі на электронныя таргі маёмасці і яе характарыстыкамі, інфармацыяй аб даце пачатку і заканчэння прыёму заявак, часе правядзення таргоў. У выпадку, калі той або іншы лот зацікавіць наведвальніка партала, ён можа падаць заяўку на ўдзел у таргах, пералічыўшы задатак у памеры 10% пачатковага кошту лота на дэпазітны рахунак суда і прадаставіўшы звесткі аб юрыдычнай (фізічнай) асобе на адпаведнай старонцы партала. Неабходнасці наведваць суд пры гэтым няма. Логін і пароль, якія затым спатрэбяцца для аўтарызацыі, накіроўваюцца заяўніку судовым выканаўцам на электронную пошту.

Удзел у таргах таксама ажыццяўляецца дыстанцыйна, шляхам аўтарызацыі на інтэрнэт-партале гаспадарчых судоў і павышэння стаўкі непасрэдна на старонцы лота. Пераможцам таргоў прызнаецца ўдзельнік, які прапанаваў найвышэйшую цану за лот. Далей на працягу тэрміну, паказанага на партале, пераможца таргоў абавязаны ўнесці на адпаведны рахунак гаспадарчага суда ўсю належную з яго суму — яна ўключае пакрыццё выдаткаў на арганізацыю і правядзенне таргоў, а таксама суму, за якую набыта маёмасць. Судовы выканаўца пасля выплаты пакупніком усёй належнай з яго сумы перадае пакупніку набытую маёмасць па акце перадачы маёмасці.

Як бачыце, усё даволі проста, а працэдура ў цэлым цалкам стандартная для такога роду таргоў.

— Сапраўды, мяркуючы па апісанні, удзел у электронных таргах не спалучаны з якімі-небудзь складанасцямі. Аднак як растлумачыць недасведчанаму, якімі перавагамі валодаюць электронныя таргі ў параўнанні са звычайнымі, «класічнымі» таргамі, што праводзяцца судовымі выканаўцамі гаспадарчых судоў?

— Перш за ўсё, я назваў бы забеспячэнне максімальнай даступнасці таргоў для патэнцыйных удзельнікаў, адкрытасць самой працэдуры правядзення таргоў. Немалаважная перавага — павелічэнне тэрміну правядзення непасрэдна таргоў: стаўкі па канкрэтным лоце прымаюцца, як правіла, на працягу 10 дзён. Гэта дае магчымасць пакупніку прыняць узважанае рашэнне аб набыцці маёмасці, якая рэалізуецца. Не магу не згадаць і аб такіх фактарах, як скарачэнне папяровага дакументаабароту, адсутнасць асабістага ўзаемадзеяння паміж пакупніком і судовым выканаўцам, што выключае ўплыў «чалавечага фактару» на працэс правядзення таргоў і вызначэнне пераможцы.

У цэлым мы разлічваем, што ўкараненне электронных таргоў дазволіць павысіць эфектыўнасць рэалізацыі маёмасці даўжніка падчас выканаўчай вытворчасці. Ва ўсякім разе, на гэта дазваляе спадзявацца досвед іншых краін — напрыклад, Арменіі, дзе, паводле інфармацыі нашых калег, выніковасць рэалізацыі арыштаванай маёмасці з увядзеннем электронных таргоў вырасла мнагакратна.

Канчатковым жа вынікам павінна стаць павышэнне эфектыўнасці выканаўчай вытворчасці ў цэлым, што з'яўляецца адным з найважнейшых крытэрыяў якасці работы судовай сістэмы.

Падрыхтавала Надзея ДРЫЛА.

г. Мінск.

НЕ ПАДЗЯЛІЛІ

У Хойніках, каб сустрэць Стары Новы год, сабраліся два 50-гадовыя мужчыны і іх 28-гадовая знаёмая. Апоўначы, пасля распіцця спіртных напояў, у сяброў узнікла спрэчка з-за жанчыны.

Як расказаў намеснік начальніка следчага ўпраўлення УСК па Гомельскай вобласці Дзмітрый Данілін, адзін захацеў больш блізкіх адносін, а другі стаў заступацца за гонар прыгажуні. Калі сітуацыя паўтарылася, адзін з мужчын стрэліў з незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы «ТОЗ-БМ» 20 калібру сябру ў жывот, а пасля і ў галаву. Пасля гэтага застрэліўся сам. Дзмітрый Данілін кажа, што пакуль не зусім зразумелай застаецца роля маладой жанчыны, якая сцвярджае, што не была сведкай крывавых разборак паміж сябрамі і сышла з двара яшчэ да ракавых стрэлаў. На месцы злачынства знойдзены не толькі стрэльба, гільзы і патроны, але і дзве пустыя бутэлькі з-пад гарэлкі, адна з-пад шампанскага і поўная бутэлька шампанскага ў дадатак.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВЫРАТАВАЛІ ПЯЦЬ ЧАЛАВЕК, ЭВАКУЯВАЛІ — ДЗЕСЯЦЬ

Неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні ў нецвярозым стане, як мяркуецца, стала прычынай пажару ў жыллі на 15 паверсе 16-павярховага жылога шматкватэрнага дома па сталічнай вуліцы Лынькова.

— 27-гадовага гаспадара раніцай не было дома. Работнікі МНС выратавалі пры дапамозе маскі яго 49-гадовую маці, якая з атручэннем прадуктамі гарэння, тэрмічным апёкам левай кісці была шпіталізавана, — паведамілі рэдакцыі ў Цэнтры даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — З дапамогай масак з суседніх кватэр было выратавана чатыры чалавекі. З вышэйразмешчанага паверха па лесвіцы эвакуявана 10 чалавек.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КІШЭННІКІ... У СПАДНІЦАХ

У Віцебску праваахоўнікі затрымалі дзвюх жанчын, якія займаліся кішэннымі крадзяжамі.

Міліцыянеры літаральна злавілі іх за руку на тэрыторыі папулярнага ў народзе «Паўднёвага рынку» па вуліцы Чкалава. Высветлілася, што затрыманыя — непрацуючыя жыхаркі Талачына, раней судзімыя. З сумачкі, якая належыць мясцовай жыхарцы, яны скралі кашалёк і дакументы. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Сведения о балансодержателе: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8(0232) 79 67 14

№ лота	Наименование объекта аренды и его характеристика	Местоположение объекта аренды	Цель использования объекта аренды	Коэффициенты месторасположения и спроса к базовой ставке (по договору)	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	В изолированном помещении инв. № 330/D-31842 – помещение на 1-ом этаже площадью 68,4 кв.м (24,0; 15,0; 2,1; 8,8; 8,0; 3,7; 4,9; 1,9)	Гомельская обл, г. Мозырь, ул. Нелидова, 3а	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организация производства (кроме вредных производств)	0,6*3,0	598 500	59 850
2	В капитальном строении (здание специализированное иного назначения) инв. № 320/С-19735 – помещение на 1-ом этаже площадью 27,3 кв.м.	Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Первомайская, 76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организация производства (кроме вредных производств)	1,0*3,0	238 875	23 900

Срок аренды – 5 лет, шаг аукциона 10%.

При заключении договоров аренды **ставка арендной платы может быть скорректирована** с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 г. № 518 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток до «20» февраля 2012 г. на р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509. Получатель платежа: филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

Дата проведения аукциона «21» февраля 2012 г. в 11.00 в Гомельском областном управлении филиала «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46.

Организатор аукциона: ГОУ филиала РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а также индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:

* заявление по установленной форме;

* копии платежного поручения, заверенной банком, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении;

* индивидуальные предприниматели – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

* юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

* юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

* представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

* физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Подача документов по почте не допускается.

Аукцион является открытым. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона будут заключены договора аренды недвижимого имущества.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 с 9.00 до 17.00 по рабочим дням. **Последний срок подачи документов** «20» февраля 2012 г. до 17.00.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Сведения о балансодержателе: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8(0232) 79 67 14

№ лота	Наименование объекта аренды и его характеристика	Местоположение объекта аренды	Цель использования объекта аренды	Коэффициенты месторасположения и спроса к базовой ставке (по договору)	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Помещение площадью 13,33 кв.м, расположенное на 2-м этаже в кап. строении	г. Мозырь, ул. Ленинская, 34	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организация производства (кроме вредных производств)	1,0 x 2,5	116 638	11 664
2	Помещение площадью 19,62 кв.м, расположенное на 2-м этаже в кап. строении	г. Мозырь, ул. Ленинская, 34	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организация производства (кроме вредных производств)	1,0 x 2,5	171 675	17 168
3	Помещение площадью 9,74 кв.м, расположенное на 2-м этаже в кап. строении	г. Мозырь, ул. Ленинская, 34	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организация производства (кроме вредных производств)	1,0 x 2,5	85 225	8 523
4	Помещение площадью 9,51 кв.м, расположенное на 2-м этаже в кап. строении	г. Мозырь, ул. Ленинская, 34	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организация производства (кроме вредных производств)	1,0 x 2,5	83 213	8 321

Срок аренды – 5 лет, шаг аукциона 10%. В случае приобретения указанных лотов одним арендатором ему будут учтены вспомоательные площади (15,84;13,91;1,89;4,42;2,16 кв.м)

При заключении договоров аренды **ставка арендной платы может быть скорректирована** с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 г. № 518 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток до «25» января 2012 г. на р/с 3012105618108 в РД № 700 ОАО«БПС- Сбербанк», код 369, УНП 102353509. Получатель платежа: филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

Дата проведения аукциона «26» января 2012 г. в 11.00 в Гомельском областном управлении филиала «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46.

Организатор аукциона: ГОУ филиала РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а также индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:

* заявление по установленной форме;

* копии платежного поручения,заверенной банком, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении;

* индивидуальные предприниматели – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

* юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

* юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

* представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

* физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Подача документов по почте не допускается.

Аукцион является открытым. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона будут заключены договора аренды недвижимого имущества.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 с 9.00 до 17.00 по рабочим дням. **Последний срок подачи документов** «25» января 2012 г. до 17.00.

КУЛЬТУРА БЕЗ МЕЖАЎ, КУПАЛА НА СТАРТ

Днямі ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адбылася сустрэча Міністэрства культуры Беларусі з прадстаўнікамі пасольстваў замежных дзяржаў і кіраўніцтвам акрэдытаваных у Беларусі замежных культурных цэнтраў.

— Адной з нашых найважнейшых задач з'яўляецца прадстаўленне дасягненняў нацыянальнай культуры за мяжой, — лічыць **міністр культуры Павел ЛАТУШКА**. — Мінкультуры плануе працягнуць удзел у міжнародных форумах выяўленчага мастацтва. Акрамя таго, будуць паляпшацца якасць, канкурэнтаздольнасць і інвестыцыйная прывабнасць прафесійнай адукацыі ў сферы культуры, развівацца экспарт адукацыйных паслуг. Творчыя дэбюты і наватарскія праекты творчай моладзі будуць атрымліваць падтрымку.

На сустрэчы адзначылі, што міжнароднае культурнае супрацоўніцтва, якое адбывалася ў межах кінафестывалю «Лістапад», тэатральнага фестывалю «Панарама», фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і іншых беларускіх фэстаў працягнецца і надалей. Сёлета плануецца правесці Першы беларускі музейны форум у Гродне, Усебеларускую выставу сучаснага мастацтва ў Мінску, рэалізаваць праект «Культурная сталіца Беларусі — Нясвіж», правесці другую Нацыянальную тэатральную прэмію і другую Нацыянальную музычную прэмію, а таксама скончыць другую чаргу прац у Жыліцкім палацава-паркавым ансамблі (Магілёўская вобласць) і адкрыць пасля рэстаўрацыі радзівілаўскі палацавы комплекс у Нясвіжы, занесены ў Спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Сёлета Беларусь возьме актыўны ўдзел і ў замежных культурных мерапрыемствах. Мяркуецца, што нашы дэлегацыі наведаюць найбуйнейшыя міжнародныя кінафестывалі і форумы выяўленчага мастацтва.

— На працягу мінулага года Міністэрствам культуры падрыхтаваны і падпісаны міждзяржаўныя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве з Італіяй, якія пачалі дзейнічаць у снежні, а таксама міждзяржаўныя дакументы аб супрацоўніцтве з міністэрствамі культуры Арменіі і Таджыкістана. На стадыі падрыхтоўкі — праекты дакументаў аб супрацоўніцтве ў галіне культуры з Кітаем, Польшчай, Латвіяй, Катарам, Сербіяй.

Дарэчы, сёння працягваецца перадача Міністэрствам культуры і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў бібліятэкі іншых краін калекцый сучасных айчынных выданняў. Па 100 найлепшых кніг было перададзена ў нацыянальныя бібліятэкі Расіі, Азербайджана, ЗША, Літвы, Украіны.

Павел Латушка не забыў узгадаць і пра абвяшчэнне 2012-га Годам кнігі. Акурат сёлета адбудзецца афіцыйнае святкаванне 130-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Аднымі з найважнейшых мерапрыемстваў стануць таксама святкаванні 100-годдзя Максіма Танка, 140-годдзя мастака Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, 125-годдзя Марка Шагала, 120-годдзя дырыжора і кампазітара Рыгора Шырмы, 1150-годдзя з часу першых згадак пра горад Полацак.

Акурат на сустрэчы ў Нацыянальным музеі быў дадзены старт святкаванню 130-годдзя Янкі Купалы. Там прэзентавалі каталог «Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы».

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Стары знаёмца Новы год
Зайшоў, каб павітацца,
Ўзнялі мы келіх шмат разоў —
Дзве тысячы дванаццаць...
Сказаў старэча Новы год:
— Прасі ў мяне, што трэба —
Ці кайстру поўную няўзгод,
Ці ў дыяментах неба.
— Ну ты даеш, стары, — кажу, —
Мне усяго хапае,
Я зранку ў золаце хаджу,
Скарыначкі збіраю.
Ты лепш вярні той першы снег,
Каб тым жа першым следам
Ішла каханка да мяне
І часу я не ведаў...
Старэча кажа вінавата:
— Ты, браце, не паверыш,
Вяртаю золата і краты,
А першы снег — не вернеш.

Спорт-тайм

МІНСКАЕ «ДЫНАМА» АТРЫМАЛА САМУЮ БУЙНУЮ ПЕРАМОГУ У КХЛ

Фота БЕЛТА.

Гэтая самая буйная за чатыры сезоны выступленняў у КХЛ перамога нашага клуба з лікам 5:0 здарылася ў нядзелю. Ахвярай стаў ніжнякамскі «Нафтахімік». Нягледзячы на разгромны лік, перамога далася нашаму клубу не так проста. Лік мінчане адкрылі толькі ў другім перыядзе, прымусіўшы нямала панерваваць балельшчыкаў. Першы гол у вароты «Нафтахіміка» насіў кур'ёзны характар, бо шайбу закінуў абаронца гасцей, імкнучыся адкінуць яе ад варот. У другім перыядзе яшчэ адноўчы дынамаўцы закінулі, вызначыўся Аляксандр Паўловіч — 2:0. А вось у трэцім перыядзе супернік быў канчаткова дэмаралізаваны і прапусціў яшчэ тры шайбы. Пры гэтым госці пераўзышлі дынамаўцаў па колькасці кідкоў па варотах — 28 супраць 26, але варатар «зубраў» Кевін Лаланд у гэтым паядынку быў бездакорным, за што і справядліва прызнаны лепшым гульцом матча.

«ЮНАЦТВА» СПЫНІЛАСЯ Ў КРОКУ АД КАНТЫНЕНТАЛЬНАГА КУБКА

Трафей, які сталічны хакейны клуб заваёваў двойчы (у 2007-м і 2011-м) сёлета дастаўся французскаму «Руану». «Юнацтва» стала другім.

У фінальнай частцы гэтага міжнароднага турніру, дзе апошнія гады каманда Міхаіла Захарава прадстаўляе беларускі хакей, «Юнацтва» стартавала з паражэння ад украінскага «Данбаса» — 1:2. Але шанцы на першае месца ад гэтага мінскі клуб не страціў. Разам з ім на трафей прэтэндавалі і «Данбас», і «Руан», якія абыгралі італьянскі «Азіяга». У другім туры «Юнацтва» перамагло французаў з лікам 4:2, і гэта азначала, што калі «Руан» у заключным матчы турніру пераможа «Данбас» з розніцай у адну ці дзве шайбы, то пры роўнай колькасці ачкоў з украінцамі і французамі беларусы выходзяць на першае месца па дадатковым паказчыку — розніцы шайбаў у матчах паміж гэтымі трыма камандамі. Атрымаўшы перамогу над «Азіяга» з лікам 4:1, «Юнацтва» заставалася чакаць выніку бітвы паміж «Руанам» і «Данбасам». Збольшага ўсё складвалася так, як і трэба мінчанам: «Руан» перамагаў з лікам у 1-2 шайбы. Калі да канца матча заставалася крыху больш за 2 хвіліны, французы здолелі закінуць пятую шайбу і перамаглі з розніцай у тры шайбы — 5:2. А значыць, заваявалі Кантынентальны кубак. Мінчанам засталося задаволіцца другім месцам, якое яны, дарэчы, займалі ў 2010 годзе.

Міхаіл Захараў пахваліў сваіх падапечных за такі вынік, што, дарэчы, лагічна, улічваючы, што ў сёлетнім чэмпіянаце Беларусі «Юнацтва» пакуль не на вядучых пазіцыях:

— Мы не займаліся падлікам варыянтаў. Нашай задачай было абыграць «Азіяга», што мы і зрабілі. Так, магчымасці заняць першае месца былі, але мы не наракаем ні на лёс, ні на рэгламент, выступілі і так больш чым дастойна. Мы — другія, а «Данбас» з больш чым 20-мільённым бюджэтам — трэці. Гонарыстыя нашымі ветэранамі, ды і моладзь, якая ў чэмпіянаце Беларусі не заўсёды гуляе бліскуча, на моцным міжнародным турніры змагалася на ўсе сто. Так што камандзе па пяцібальнай шкале стаўлю пяць з плюсам.

ВІКА АЗАРАНКА ВЫЙШЛА Ў ДРУГІ КРУГ AUSTRALIAN OPEN

16 студзеня ў 1/64 фіналу Азаранка не дала ніякіх шанцаў першай суперніцы на Адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі Хізер Уотсан (193-ці рэйтынг) з Вялікабрытаніі. Сустрэча доўжылася 67 хвілін і скончылася з лікам 6:1, 6:0 на карысць беларускі. Наступнай суперніцай Вікторыі стане аўстралійка Кейсі Дэлаква (126).

У ГОНЦЫ ПЕРАСЛЕДАВАННЯ ДОМРАЧАВА СТАЛА 4-Й, А НОЙНЕР СТРАЛЯЛА ПА ЧУЖЫХ МІШЭНЯХ

Усе мы памятаем казусы з нашай Дар'яй, якая то стойку з лёжкай пераблытае, то пачне страляць па чужых мішэнях. Але такія непрыемнасці могуць з кім заўгодна здарыцца, што і пацвердзіла лідар агульнага заліку Кубка свету Магдалена Нойнер. У гонцы пераследавання, якая завяршала этап Кубка свету ў чэшскім Нове Места, Нойнер прэтэндавала на месца на п'едэстале да першай стральбы, дзе яна пачала паліць па чужой установіцы. У выніку біятланістцы прыйшлося наматаць чатыры штрафныя кругі. А нарвежка Тора Бергер (менавіта па яе ўстаноўцы страляла Нойнер) атрымала ў якасці кампенсацыі пяць секундаў. Але і без гэтага гонку яна выйграла. Другое месца заняла шведка Экхольм, трэцяе — французанка Мары Брунэ. Дар'я Домрачава, якая стартавала 10-й, дапусціла 2 промахі і стала 4-й.

ГАНДБАЛІСТЫ — У ПЛЭЙ-ОФ ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ-2013

Мужчынская зборная па гандболе прымушае заўзятараў узгадваць слаўную гісторыю гэтага віду часоў Спартака Міранавіча, калі Беларусь у гандболе была на самых высокіх месцах. Нарэшце наша каманда выйшла ў плэй-оф чэмпіянату свету. На пляцоўцы Палаца спорту нашы гандбалісты перайгралі сваіх асноўных канкурэнтаў па 7-й кваліфікацыйнай групе — румынаў з лікам 28:23, узяўшы рэванш за нядаўняе паражэнне ў Бухарэсце (22:25). Да гэтага падапечныя Юрыя Шаўцова двойчы абыгралі каманду Люксембурга — 37:19 (у гасцях) і 33:32 (дома). У выніку Беларусь займае першае месца ў групе (6 ачкоў). Столькі ж мае Румынія, але з горшай розніцай мячоў яна на другім месцы. Люксембург ачкоў не мае. А наша каманда заваявала права выступіць у плэй-оф чэмпіянату свету-2013.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Фота БЕЛТА.

Нашы дзеці

КРЫК У ПУСТЭЧУ

Пачуць і выратаваць

«...Дапамажыце, мне 14... жыць надакучыла, таму што тата здрадзіў маме... думае, што мне 5 гадоў і што не здагадаюся... Два малодшыя браты дасталі, самы блізкі чалавек памёр, калі мне было 8 гадоў...»

«... Мне вельмі цяжка... Мама глядзіць у сваю тэлескрыню... А ў мяне і ў школе не ладзіцца з сябрамі, і з адзнакамі дрэнна...»

«...А мяне на другі год у школе пакідаюць, сяброў няма, часам здаецца, што маці на мяне напляваць, тата павесіўся... І скажыце вось, ці варта так адстойна жыць? Вось хачу здохнуць, ды хутчэй...»

«...Я хачу памерці таму, што не магу быць каханай, і гэта жудасна... Мая мама даведалася, што я з ім сустракалася, і сказала мне, што лепш бы я памерла, чым гэта... яшчэ пракляла мяне. Яна не размаўляе са мной і наогул паводзіць сябе так, быццам мяне не існуе. І таму хачу памерці, каб не было мяне! Я не бачу іншага выйсця! Але пакуль не вырашыла, як гэта зрабіць. Можа, мне хто-небудзь дапаможа???!!!»

Гэтыя паведамленні я знайшла на адным з форумаў у інтэрнэце.

Дзеці звяртаюцца па дапамогу. Але не да дарослых, а адно да аднаго. Разам яны шукаюць спосаб бязбольна звесці рахункі з жыццём...

Калі чытаеш паведамленні падлеткаў і іх парады адно аднаму, то не разумееш, як могуць дзеці перажываць з-за такіх дробязяў... Потым злуешся ад таго, што яны не ў стане знайсці выйсце з «тупіка». І раптам становіцца страшна за іх і балюча.

Самай малодшай дзяўчынцы, якая з'явілася на гэтым форуме, восем гадоў. З яе бязладна напісанага тэксту відаць, што тата сышоў, а маці прывяла ў хату «новага мужа». Неяк новы тата высмеяў яе, і «мама таксама смяялася». Яна б паскардзілася тату, ды ён не прыходзіць, а ёй да яго ніяк нельга прыйсці, яе адну не пускаюць, там дарогу трэба пераходзіць, ды ўвогуле — «маленькая» яшчэ!

— Дзецям характэрна павышаная ўражлівасць і ўнушальнасць, — кажа **псіхолаг Дар'я ВОЎК**. — Яны больш ярка адчуваюць і перажываюць, а гарманальныя і фізіялагічныя змены падлеткаў робяць іх схільнымі да ваганняў настрою і імпульсіўнымі ў прыняцці рашэнняў. Бывае так, што адно міжволі кінутае слова, можа вельмі глыбока раніць дзіця...

Таксама ў пераходным узросце ў дзяцей узнікае павышаная схільнасць да самааналізу і песімістычнай ацэнкі навакольля. Яны ацэньваюць сябе горш, чым яны ёсць насамрэч. Шматлікія цяжкасці ўспрымаюцца дзіцем, як бязвыхадныя ў сілу абмежаванасці яго жыццёвага досведу. Дзеці і падлеткі асабліва адчувальныя да самых дробных змен жыцця, якія адбываюцца незалежна ад іх уласнага выбару. Таму падлеткавы ўзрост і дае вялікую колькасць суіцыдаў.

КРЫК

«...Каб памерці лёгка, трэба ўзяць... вяроўку...»
«Рэальна памерці можна так...»
«Калі скокнуць з даху, то не заўсёды імгненная смерць...»
«Снатворнае не раю, сам спрабаваў, толку няма...»

Такія парады дзеці даюць адно аднаму на форуме. Бывае, дамаўляюцца загадзя пра калектыўнае самагубства: *«...калі разам — не так страшна...»*

— Вельмі рэдка падлетак, які здзяйсняе суіцыд, хоча сапраўды памерці, — дадае Дар'я Віталеўна. — Часцей за ўсё падлетак хоча, каб стала лягчэй, хоча змяніць жыццё ці палепшыць адносіны, але не ведае як, і тады суіцыд — гэта апошняя спроба адчайнага паслання іншым. Гэта можа быць нявыказаны боль і крыўда на бацькоў ці сяброў, за іх неразуменне або недахоп падтрымкі ці немагчымасць перажыць сорам і злосць на сябе, ці жаданне атрымаць парадышку ў цяжкіх абставінах. **У любым выпадку суіцыд — гэта ў першую чаргу крык аб дапамозе, нерасшыфраваны і неразгаданы.** Суіцыдальныя дзеянні — незалежна ад таго, ідзе гаворка пра завершаны суіцыд ці пра суіцыдальную спробу, — гэта заўсёды вынік збегу фактараў і акалічнасцяў.

ПРЫЧЫНЫ

Што ж гэта за фактары і акалічнасці? Спецыяліст вылучыла ў першую чаргу негатыўныя адносіны ў сям'і. Гэта можа быць што заўгодна: частыя сваркі бацькоў, развод, ігнараванне бацькамі праблем і пачуццяў дзіцяці, крытычнае і халоднае стаўленне да дзіцяці, завышаныя чаканні бацькоў... Сярод іншых фактараў: псіхічныя расстройствы ў членаў сям'і (у тым ліку алкагалізм), фізічны ці сэксуальны гвалт у мінулым (дзеці, з якімі дрэнна абыходзяцца, асабліва схільныя ненавідзець сябе). Бывае, што дзіця проста хворае. Абсалютная большасць падлеткаў, якія хочуць скончыць сваё жыццё, маюць якую-небудзь акцэнтуацыю характару ці пакутуюць на псіхічнае расстройства.

— Хочацца адзначыць, — дадае псіхолаг, — што часта бацькі называюць «стрэсам», «канфліктам», «лянотай», «не можа ўзяць сябе ў рукі», «ён робіць мне назло» ці «ён проста ўпарты» — тое, што на самой справе можа аказацца псіхічным ці псіхалагічным расстройствам. Але суіцыдальныя паводзіны ў дзяцей да 12-13 гадоў часцей за ўсё справакаваны падзеямі яго асабістага жыцця: пагроза выкрывання прагулаў у школе, канфлікт з рамантычным партнёрам і іншае.

Яшчэ сярод немалаважных акалічнасцяў, якія могуць прывесці падлетка да суіцыду ці спробы — гэта прыклады суіцыду ў сям'і, сярод падлеткавых куміраў, суіцыдальныя спробы ў мінулым і даступнасць сродкаў, з дапамогай якіх можна скончыць жыццё самагубствам.

Спецыяліст упэўнена, што падлеткавыя суіцыды рэдка старанна плануюцца, часцей за ўсё яны з'яўляюцца імпульсіўнай рэакцыяй на выкрышталізаваны фактар. Гэта тое, што звычайна завецца «апошняй кропляй». Для малодшых падлеткаў такой сітуацыяй можа быць канфлікт у школе ці з міліцыяй і боязь, што пра гэта даведаюцца бацькі.

Для старэйшых — сваркі з бацькамі, сябрамі ці каханым (каханай).

ЯК ДАПАМАГЧЫ

За 2010 год у Мінску двое непаўналетніх пакончылі з сабой і 53 — здзейснілі спробу самагубства. Усяго ў Беларусі ў 2010 годзе зафіксавана 37 выпадкаў самагубства сярод непаўналетніх.

За апошнія 10 гадоў толькі ў сталіцы непаўналетнімі было здзейснена 50 суіцыдаў. Колькі дзяцей спрабавала скончыць самагубствам у рэгіёнах Беларусі, невядома. Статыстыка па парасуіцыдах (у гэтае паняцце ўваходзяць спробы, якія планаваліся як несмяротныя, а таксама няўдалыя спробы па іншых прычынах, нягледзячы на сур'ёзнасць намераў), адпаведна правілам САЗ, вядзецца толькі ў Мінску.

Ці можна дапамагчы дзецям убачыць выйсце з «тупіка», і ці ёсць наогул прафілактыка? На форуме самагубцаў з'яўляліся людзі, якія толькі чарговы раз смяяліся над праблемамі падлеткаў, распавядаючы ім пра свае «сапраўдныя праблемы». Былі дарослыя, якія гаварылі пра перасяленне душ ці наогул, што яны, дзеці, «дзеці-індыга», і іх душа перажывае звычайную трансфармацыю...

Самі ж дзеці проста не заўважалі такія каментары.

— Многае, што робіць дзіця ўстойлівым ці няўстойлівым да суіцыду, часта вызначана ўжо да нараджэння дзіцяці, — гаворыць Дар'я Вітальеўна. — Гэта ў першую чаргу негатыўнае бачанне свету і іншых людзей бацькамі, спосабы іх рэагавання на непрыемнасці, якім несвядома можа навучыцца і дзіця. Таму варта, па-першае, ведаць фактары і рызыкі сваёй сям'і, па-другое, разумець, і галоўнае, убачыць, у сям'і ўнутраныя праблемы, і, нарэшце, — не баяцца звярнуцца па дапамогу да спецыялістаў: псіхолага ці псіхатэрапеўта. У сваёй асабістай практыцы я больш сутыкалася з тым, што падлеткі на самой справе хочуць жыць. Таму часцей за ўсё дастаткова дапамагчы дзіцяці разабраць сітуацыю, з якой ён сутыкнуўся, зразумець і падтрымаць яго, і тады суіцыд становіцца неактуальны.

Невядома, ці дапамаглі «разабраць сітуацыю» тыя дарослыя, якія знаходзіліся побач з васьмігадовай дзяўчынкай, якая пісала на форум...

На яе просьбу: *«дапамажыце скончыць жыццё самагубствам, але так, каб не было балюча»* жыва адрэагавалі самі падлеткі:

«...Анюта, у мяне тата таксама з мамай рассталіся... Але ён да мяне прыязджае 2 разы на год. Так бывае».

«...а да мяне мой прыходзіць 1 раз на год, часам 0 раз за год...»

«Аня! Табе яшчэ жыць і жыць, павер! Звярніся да каго-небудзь, да таго, каму ты больш давяраеш».

Хочацца верыць, што такі чалавек знайшоўся...

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

на 7-секционный 12-16-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (3-й пусковой комплекс – Блок Б) по генплану № 4 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» по пр. Дзержинского в г. Минске

Информация о застройщике: Застройщик: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Синтез-Белнеп Строй», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 04 декабря 2003 года № 2057, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190501210.

Адрес: 220070, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18. Режим работы: Пн.–Пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Телефон: (017) 246 48 89, Факс: (017) 246 44 47.

До настоящего проекта организация осуществляла функции заказчика на 9-секционный 11-19-этажный многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (1-й пусковой комплекс – Блок А) по генплану № 1 и 25-этажный односекционный многоквартирный жилой дом (2-й пусковой комплекс – Блок Г) по генплану № 2 объекта застройки «Жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» в г. Минске».

Информация о проекте строительства:

Цель проекта строительства – строительство 7-секционного 12-16-этажного многоквартирного жилого дома со встроенными помещениями общественного и административного назначения, помещением товарищества собственников и подземной гараж-стоянкой (3-й пусковой комплекс – Блок Б) по генплану № 4.

Здание многоквартирного жилого дома запроектировано из 7 секций, общая площадь жилого здания 42636 м². Количество жилых помещений (квартир) – 438, из них: однокомнатных – 108, двухкомнатных – 142, трехкомнатных – 133, четырехкомнатных – 43, пятикомнатных – 12. Каждая секция оборудована мусоропроводом, двумя пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (балконы и лоджии). В 2-, 3-, 4-, 5-комнатных квартирах ванные комнаты с естественным освещением. Конструкция здания – каркасно-монолитное сооружение. На 1-м этаже здания расположены встроенные помещения общественного и административного назначения общей площадью 2842,536 м². В зоне верхнего технического этажа – мастерские творческих организаций общей площадью 1331,76 м². Количество машино-мест подземной гараж-стоянки – 100.

Многоквартирный жилой дом расположен по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, д. 127.

Начало строительства – ноябрь 2011.

Окончание строительства – июнь 2013.

Проектно-сметная документация в установленном порядке прошла:

- государственную экспертизу (заключение РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» от 06.09.2007 № 1979-07 с дополнениями к заключению от 03.01.2011 № 1781-15/10);

- государственную экологическую экспертизу (заключение №158 от 11.06.2007).

Инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску выдано разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-015/08 от 31.03.2011 г.

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки общей площадью 10,8623 га решениями Минского горисполкома от 15 ноября 2007 года № 2679, от 03.03.2011 № 516. Собственником земельных участков является Республика Беларусь. Свидетельства (удостоверения) № 500/141-3252 от 10.01.2008, № 500/141-3247 от 10.01.2008, № 500/141-3248 от 10.01.2008, № 500/141-3251 от 10.01.2008, № 500/141-3250 от 10.01.2008, № 500/1028-2025 от 11.05.2010 выданы Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается к заключению договора создания объекта долевого строительства 14 (четырнадцать) квартир:

однокомнатные – 6 (шесть) квартир общей площадью 40,33-53,64 м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (17.01.2012 г.) составляет 8 148 000 (восемь миллионов сто сорок восемь тысяч) бел. рублей, что эквивалентно 970 (девятьсот семьдесят) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства;

двухкомнатных – 3 (три) квартиры общей площадью 70,45 м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (17.01.2012 г.) составляет 7 896 000 (семь миллионов восемьсот девяносто шесть тысяч) бел. рублей, что эквивалентно 940 (девятьсот сорок) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства;

трехкомнатные – 3 (три) квартиры общей площадью 90,99-96,48 м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (17.01.2012 г.) составляет 7 812 000 (семь миллионов восемьсот двенадцать тысяч) бел. рублей, что эквивалентно 930 (девятьсот тридцать) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

четырехкомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью 113,82 м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (17.01.2012 г.) составляет 7 812 000 (семь миллионов восемьсот двенадцать тысяч) бел. рублей, что эквивалентно 930 (девятьсот тридцать) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

пятикомнатных – 1 (одна) квартира общей площадью 140,92 м². Стоимость одного метра квадратного на дату публикации проектной декларации (17.01.2012 г.) составляет 7 560 000 (семь миллионов пятьсот шестьдесят тысяч) бел. рублей, что эквивалентно 900 (девятьсот) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату публикации проектной декларации. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства.

Отделка квартир не выполняется. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи (за исключением находящихся в них творческих мастерских и иных нежилых помещений общественного назначения) и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками.

Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, дорожек, размещение площадок отдыха, детских и хозяйственных, устройство парковки.

Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства в эксплуатацию: июнь 2013 года.

Строительство многоквартирного жилого дома ведется ООО «Буд М».

Срок действия настоящей проектной декларации – по 29 февраля 2012 г.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, этаж 3, комн. 18 или по телефонам: (017) 246 47 43; 246 48 89, 611 33 33 (velcom), на сайте www.dolevoe.by

Минский районный исполнительный комитет 16 февраля 2012 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Горанский с/с, д. Капличи	623681308601000037	0,1667 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 992 296	34 000 000	3 400 000
2	Крупицкий с/с, д. Вишневка, участок № 2	623683902101000106	0,1531 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	60 000 000	6 000 000
3	Крупицкий с/с, аг. Крупица, ул. Слуцкая	623683906601000438	0,1502 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	81 000 000	8 100 000
4	Крупицкий с/с, д. Столбуновичи, участок № 23	623683909101000099	0,1457 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	52 000 000	5 200 000
5	Самохваловичский с/с, д. Белица, массив № 1, участок № 1	623686300601000206	0,1321 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 600 000	35 000 000	3 500 000
6	Хатежинский с/с, д. Старое Село, участок № 97	623687507101000509	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 815 000	50 000 000	5 000 000
7	Хатежинский с/с, аг. Хатежино, участок № 66	623687508101001241	0,1542 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 815 000	50 000 000	5 000 000
8	Хатежинский с/с, аг. Хатежино, участок № 235	623687508101001244	0,1501 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 815 000	50 000 000	5 000 000
9	Хатежинский с/с, аг. Хатежино, участок № 240	623687508101001243	0,1496 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 815 000	50 000 000	5 000 000
10	Хатежинский с/с, аг. Хатежино, участок № 374	623687508101001242	0,1612 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 815 000	50 000 000	5 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **16.02.2012 г. в 9.45.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **10.02.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 2–4 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лот 5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На Лоты 6–10 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Ведай нашых!

ЦУДА-ЛАЗЕР...

... распрацавалі ў Інстытуце фізікі імя Б.І. Сцяпанава НАН Беларусі

ВЫКАРЫСТОЎВАЮЧЫ навуковую тэрміналогію, можна сказаць, што айчынныя спецыялісты стварылі фемтасекундны лазер, які працуе ва ўмовах імпульснай накачкі.

Па словах распрацоўшчыка інавацыі, загадчыка лабараторыі фізікі інфрачырвоных промняў Сяргея Ціхамірава, згаданы лазер генерыруе звышкароткія (10 у мінус 15-й ступені секунды), звышінтэнсіўныя імпульсы, што можа абумовіць сапраўдны пераварот у самых розных галінах.



У прыватнасці, лазер здольны ўздзейнічаць на аб'ект без перадачы цяпла на навакольную вобласць, што вельмі дарэчы ў медыцыне. Выкарыстанне такой інавацыйнай распрацоўкі дазволіць зменшыць траўматызм падчас аперацыі, забяспечыць хуткую рэабілітацыю пацыента і мінімізаваць верагоднасць пасляаперацыйных ускладненняў. Ва ўсім свеце цяпер вядуцца актыўныя работы па стварэнні падобных лазераў, якія можна выкарыстоўваць для выканання самых складаных аперацый на вачах, барацьбы з ракавымі клеткамі без шкоды для суседніх, здаровых, фарміравання высоканадзейных хірургічных швоў, якаснага лячэння карыесу без парушэння здаровай тканкі зуба, вырабу мікрапратэзаў і г.д.

У прамысловасці такія лазеры дапамогуць павысіць эфектыўнасць кантролю за элементамі мікраэлектронікі, ажыццяўляць якасную апрацоўку розных матэрыялаў, атрымліваць высакаякасныя элементы для касмічнай тэхнікі.

Варта адзначыць, што інавацыя беларускіх фізікаў больш устойлівая да знешніх уздзеянняў, чым заходнія лазеры, і больш эканамічная ў эксплуатацыі. Дзякуючы закладзенаму ў аснову праекта арыгінальнаму метаду генерацыі фемтасекундных імпульсаў сістэма практычна цалкам можа будавацца на айчыннай элементнай базе. Цяпер беларускія навукоўцы засяродзіліся на давядзенні свайго лазера да камерцыйнага стану, каб яго можна было запусціць у серыйную вытворчасць, а з часам — і адпраўляць на экспарт.

Інга МІНДАЛЁВА.

ВАДКАКРЫШТАЛІЧНЫМ ДЫСПЛЕЯМ ПРЫЙДЗЕЦЦА ПАЦЯСНІЦЦА

БЕЛАРУСКІЯ хімікі распрацавалі матэрыялы для стварэння дысплеяў новага пакалення, якія з часам могуць пасунуць з сусветнага рынку традыцыйных вадкакрышталічных «калер».

Навінку, сінтэзаваную спецыялістамі Інстытута хіміі новых матэрыялаў, можна выкарыстоўваць у стварэнні святловыпрамяняльных дыёдаў — паўправадніковых прыбораў, што вырабляюцца з арганічных спалучэнняў (скарочана OLED). Калі прапусціць праз іх электрычны ток, яны пачынаюць эфектыўна выпраменьваць святло.

Такім чынам, асноўнае прымяненне OLED — стварэнне новага пакалення дысплеяў. Паводле меркавання навукоўцаў, такія дысплеі будуць значна таннейшыя за вадкакрышталічныя. Не менш важныя кірункі выкарыстання новых матэрыялаў — вытворчасць прылад асвятлення. Апроч таго, новыя матэрыялы, распрацаваныя айчыннымі хімікамі, незаменныя для стварэння прылад арганічнай электронікі.

Работы па распрацоўцы падтрымаў Рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў, у якога асноўным крытэрыем адбору для фінансавання з'яўляецца практычная карысць праектаў. Нашымі ноу-хау зацікавіліся і за мяжой: ужо выкананы буйны кантракт з Саудаўскай Аравіяй па распрацоўцы новых арганічных святловыпрамяняльных матэрыялаў коштам больш за 400 тыс. долараў.

Інга МІНДАЛЁВА.

«НАВУКА ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ НА НАШУ ЭКАНОМІКУ»

ЯДРЫ КЛАСТЭРАЎ:

— хімічны ў Гродне: ААТ «Гродна Азот», ААТ «ГроднаХімвалакно», УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт», БДУ, УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»;

— нафтахімічны ў Наваполацку: ААТ «Нафтан» і УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем БДУ;

— аграмашынабудаўнічы ў Гомелі: РУП «Гомсельмаш» і УА «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.П. Сухога»;

— аўтатрактарабудаўнічы ў Мінску: РУП «Мінскі трактарны завод», РУП «Мінскі аўтамабільны завод», «Мінскі маторны завод», БНТУ, ДУВПА «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт», УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»;

— хіміка-тэкстыльны ў Магілёве: ААТ «Магілёўхімвалакно», ААТ «Магатэкс», УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання», УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»;

— ІТ-кластэр у Мінску: рэзідэнты Парку Высокіх Тэхналогій, ДНУ «Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі», БДУ, УА «БДУІР», БНТУ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Што самае важнае ў праграме?

— Самае важнае тое, што там пачалі казаць аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Гэта такая бізнэс-мадэль, у якой удзельнічаюць не толькі дзяржаўныя, але і прыватныя структуры. Дзяржаўных грошай, як правіла, не хапае. Асабліва ў цяперашніх умовах. Бюджэт жа не гумавы. **І для таго, каб развіваць высокатэхналагічныя вытворчасці і навуковыя даследаванні, неабходна прыцягваць грошы прыватнікаў.** Таму падкрэсліваю, што ў гэтай праграме ўпершыню гаворыцца аб такой бізнэс-мадэлі. Я лічу, што гэта перспектыўная мадэль. Яна вельмі шырока выкарыстоўваецца ў Злучаных Штатах ажно з пачатку 80-х гадоў. З пачатку 2000-х гэтай мадэллю шырока карыстаюцца расіяне. Расійскае «Сколкава» (інавацыйны цэнтр, навукова-тэхналагічны комплекс па распрацоўцы і камерцыялізацыі новых тэхналогій. — **Аўт.**) ствараецца па гэтай бізнэс-мадэлі. Таму я думаю, што калі гэтая мадэль запусціцца, некаторыя перспектыўныя навуковыя кірункі мы пацягнем. Самі падумайце: пачалі развіцё біятэхналогій, а для гэтага патрэбна дарагое абсталяванне, матэрыялы. Не хопіць грошай на ўсё і ўсіх у бюджэце. Таму прыцягваць сюды, асабліва ў рызыкоўныя сферы, прыватны капітал — гэта правільна. Так робіць увесь свет.

— Наколькі моцна паўплывае рэалізацыя праграмы на экспартны патэнцыял Беларусі?

— Думаю, што значна, але толькі калі ўсе кірункі і задачы будуць вырашаны. Гэта ж яшчэ толькі праграма. А для рэалізацыі неабходна нарматыўная база. Калі ўсё гэта будзе зроблена (прымуць законы і ўказы, запрацуюць усе тыя кірункі, якія азначаны), то ў нас з'явіцца новыя вытворчасці і, адпаведна, новыя рынкі дзесьці за мяжой. Мы ж будзем рабіць вытворчасць не ўчарашняга, а сённяшняга і заўтрашняга дня. Такая вытворчасць, я думаю, будзе запатрабаваная.

Таксама важная рэч: азначана яшчэ адна новая бізнэс-мадэль — кластарная сістэма развіцця. Гэта ўжо даўно абмяркоўвалася і вось у гэтай праграме гэта прапісана дакладна: плануецца стварыць шэсць кластараў. Існуе ядро кластару: як правіла, раней, калі закрануць замежны вопыт, гэта было нейкае вытворчае прадпрыемства, якое пастаўляла новую прадукцыю за мяжу. Зараз ядро змяняецца. Цяпер ім становіцца нейкая навукова-даследчая ўстанова — яна ўзаемазвязана з вытворчасцю, з фінансавымі структурамі, з банкамі, з мясцовымі органамі — і такім чынам працуе ў комплексе. Таму сістэма і называецца кластар. І вось такія кластары ў нас будуць фарміравацца ў Гродне, Магілёве, Гомелі, Наваполацку. Таксама два кластэры — у Мінску (адзін на базе машынабудавання, што я асабіста лічу перспектыўным).

— Чаму вы называеце асабліва перспектыўным машынабудаванне?

— Яно перспектыўнае таму, што ў нас існуе Аб'яднаны інстытут машынабудавання НАН Беларусі, які будзе працаваць на ўсе гэтыя заводы. А прадукцыя павінна будзе мэтанакіравана, па адзіных тавараправодных сетках вывозіцца за мяжу. Зараз я прывяду вам прыклад. Жодзінскі «БелАЗ» — гэта вельмі добрыя аўтамабілі. Гэта, можна лічыць, наш гонар. Яны сёння трымаюць 33 працэнты сусветнага рынку велікагрузных аўтамабіляў. Лепш за іх толькі амерыканская фірма (Caterpillar), якая трымае 50 працэнтаў, і 17 працэнтаў — японская Comatsu. Тым не менш, калі ў Індыі аб'яўляецца тэндар на пастаўку велікагрузных аўтамабіляў, мы прайграём. Бо купляюць аўтамабілі з умовай, што ёсць сэрвісныя цэнтры. Вы ж не будзеце купляць магнітафон ці яшчэ што-небудзь, калі не зможаце адрамантаваць яго ў выпадку паломкі? Аказалася, што ў Індыі няма сэрвісных цэнтраў БелАЗа. А наладзіць іх — гэта дарагая справа. А калі будзе кластэр, калі ўсё машынабудаванне аб'яднаецца, — іншая справа. У Індыі існуе тавараправодная сетка Трактарнага завода. І гэта можна будзе выкарыстаць пасля некаторай мадэрнізацыі.

— Вы казалі, што неабходна мяняць нарматыўную базу для эфектыўнай рэалізацыі праграмы. А ці патрэбны якія-небудзь змяненні ў фінансавай сістэме?

— Тут я магу выступіць у якасці апанента. Мне не ўсё спадабалася ў праграме па гэтым пытанні. Напісана, што для таго, каб прафінансаваць венчурныя прадпрыемствы (гэта рызыкоўныя прадпрыемствы, а значыць, і распрацоўкі рызыкоўныя), у нас прапаноўваецца выпусціць каштоўныя дзяржаўныя паперы. Увогуле лічыцца, што калі вы ўкладваеце грошы ў нейкія рызыкоўныя навуковыя праекты, то аддача з дзесяці працэнтаў праектаў акупляе не толькі вашы выдаткі, але і прыносіць значны прыбытак. Але для гэтага павінны добра працаваць фінансавыя рынкі. А хто будзе рабіць IPO (ацэнку венчурнага прадпрыемства)? Колькі яно будзе каштаваць? У нас няма нарматыўнай базы, мы, у прынцыпе, не робім IPO і не прадаём акцыі венчурных прадпрыемстваў — усяго гэтага ў нас няма. І адкуль дзяржава возьме тыя каштоўныя паперы? Гэта значыць, што прыйдзецца ізноў «уключаць станок». Таму гэты напрамак не зусім карэктны. Калі мы гэта распрацоўвалі, то прапанова была такая: неабходна акцыяніраваць нашы высокадаходныя прадпрыемствы (напрыклад, Беларускую калійную кампанію, нафтаперапрацоўчыя заводы і іншыя) і частку акцый аддаваць венчурным фондам — для фарміравання іх устаўнога капіталу. І за кошт гэтага фонд зможа прафінансаваць дзейнасць венчурнага прадпрыемства. Калі гэта прадпрыемства запрацуе, то тады, адпаведна, будуць вяртацца грошы і павялічвацца даходнасць каштоўных папер. На жаль, гэтага не прапісалі. Там у праграме напісана, што ў Беларускі інавацыйны фонд будуць прыцягваць прыватніка, але ўсё роўна большая частка ў фондзе будзе дзяржаўнай. Я хачу сказаць, што прыватніка вы на гэтых умовах не прыцягнеце. Вось расіяне стварылі венчурную кампанію (РВК — Расійская венчурная кампанія). Дык яны зрабілі 49 працэнтаў дзяржаўных і 51 працэнт — прыватны. Для таго, каб рашэнне заставалася не за дзяржавай, а за прыватнікам. А прыватнік не будзе ўкладваць грошы туды, дзе рашэнне прымае дзяржава. Таму што дзяржава, як паказвае сусветны вопыт, — дрэнны менеджар у эканоміцы, яна павінна займацца іншымі пытаннямі. Таму гэтая прапорцыя (49/51) — прынцыповая.

> **«Галоўным кірункам пераўтварэння вытворчага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь у 2011-2015 гадах павінна стаць увядзенне новых і высокіх тэхналогій, якія маюць найбольшую дабаўленую вартасць, нізкую энерга- і матэрыялаёмістасць і спрыяюць стварэнню новых відаў тавараў і паслуг, найноўшых экалагічна бяспечных (чыстых) матэрыялаў і прадуктаў, а таксама якія забяспечваюць вытворчасць традыцыйных тавараў і паслуг з новымі ўласцівасцямі і параметрамі, недасяжнымі ў межах папярэдніх тэхналагічных укладаў» (Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гады, глава 2).**

— Калі я правільна зразумеў, то ў «Мінсктрансе» спадзяюцца на свядомасць гараджан, але кантралёры па-ранейшаму застануцца?

— Так. Праўда, з павелічэннем штату кантралёраў таксама ёсць пытанні. Не хочуць ісці людзі ў кантралёры, бо цяжка сёння змагацца з нашымі пасажырамі-безбілетнікамі. Хаця ёсць і іншая нядобрая тэндэнцыя: калі людзі не сварацца, а проста аддаюць гэты штраф у 7,5 тысяч. Бо «закрыць» увесь горад кантралёрамі нельга, і чалавек разумее — нават калі ён за месяц у лепшым выпадку 3 разы пападзецца, то гэта будзе ўсё адно танней за праязны...

У лютым у Мінску з'явіцца першае электроннае табло на прыпынку?

— Наколькі я ведаю, зараз у Мінску ўжо рэалізуецца адзін інавацыйны праект — укараненне сістэмы навігацыйнага забеспячэння і перадачы звестак у наземным пасажырскім транспарце. Раскажыце, на якім этапе зараз знаходзіцца гэты праект?

— У прынцыпе, сістэма рэалізавана дастаткова аб'ёмна і поўна — засталося толькі некалькі элементаў для поўнага завяршэння праекта. У 2012 годзе мы выканаем гэтыя работы. На сёння ўвесь рухомы састаў прадпрыемства абсталяваны навігатарамі. Магчыма, вы бачылі іх у вадзіцеля на панэлі — там на дысплэі ідзе інфармацыя з раскладам руху, ёсць магчымасць звязацца з дыспетчарам. А ўся інфармацыя пра транспартны сродак перадаецца ў цэнтр упраўлення рухам, які знаходзіцца на Партызанскім праспекце.

Для чаго зроблена гэтая сістэма? Па-першае, для кантролю за працай кіроўцы. (Барыс Анатольевіч паказвае на сваім камп'ютары карту Мінска, па якой рухаюцца маленькія кропачкі — аўтобусы, тралейбусы, трамваі. — **Аўт.**). Вось рух транспарту ў рэальным часе. Можам націснуць на любы транспартны сродак і ўбачыць поўную інфармацыю: ідзе ён па раскладзе ці спазняецца і г. д. Гэтая інфармацыя збіраецца, назапашваецца, і можна прааналізаваць праз пэўны час працу асобнай рухомай адзінкі, перамяшчэнне па прыпынках. І калі раней вадзіцель на апошнім крузе мог недзе недаехаць, завярнуць, раней заехаць у парк, сёння гэта практычна выключана, бо усё навідавоку. Плюс ёсць магчымасць рэгулявання руху, вырашэння нейкіх праблемных сітуацый дыспетчарам. А паколькі мы маем інфармацыю пра рух транспарту, то, значыць, можам аб'ектыўна адказваць на скаргі пра яго затрымку. Былі такія выпадкі, калі людзі пісалі такія скаргі: магчыма, ім трэба было спазненне на працу апраўдаць ці яшчэ што. А калі прад'яўляем пасекундную раздрукоўку руху аўтобуса ці тралейбуса, то пытанні здымаюцца.

— А што ў рамках гэтай сістэмы яшчэ засталося зрабіць?

— Засталося тэхнічнае пытанне па бяспецы, інфармацыі, якая перадаецца. Бо калі існуе нейкая сувязь паміж вадзіцелем і цэнтрам кіравання, то яна павінна быць абаронена, каб нехта яшчэ не змог пакіраваць рухам транспарту.

Таксама ў складзе праекта ёсць такі пункт, як «інфармаванне пасажыраў на прыпынках». Спадзяюся, што ў пачатку лютага электроннае табло з'явіцца для тэставай эксплуатацыі на вуліцы Маскоўскай. На ім пасажыры змогуць паглядзець, праз колькі хвілін прыйдзе той ці іншы аўтобус, калі прыйдзе наступны. Скажам, калі ты бачыш, што праз 2 хвіліны прыйдзе наступны аўтобус, то можна і не ламацца ў перапоўнены аўтобус, які ўжо прыйшоў. Ці калі ты бачыш, што твой аўтобус затрымліваецца, то можна скарыстацца іншым транспартам. Таксама табло прадугледжвае бягучы радок, дзе можна аператыўна пускаць інфармацыю пра збоі ў руху транспарту.

Акрамя таго, сістэма збору інфармацыі дазваляе зняць з аўтобуса, тралейбуса, трамвая розную інфармацыю і перадаць на цэнтральны сервер. Напрыклад, падключыўшы спецыяльныя электронныя прылады, мы можам у анлайн-рэжыме мець інфармацыю пра работу, скажам, ацяпляльніка аўтобуса — і сёння ўжо амаль усе ацяпляльнікі салонаў аўтобусаў падключаны да гэтай сістэмы. Плюс мы працягваем аснашчаць аўтобусы тэмпературнымі датчыкамі, якія паказваюць тэмпературу ў салоне. Пачалі мы ўсталёўваць і спецыяльныя датчыкі паліва, дзякуючы якім у рэжыме рэальнага часу мы можам адсочваць узровень паліва ў баку, прадухіляючы магчымыя злівы.

Так што магчымасці гэтая сістэма для далейшага выкарыстання стварае дастаткова значныя — любы бартавы камп'ютар можа быць падключаны да яе і інфармацыя пра транспартны сродак можа быць атрымана дыстанцыйна.

— А ці дазваляе гэтая сістэма вырашаць практычныя пытанні наступнага чыну: вось, напрыклад, я жыву ў Дамброўцы, і ў мяне склалася такое ўражанне, што аўтобусы двух розных маршрутаў ходзяць «паравозікам» — прыязджае 101-ы, за ім адразу — 121-ы. А потым — ніводнага на працягу, можа, дзесяці хвілін. Ці магчыма як-небудзь прааналізаваць расклад руху і развезці гэтыя «паравозікі»?

— Так, мы маем магчымасць такую інфармацыю атрымаць, але аналізаваць і прымаць меры складана — бо, напрыклад, у вас на прыпынку аўтобусы ідуць «паравозікам», а потым — разыходзяцца. І калі мы тут «паравозік» развядзём, то ён можа ўзнікнуць у іншым месцы. Але пытанне правільнае, і ім, безумоўна, трэба займацца больш актыўна.

Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.

Тлумачэнне:

Тэхналагічны ўклад — гэта сукупнасць тэхналогій, характэрных для пэўнага ўзроўню развіцця вытворчасці.

якога мы адправім! Толькі запрашаць трэба выключна выдатных і сапраўдных спецыялістаў. А то аднойчы была сітуацыя, калі прыязджае чалавек з Масквы і чытае лекцыі на англійскай мове. **Патрэбны спецыялісты па прыярытэтных навуковых кірунках. Можа быць, нават Нобелеўскія лаўрэаты.**

Што тычыцца матэрыяльных рэсурсаў, то, безумоўна, у нас не хапае абсталявання. І, вядома, мы павінны яго купляць. Але зноў-такі тут усё ўпіраецца ў фінансавыя рэсурсы: дзе ўзяць грошы? Часткова мы можам прыцягнуць па мадэлі дзяржаўна-прыватнага партнёрства (кажуць жа, што да 10 млрд долараў захоўваецца на руках у насельніцтва) сродкі грамадзян. А гэта адбудзецца, калі запрацуе фінансавы рынак. Другая крыніца: калі мы зменім бізнэс-клімат, то да нас павінны будуць прыйсці ўсё ж такі замежныя інвестыцыі.

— А можа так адбыцца, што, прывабліваючы спецыялістаў вялікімі грашыма, мы зможам вярнуць беларускіх вучоных, якія некалі ад нас з'ехалі?

— Вядома. Напрыклад, у Расіі такое ўжо адбылося. Вельмі шмат спецыялістаў, якія з'ехалі з Расійскай Федэрацыі, са з'яўленнем «Сколкава» пачалі вяртацца. Асабліва гэтаму можа паспрыяць пераход на работу па схеме амерыканскай праграмы SBIR (Small business innovation research). Па гэтай праграме можна стварыць структуры, у якія ўніверсітэт ці даследчы інстытут уносіць сваю інтэлектуальную ўласнасць. Другі дае грошы — і разам яны запускаюць нейкую вытворчасць. Расіяне такі закон прынялі ў маі 2009 года, а дакладней унеслі дапаўненні ў свой закон аб інавацыйным развіцці. І ў нашай праграме так сціпла-сціпла, зусім трошкі гаворыцца аб тым, што ўніверсітэты могуць уносіць сваю інтэлектуальную ўласнасць, а пасля з яе атрымліваць прыбытак. Гэта прынцыповая справа. Таму што шмат універсітэтаў праводзяць даследаванні, робяць справаздачы, якія пасля ставяцца на паліцу. Даследаванне можа быць вельмі добрым, але доктар навук, які яго вёў, не ведае, да каго звярнуцца, як гэта ўсё камерцыялізаваць. А тут ідэя ў тым, каб гэтую справаздачу «прасунуць». Павінен быць менеджар, які зможа знайсці тых, хто захоча ўкласці грошы ў гэтыя даследаванні. Але не проста дзеля куплі гэтых даследаванняў, а каб інтэлектуальная ўласнасць таксама ўваходзіла ва ўстаўны капітал.

— Іншымі словамі, мы пачнём вучыць нашу навуку зарабляць?

— Абсалютна правільна. У гэтай праграме ўпершыню гаворыцца аб камерцыялізацыі навуковых даследаванняў. І гэта правільна. А для чаго ж яны ствараюцца? Навука павінна працаваць на нашу эканоміку.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Барыс ДЗЕМІДОВІЧ:

«У XXI СТАГОДДЗІ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ПРАЦУ КАНДУКТАРАЎ — ГЭТА НОНСЭНС»

ЧУТКІ пра тое, якія змены чакаюць пасажырскі транспарт Мінска, ходзяць самыя розныя: пачынаючы ад усталёўкі турнікетаў у аўтобусах і заканчваючы дыферэнцыянаванай аплатай у залежнасці ад кіламетражу. Пра тое, які ж змены насамрэч чакаюць камунальны транспарт сталіцы, а таксама пра ўкараненне аўтаматызаванай сістэмы аплаты праезду і пра сістэму навігацыйнага забеспячэння мы пагутарылі з Барысам ДЗЕМІДОВІЧАМ — першым намеснікам генеральнага дырэктара, галоўным інжынерам дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс».

— Барыс Анатольевіч, давейце пачнём з, бадай, самага хвалюючага гараджан пытання: у мінскіх аўтобусах будуць турнікеты?

— Магу сказаць дакладна — турнікетаў не будзе. Замест іх будуць спецыяльныя электронныя прыборы — так званыя валідатары. Яны будуць размешчаны на поручнях замест кампосцераў. І праезд трэба будзе аплачваць з дапамогай бескантактнай смарт-карткі (падобная картка ўжо ёсць у метрапалітэне. — **Аўт.**). Прыклаўшы яе да экрана аднаго з валідатараў, можна будзе ўбачыць на экране, адбылася аплата ці не. На бескантактнай карце ўся неабходная інфармацыя па аплаце «зашыта» ў чыпе. І за такой карткай будучыня — гэты электронны прыбор павінен быць адзіным і для метрапалітэна, і для наземнага транспарту. Бо электронны чып дазваляе запісаць розныя камбінацыі — і па часе, і па відах транспарту, і па колькасці паездак. Ну а верх дасканаласці — запіс на картку «электроннага кашалька» ў выглядзе нейкіх транспартных адзінак: вы папаўняеце яе на пэўную суму, а потым карыстаецеся транспартам, пакуль гэтая сума не спішацца з карткі.

І гэты «электронны кашалёк» дазволіць рэалізаваць аплату праезду ў залежнасці ад адлегласці: неабходна будзе адзначыць карту пры пачатку паездкі і ў канцы. Умоўна кажучы, вы адзначылі карту на ўваходзе ў метро — у вас спісаўся поўны кошт паездкі. Але калі вы праехалі толькі 3 станцыі метро і на выхадзе адзначылі картку, то вам пэўная сума вернецца назад. Што тычыцца наземнага транспарту, то тут тое самае: адзнака карты павінна быць у пачатку паездкі і ў канцы. Калі ж адзнакі на выхадзе няма, то проста спішацца ўвесь кошт паездкі. Прычым варта заўважыць, што пакіламетровай аплаты праезду не будзе — ва ўмовах гораду адзінкай вымярэння будзе прыпынак. Так што тыя размовы, што ледзьве не заўтра трэба будзе плаціць у залежнасці ад таго, якую адлегласць праехаў, — не адпавядаюць рэчаіснасці, бо гэта не першы этап рэалізацыі праекта.

— Колькі каштуе рэалізацыя такой сістэмы і на працягу якога часу плануецца ажыццявіць гэты праект?

— Сродкі на гэта неабходны значныя: у цэлым мы ацэньваем кошт сістэмы прыкладна ў 20 мільёнаў долараў. Гэта вялікія грошы, таму сёння складана казаць пра нейкае разавае адшукванне такіх сродкаў для рэалізацыі сістэмы, скажам, на працягу года. Тэхнічна гэта магчыма з прыцягненнем нейкіх старонніх кампаній, якія займаліся падобнымі маштабнымі праектамі, але сёння мы бачым іншы шлях у выглядзе паэтапнай рэалізацыі. Магчыма, яна расцягнецца, але пры гэтым будуць максімальна прыцягнуты беларускія распрацоўшчыкі праграмнага забеспячэння і вытворцы абсталявання (напрыклад, тых жа валідатараў). Што тычыцца 2012 года, то сёлета мы плануем весці работу, звязаную ў асноўным з метрапалітэнам. Бо сістэма, якая сёння існуе, патрабуе развіцця. Вядома, яна поўнасцю працаздольная, але не адпавядае сённяшняму дню — пачынаючы ад магнітных картак, якія ствараюць шэраг праблем, заканчваючы тарыфнай палітыкай (бо цяпер картка не дазваляе рэалізаваць шэраг камбінацый па аплаце праезду). Праект развіцця сістэмы ў метрапалітэне мае на ўвазе стварэнне некалькі ўзроўняў. Ніжні ўзровень — гэта станцыя, сярэдні — аб'яднанне станцый адной лініі, верхні ўзровень — аб'яднанне ўсяго метрапалітэна са стварэннем адзінага сервера і поўнага цэнтралізаванага кіравання, збору і захоўвання інфармацыі.

Таксама сёлета пры спрыяльным развіцці падзей мы плануем выйсці з бескантактнай карткай і на наземны транспарт. Праўда, пакуль аснашчаць валідатарамі рухомы састаў не будзем, таму на картцы будзе запісаны від транспарту і тэрмін дзеяння. Паколькі візуальна такую картку не праверыш, у кантралёраў пасажырскага транспарту з'явіцца ручныя тэрміналы, якія будуць паказваць тое, што запісана на карце.

У наступным годзе будзем думаць пра аснашчэнне рухомага саставу валідатарамі, бо гэта адна з найбольш дарагіх частак праекта. На адзінку транспарту іх трэба не менш за 5 штук, а з улікам таго, што ў нас задзейнічана 2300 транспартных адзінак, — гэта ўжо будзе вялікая колькасць — дзясяткі тысяч валідатараў. Плюс дадатковае абсталяванне на рухомым саставе, плюс стварэнне працэсінгава-эмісійнага цэнтра для ўліку продажу і аплаты і г. д. Так што гэта задачы не танныя, але мы імі будзем займацца.

— Ёсць прапановы з беларускіх ці замежных фірмаў па ўкараненні гэтай сістэмы?

— Ёсць беларускія фірмы, якія займаюцца ў гэтай галіне або сумежнай. Але сістэма разнапланавая — гэта і праграмнае забеспячэнне, і абсталяванне, і яго мантаж. І ўніверсальнай фірмы, якая робіць усе гэтыя віды работ, па сутнасці няма. Таму будзем прыцягваць тых, хто зможа выконваць такія работы на нейкіх конкурсных умовах. Таксама плануем вызначыць нейкага генеральнага інтэгратара, які будзе весці ўвесь праект.

— Вы сказалі, што агульны кошт укаранення аўтаматызаванай сістэмы аплаты праезду ў камунальным пасажырскім транспарце ацэньваецца прыкладна ў 20 мільёнаў долараў. Гэтыя сродкі плануецца паступова закладваць у цану білета?

— Не, тарыф ніяк не ўвязаны з укараненнем гэтай сістэмы. Пытанне ні ў якім разе не ставіцца так, каб зрабіць гэта за кошт пасажыраў. Гэта робіцца для пасажыраў, але не за іх кошт.

— А якая асноўная мэта ўкаранення аўтаматызаванай сістэмы — ісці за прагрэсам, павялічваць зборы, рабіць больш зручным пасажырскі транспарт?

— Калі казаць пра павелічэнне збораў, то для гэтага няма чагосьці лепшага за сістэму кандуктараў. Напрыклад, сістэма, укараненая ў Казані на наземным транспарце, поўнасцю пабудавана на кандуктарах: яны працуюць з ручнымі валідатарамі, якія, акрамя функцыі кантролю, яшчэ і маюць функцыю спісання паездак. Вось такая сістэма накіравана менавіта на збор даходаў. А мы адназначна лічым, што ў XXI стагоддзі захоўваць кандуктараў — гэта нонсэнс. Дый гэта не тая прафесія, куды можна прыцягнуць людзей і забяспечыць поўнае ўкамплектаванне штату. Па-другое, каля 30% сабранай кандуктарам выручкі ідзе на тое, каб акупіць яго работу. Так што асноўныя мэты — гэта, безумоўна, прагрэс, зручнасць для пасажыра, безнаяўныя разлікі і г. д. А што тычыцца эканамічнага эфекту, то мы лічым, што ён будзе, але сёння казаць пра нейкія канкрэтныя лічбы цяжка, бо гэта магчыма толькі пры ўкараненні сістэмы, пры нармальным разуменні сітуацыі пасажырамі (тут таксама немалаважныя іх паводзіны і стаўленне) і пры нармальных метадах уздзеяння на пасажыраў. Калі казаць пра апошні складнік, то, напрыклад, у Санкт-Пецярбургу штраф за безбілетны праезд сёлета павышаецца са 100 расійскіх рублёў да 1000 (каля $30). Гэта ўжо дастаткова вялікая сума. Яны зразумелі, што трэба ўздзейнічаць на пасажыра, бо ёсць людзі, якія разумеюць і плацяць, а ёсць «зайцы», якіх трэба прымусіць плаціць.

— Калі я правільна зразумеў, то і ў «Мінсктрансе» спадзяюцца на свядомасць гараджан, але кантралёры па-ранейшаму застануцца?

— Так. Праўда, з павелічэннем штату кантралёраў таксама ёсць пытанні. Не хочуць ісці людзі ў кантралёры, бо цяжка сёння змагацца з нашымі пасажырамі-безбілетнікамі. Хаця ёсць і іншая нядобрая тэндэнцыя: калі людзі не сварацца, а проста аддаюць гэты штраф у 7,5 тысяч. Бо «закрыць» увесь горад кантралёрамі нельга, і чалавек разумее — нават калі ён за месяц у лепшым выпадку 3 разы пападзецца, то гэта будзе ўсё адно танней за праязны...

У лютым у Мінску з'явіцца першае электроннае табло на прыпынку?

— Наколькі я ведаю, зараз у Мінску ўжо рэалізуецца адзін інавацыйны праект — укараненне сістэмы навігацыйнага забеспячэння і перадачы звестак у наземным пасажырскім транспарце. Раскажыце, на якім этапе зараз знаходзіцца гэты праект?

— У прынцыпе, сістэма рэалізавана дастаткова аб'ёмна і поўна — засталося толькі некалькі элементаў для поўнага завяршэння праекта. У 2012 годзе мы выканаем гэтыя работы. На сёння ўвесь рухомы састаў прадпрыемства абсталяваны навігатарамі. Магчыма, вы бачылі іх у вадзіцеля на панэлі — там на дысплэі ідзе інфармацыя з раскладам руху, ёсць магчымасць звязацца з дыспетчарам. А ўся інфармацыя пра транспартны сродак перадаецца ў цэнтр упраўлення рухам, які знаходзіцца на Партызанскім праспекце.

Для чаго зроблена гэтая сістэма? Па-першае, для кантролю за працай кіроўцы. (Барыс Анатольевіч паказвае на сваім камп'ютары карту Мінска, па якой рухаюцца маленькія кропачкі — аўтобусы, тралейбусы, трамваі. — **Аўт.**). Вось рух транспарту ў рэальным часе. Можам націснуць на любы транспартны сродак і ўбачыць поўную інфармацыю: ідзе ён па раскладзе ці спазняецца і г. д. Гэтая інфармацыя збіраецца, назапашваецца, і можна прааналізаваць праз пэўны час працу асобнай рухомай адзінкі, перамяшчэнне па прыпынках. І калі раней вадзіцель на апошнім крузе мог недзе недаехаць, завярнуць, раней заехаць у парк, сёння гэта практычна выключана, бо усё навідавоку. Плюс ёсць магчымасць рэгулявання руху, вырашэння нейкіх праблемных сітуацый дыспетчарам. А паколькі мы маем інфармацыю пра рух транспарту, то, значыць, можам аб'ектыўна адказваць на скаргі пра яго затрымку. Былі такія выпадкі, калі людзі пісалі такія скаргі: магчыма, ім трэба было спазненне на працу апраўдаць ці яшчэ што. А калі прад'яўляем пасекундную раздрукоўку руху аўтобуса ці тралейбуса, то пытанні здымаюцца.

— А што ў рамках гэтай сістэмы яшчэ засталося зрабіць?

— Засталося тэхнічнае пытанне па бяспецы, інфармацыі, якая перадаецца. Бо калі існуе нейкая сувязь паміж вадзіцелем і цэнтрам кіравання, то яна павінна быць абаронена, каб нехта яшчэ не змог пакіраваць рухам транспарту.

Таксама ў складзе праекта ёсць такі пункт, як «інфармаванне пасажыраў на прыпынках». Спадзяюся, што ў пачатку лютага электроннае табло з'явіцца для тэставай эксплуатацыі на вуліцы Маскоўскай. На ім пасажыры змогуць паглядзець, праз колькі хвілін прыйдзе той ці іншы аўтобус, калі прыйдзе наступны. Скажам, калі ты бачыш, што праз 2 хвіліны прыйдзе наступны аўтобус, то можна і не ламацца ў перапоўнены аўтобус, які ўжо прыйшоў. Ці калі ты бачыш, што твой аўтобус затрымліваецца, то можна скарыстацца іншым транспартам. Таксама табло прадугледжвае бягучы радок, дзе можна аператыўна пускаць інфармацыю пра збоі ў руху транспарту.

Акрамя таго, сістэма збору інфармацыі дазваляе зняць з аўтобуса, тралейбуса, трамвая розную інфармацыю і перадаць на цэнтральны сервер. Напрыклад, падключыўшы спецыяльныя электронныя прылады, мы можам у анлайн-рэжыме мець інфармацыю пра работу, скажам, ацяпляльніка аўтобуса — і сёння ўжо амаль усе ацяпляльнікі салонаў аўтобусаў падключаны да гэтай сістэмы. Плюс мы працягваем аснашчаць аўтобус

У лучнасці братняй

«...СЛАВЯНЕ МАЮЦЬ ЧЫП УПАРТАСЦІ»

ЧАРНАГОРСКІ пісьменнік Слабадан ВУКАНАВІЧ — часты госць у Беларусі. Ужо некалькі гадоў запар удзельнічае ў міжнародных «круглых сталах» «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», што арганізоўваюць Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва» ў час святкавання Дня беларускага пісьменства. Некалькі слоў для знаёмства перад гутаркай з добрым сябрам беларускай літаратуры. Нарадзіўся Слабадан у 1944 годзе. Жыве ў Падгорыцы. Прафесійна займаецца літаратурай. Выдаў шэраг паэтычных зборнікаў з такімі сімпатычнымі назвамі, як «Зорныя пёры», «Здымкі касеты касмічнага карабля», «Касмічнае перасяленне Мантэнэгра», «Куды нам далей», «Лодка — лыжка», «Крылатыя караблі нясуць златавустага Іераманаха», «Ты мне не паверыш, Амалія стала ветраком», а таксама — кнігі прозы «Пяць лібрэта для балета», раман «Ключ — Маятнік». Аўтар кніг для дзяцей. Творы пісьменніка прадстаўлены больш як у 30 анталогіях, калектыўных зборніках. Яго вершы і «гульняказы» ўключаны ў падручнікі для васьмігадовай (дзявяцігадовай) школы «Як гэта можна» і «Цуды чытання». Творы Слабадана перакладзены на англійскую, рускую, французскую, беларускую, італьянскую, арабскую, польскую, венгерскую, румынскую, славенскую, македонскую, турэцкую, балгарскую і албанскую мовы.

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

— Слабадан, раскажыце, калі ласка, крыху пра сучасную літаратурную сітуацыю ў Чарнагорыі. Як яна складваецца пасля распаду Югаславіі? Ці ёсць Саюз пісьменнікаў? Колькіх паэтаў, празаікаў, драматургаў ён аб'ядноўвае?

— Да распаду Югаславіі ў асацыяцыі пісьменнікаў Чарнагорыі было каля 500 сяброў. Калі браць у разлік невялікую колькасць насельніцтва ў нашым краі, то гэта, відавочна, добры паказчык. Чарнагорыя заўжды была вядомая як краіна мастакоў і пісьменнікаў. Праўда, літаратары адпраўляліся ў Белград, і там у сямідзясятыя гады мінулага стагоддзя сярэдняе пакаленне пісьменнікаў — лепшых, заўважу, пісьменнікаў Югаславіі — у большасці складалася з чарнагорцаў. З распадам Югаславіі распалася і Асацыяцыя пісьменнікаў Чарнагорыі, з яе сфарміраваліся дзве арганізацыі. Тых, хто за цэласнасць Югаславіі, і тых, каму па душы суверэнітэт Чарнагорыі.

— Ці выходзяць у вашай краіне літаратурна-мастацкія часопісы? Якімі тыражамі? Хто з'яўляецца іх асноўным чытачом?

— Цяпер рэгулярна выходзяць толькі тры часопісы, а раней было сем. На пачатку 2011 года я стварыў часопіс (ён называецца «Quest»), які носіць міжнародны характар. У гэтым выданні прадстаўляецца нацыянальная культура ў свеце і іншыя культуры, літаратуры ў Чарнагорыі. Друкуецца шмат перакладаў. Рэдакцыйная рада складаецца з пісьменнікаў з Люксембурга, Ірландыі, Беларусі, Польшчы, Сербіі і Чарнагорыі. Спадзяюся, што колькасць замежных аўтараў будзе з года ў год у нас павялічвацца. Часопісы раней у нас выходзілі накладам не менш за 1 тысячу асобнікаў. Зараз у асноўным — 500 экзэмпляраў. Тыражы дзіцячых часопісаў — ад 5 да 14 тысяч экзэмпляраў.

— Ці нашмат у параўнанні з часамі Югаславіі скараціліся тыражы кніг пісьменнікаў Чарнагорыі?

— І тыражы кніг істотна зменшыліся. У асноўным — 500 экзэмпляраў. Нават некалькі гадоў таму кніга вядомага сербскага пісьменніка Міларада Павіча выйшла накладам у 500 асобнікаў. Гэта несумненна сведчыць пра крызіс чытача і чытання. Чарнагорыя — маленькі кніжны рынак. Хаця на чарнагорскай мове можна чытаць і ў Сербіі, Харватыі, Босніі і Герцагавіне.

— А тыражы паэтычных зборнікаў...

— І яны роўныя 500 экзэмплярам. Радзей — 1000.

— На якіх мовах пішуць і выдаюцца пісьменнікі Чарнагорыі?

— У асноўным на чарнагорскай, сербскай, баснійскай і харвацкай. Албанцы пішуць на албанскай мове.

— Наколькі трывалыя літаратурныя сувязі з астатнім светам? Ці падтрымліваеце вы стасункі з пісьменнікамі іншых краін былой Югаславіі?

— Чарнагорцы зараз упершыню ўзнавілі супрацоўніцтва з усімі былымі рэспублікамі. Прызнацца, і я раней больш друкаваўся за межамі Чарнагорыі, у іншых рэспубліках, і іншых краінах. Міністэрства культуры нашай краіны прадэкларавала ўзнаўленне новых адносін з усім светам. Як яно атрымаецца, яшчэ паглядзім.

— Хто з пісьменнікаў заваяваў зараз найбольшую ўвагу чытачоў Чарнагорыі?

— Самая шырокая ўвага чытачоў — да твораў маладога празаіка Огнена Спахіча. У яго дзве ўзнагароды — адна з Босніі, другая з Румыніі. Фарміруецца маладое, сучаснае пакаленне. Пажылыя пісьменнікі, з сацыялістычнага перыяду, абцяжараны сацрэалістычнай літаратурай. Маладыя ў большасці сваёй ведаюць замежныя мовы, карыстаюцца інтэрнэтам, жывуць ужо ў новай — камп'ютарнай эры, якая так ці іначай шмат чаго прыўносіць у літаратурны працэс. Шкада, праўда, што моладзь больш чытае замежных пісьменнікаў, чым творы сваёй, нацыянальнай, літаратуры. Хіба ж не культура — аснова нацыі?! Нацыянальнае ўсё ж павінна зберагацца, ушаноўвацца. Як, напрыклад, робіцца ў вас, у Беларусі. Адна толькі Нацыянальная бібліятэка ў Мінску бачыцца мне звышпадзеяй сённяшняга часу, гэткай Вавілонскай бібліятэкай.

— Слабадан, вы — часты госць у Беларусі. Ці параўноўваеце літаратурную сітуацыю ў Беларусі і Чарнагорыі?

— Я часта прыязджаю ў Беларусь, і, відаць, ніхто ў Чарнагорыі не ведае беларускую літаратуру лепш за мяне. Са старадаўняга чытаў Францыска Скарыну, Сімяона Полацкага, Паўлюка Багрыма, Вінцэнта Каратынскага, Францішка Багушэвіча. Чытаў і чытаю Янку Купалу, Максіма Багдановіча, Алеся Разанава, Анатоля Сыса, Алеся Бадака, Віктара Шніпа, Міколу Мятліцкага... Літаратурныя сітуацыі, калі браць пэўны гістарычны аспект, у нашых краінах у асноўным падобныя. Хаця сучасная Беларусь надае культуры шмат большую ўвагу, чым Чарнагорыя сёння.

А між тым, калі ў нас ішла вызваленчая барацьба, ужо ў 1494 Чарнагорыя мела друкаваную кнігу. Дзіўна, што цяпер мы так мала апякуемся пра прысутнасць культуры ўвогуле ў свеце. Здараецца, што чарнагорцы праслаўляюць іншыя краіны і тым самым нагадваюць пра нашу нацыю. Веру, што ў Чарнагорыі ўсё ж павернуцца да сваіх карэнняў, да саміх сябе.

— Каго асабіста вы перакладаеце з беларускіх пісьменнікаў?

— У часопісе «Арс» выйшла падборка з твораў 10 беларускіх паэтаў. Друкуюцца беларускія аўтары ў «Настаўніцкай газеце» і «Славянскім весніку». Гэта ўжо — у перакладах вашага суайчынніка Івана Чароты. З маёй прапановы пісьменнік і перакладчык Душан Джурышыч пераклаў у часопісе «Новыя сустрэчы», а таксама для «Quest» вершы Алеся Бадака і Міколы Мятліцкага. Зараз мы рыхтуем разам з Іванам Чаротам таксама для «Quest» пераклады вершаў Віктара Шніпа, якога лічу адным з самых цікавых паэтаў Беларусі.

— Да чаго ў асноўным тэматычна прывязана сучасная чарнагорская літаратура? Раскажыце хаця б пра асноўныя тэмы сучаснай прозы...

— Пакуль старэйшае пакаленне пісала пра вайну і рэвалюцыю, маладыя апрацоўвалі новыя тэмы: вынаходлівасць, кемлівасць у жыцці, клопаты пра тое, як увогуле выжыць у складаным свеце, пошукі ўласнага «я», лёс новага пакалення, беспрацоўе... Моладзь адчувае сябе страчаным пакаленнем. Пра гэта і піша. Заўважу з гісторыі літаратуры, што якраз страчанае пакаленне і стварала ў розных абставінах найбольш запамінальныя, яркія творы. Бо ў страчанага пакалення абвостранае жаданне вызначыць свой час, абазначыць сістэму каардынат, у якіх даводзіцца жыць.

— Часта спрачаюцца на тэму, наколькі літаратура павінна адлюстроўваць рэальнасць, навакольную рэчаіснасць... А вы асабіста што думаеце з гэтай нагоды?

— У мяне складваецца ўражанне, што нам, тым, хто пакаштаваў сацыялістычны лад жыцця, цяжка ўбачыць, разгледзець новы час, нават складана разабрацца ў ім. Пра гэта я гаварыў падчас пісьменніцкіх сустрэч, «круглых сталоў», канферэнцый у Мінску, Гомелі, Смаргоні. Мы, чарнагорскія пісьменнікі, не павінны пісаць тое ж, што пішуць у Расіі, Амерыцы, Францыі, Беларусі... Я пішу па-свойму, іншыя — так, як яны лічаць магчымым, як падказвае ім іх нацыянальны код. Багацце і развіццё ў тым, што мы ўсе розныя, не падобныя адно да аднаго. Сумна штодня есці адны і тыя ж прысмакі, якімі б салодкімі яны ні былі. Калі я гавару пра перавагу электроннай кнігі, то не таму, што я станаўлюся выключна на пазіцыі яе развіцця. Я канстатую час, характар яго развіцця. Электронная кніга не зважае на маю і вашу волю. Некаторыя, праўда, пасля заўважылі, што я захапляюся электроннай кнігай, але гэта не так. Я проста прызнаю рэальнасць. Ніхто не здольны спыніць кола цывілізацыі. У мяне складваецца ўражанне, што ў нас, у славян, ёсць асаблівы чып упартасці. А можа, гэта чып большай ступені чуласці нашай душы? Мы не можам мірыцца з многімі фактамі, з некаторымі, здавалася б, ісцінамі. Чалавек — гэта кола, якое выпрацоўвае святло, выпрацоўвае і цемру, стварае радасць, боль, смутак. Чалавек сам усё прыдумвае і сам стварае...

Вялікі чарнагорскі паэт Пётр Петравіч Негаш гаварыў: «Стакан жоўці шукае стакан мёду, змешанае лягчэй за ўсё піць». Значыць, і творчасць — з мёду і горкасці, з радасці і суму. Хіба гэта не падобна на славянскую медавіну, медавуху?..

Гутарыў Кастусь ЛЕШНІЦА.
Падгорыца — Мінск.

ООО «Элитмаст» в лице ликвидатора ЗАО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг» –

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 31.01.2012 г. ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА

по продаже недвижимого имущества ООО «Элитмаст» на следующих условиях:

Лот № 1 – Административное помещение, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 10, инв. № 400/D-111425 общей площадью 17,0 кв.м. Начальная цена торгов – 195 500 000 руб. без НДС.

Лот № 2 – Административное помещение, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 20, инв. № 400/D-111429 общей площадью 21,6 кв.м. Начальная цена торгов – 248 400 000 руб. без НДС.

Лот № 3 – Административное помещение, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 23, инв. № 400/D-111430 общей площадью 12,8 кв.м. Начальная цена торгов – 147 200 000 руб. без НДС.

Лот № 4 – Административное помещение, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 25, инв. № 400/D-111432 общей площадью 27,0 кв.м. Начальная цена торгов – 310 500 000 руб. без НДС.

Лот № 5 – Административное помещение, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 26, инв. № 400/D-111433 общей площадью 22,8 кв.м. Начальная цена торгов –262 200 000 руб. без НДС.

Лот № 6 – Административное помещение, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 28, инв. № 400/D-111435 общей площадью 13,1 кв.м. Начальная цена торгов –150 650 000 руб. без НДС.

Лот № 7 – Торговое помещение, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 1, инв. № 400/D-111405 общей площадью 129,5 кв.м. Начальная цена торгов – 3 043 250 000 руб. без НДС.

Лот № 8 – Торговое помещение, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Тимирязева, д. 10, корп. 1, пом. 1, инв. № 400/D-111417 общей площадью 53,1 кв.м. Начальная цена торгов – 1 247 850 000 руб. без НДС.

Часть помещений имеют обременения долгосрочной аренды.

Шаг торгов – 5% от начальной цены лота.

Заявки на участие в торгах принимаются до 30.01.2012 г. по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, оф. 2304.

По вопросам участия в торгах обращаться по тел. +37529 166 85 12.

Задаток для участия в торгах – 10 % от стоимости каждого лота.

Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 30 января 2012 года (включительно) на р/с ООО «Элитмаст» № 3012002530019 в ОАО «Технобанк» ф-л г. Гродно, код 857.

Заключение договора в течение 5 (пяти) дней с момента проведения торгов. Оплата приобретенного объекта – в течение 7 (семи) календарных дней с момента заключения договора.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05 мая 2009 года № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ВАДОХРЫШЧАНСКАЕ КУПАННЕ НЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЦАРКОЎНАЙ ТРАДЫЦЫЯЙ

ПРА гэта ў прэс-цэнтры газеты «Комсомольская правда» в Белорусии» нагадаў клірык Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора протаіерэй Сергій ГАРДУН.

— Малавядома, што ў богаслужбовых кнігах ёсць указанне на перавагу свята Вадохрышча ў параўнанні са святам Раства, — паведаміў журналістам айцец Сергій. — Свята называецца «Богаяўленне», бо Хрыстос паўстаў перад людзьмі не толькі як Чалавек, але і як Бог, пра што было пацвярджэнне Бога Айца — голас з неба, і сыходжанне Духа Святога ў выглядзе голуба. Богаяўленне — гэта яшчэ і з'яўленне Бога ў выглядзе Тройцы.

Свята гэтае дарагое і важнае для вернікаў таму, што з яго бярэ пачатак хрысціянскае хрышчэнне: Хрыстос, святы і бязгрэшны, які не патрабуе сам ніякага ачышчэння і асвячэння, сваім прачыстым целам спусціўся ў раку Іардан, асвяціў воды іарданскія і, узяўшы на Сябе грахі ўсяго свету, змыў іх. Такім чынам, тыя воды сталі здольныя ўздзельнічаць у нашым духоўным адраджэнні. Таінства хрышчэння, якое адбываецца ў Царкве і толькі аднойчы за ўсё жыццё, — гэта таінства духоўнага ачышчэння і адраджэння чалавека.

— Што тычыцца традыцыі вадохрышчанскіх купанняў, да нядаўняга часу яна была вельмі рэдкай і малавядомай, — сказаў айцец Сергій Гардун. — Сам я нарадзіўся і вырас у традыцыйнай праваслаўнай сям'і ў Заходняй Беларусі, і ніколі не чуў пра такую традыцыю. Я не ведаю ні мемуараў, ні спасылак на тое, што яна была распаўсюджана раней. Думаю, традыцыя гэта з'явілася ўжо пасля распаду Савецкага Саюза, і яна хутчэй народная, чым царкоўная.

— Іншая справа, калі на Вадохрышча ў палонку акунаюцца людзі, якія ўвесь час сябе загартоўваюць, — падкрэсліў айцец Сергій. — Але гэта зусім не абавязкова прывязваць да хрысціянскага свята. Ніякай духоўнай сувязі паміж масавым купаннем у палонцы і святам Хрышчэння Гасподняга няма.

Тыя, хто жадае ўзяць удзел у свяце, павінны 18 студзеня вытрымаць пост, прыйсці на ўрачыстае набажэнства, набраць асвячонай вады, якую потым на працягу года можна захоўваць і з набожным пачуццём піць. Тыя, хто даўно не спавядаўся і не прычашчаўся — могуць паспавядацца і прычасціцца ў гэты дзень. Гэта і ёсць удзел у свяце, сказаў святар. Што тычыцца акунання ў палонку — гэта мае адносіны альбо да забавы, альбо да аздараўлення, альбо да моды, толькі не да Царквы.

— Мы з хваляваннем і жахам чакаем 19 студзеня, калі на выратавальную станцыю, якой карыстаюцца члены нашага клуба (а гэта 100 чалавек), прыйдуць некалькі тысяч, прычым гэта будуць як прыхаджане праваслаўных храмаў, так і нецвярозыя ўдальцы, а нехта прывядзе з сабой маленькіх дзяцей, што, на мой погляд, зусім недапушчальна, — дадаў **старшыня Клуба загартоўвання і зімовага плавання «Камсамольскае возера» Уладзімір ШУЛЬГАН.** — Мы прымаем гэтых людзей, ствараем умовы для масавага акунання і наладжваем меры бяспекі: цёплыя раздзявальні, сходні, брыгады міліцыянераў, медыкаў і вадалазаў. Між тым эмацыйны пад'ём, дзякуючы святу і масавасці, такі вялікі, што мне невядомыя выпадкі, каб нехта захварэў, нягледзячы на тое, што ў палонку акунаюцца непадрыхтаваныя людзі. «Маржы» ведаюць, што да зімовага купання трэба рыхтавацца хаця б са жніўня: штодня загартоўвацца, акрамя таго, патрэбна псіхалагічная падрыхтоўка.

— З медыцынскага пункту погляду купанне ў палонцы — востры кароткачасовы стрэс, які можна параўнаць са скачком з парашутам, наведваннем крыясаўны альбо з моцнай трэніроўкай, — кажа **Генадзь ЗАГАРАДНЫ, загадчык кафедры спартыўнай медыцыны БелМАПА.** — Калі чалавек упэўнены, што яго арганізм з такой нагрузкай паспяхова справіцца, ён можа гэта паспрабаваць, але трэба памятаць, што з узростам здольнасць нашага арганізма да адаптацыі зніжаецца, і калі ёсць хранічныя захворванні, яны могуць абвастрыцца. Таму як пункт адліку для пачатку новага ладу жыцця, больш здаровага і ўпарадкаванага, 19 студзеня — добрая нагода, але кожны чалавек павінен усё добра абдумаць і ўзважыць свае магчымасці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Факт

КІТАЙСКІЯ МАСТАКІ— НА ВЫСТАВЕ Ў МІНСКУ

Выстава кітайскіх мастакоў адкрылася 16 студзеня ў сталічным Палацы мастацтваў.

На экспазіцыі прадстаўлена больш як 100 работ мастакоў і каліграфаў Цэнтральнага інстытута каліграфіі і жывапісу Музея па вывучэнні культуры і гісторыі Кітайскай Народнай Рэспублікі. Сярод іх вядомыя ў сябе на радзіме і за яе межамі Ма Чжэньшэн, Ван Цзюньшань, Бай Чжэньці і У Ю. У дзень адкрыцця выставы для ўсіх ахвотных прайшоў майстар-клас аўтараў карцін.

Арганізатарамі выставы выступілі Міністэрства культуры нашай краіны, Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, Беларускі саюз мастакоў і Рэспубліканская мастацкая галерэя. Трэба адзначыць, што госці з Кітая знаходзяцца ў Беларусі з 14 па 20 студзеня. Іх візіт прымеркаваны да знамянальнай даты — 20-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных зносін паміж Беларуссю і КНР.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Схаваў дзічыну на падворку

Работнікі Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі і Шацкай ваенна-паляўнічай гаспадаркі знайшлі месца незаконнай здабычы і разбору лася. Там былі галава, шкура, ногі і вантробы жывёлы. Было гэта паблізу садовага таварыства «Журавінка» ў Уздзенскім раёне.

А неўзабаве высветлілася, што «здабытчык» — мінчанін 1961 года нараджэння. На яго дачным падворку былі знойдзены вантробы яшчэ двух дзікіх жывёл, у тым ліку з адным эмбрыёнам. У мужчыны канфіскавалі дзве паляўнічыя стрэльбы. Ужо заведзена крымінальная справа. Шкода, нанесеная дзеяннямі «паляўнічага», ацэненая як асабліва буйная — 380 базавых велічынь, або звыш 13 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 1 марта 2012 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб.
1	д. Пархово, уч. № 5 623284604501000064	0,1504	11 930 480	1 765 104
2	д. Пархово, уч. № 6 623284604501000065	0,2014	15 976 055	1 765 104
3	д. Силичи, уч. № 1 623284605401000282	0,1548	15 769 476	1 786 104
4	аг. Косино, уч. № 2 623284603201000272	0,1706	18 376 179	1 765 104

Земельные участки ограничений в использовании не имеют.

Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

Аукцион состоится 1 марта 2012 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, ком. 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6. Последний день приема заявлений 27 февраля 2012 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 543 50, 550 56, 554 73.

Мінсельгасхарч Беларусі б'е трывогу

Звязана гэта з успышкамі афрыканскай свіной чумы ў асобных рэгіёнах Расіі. Пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў прэс-цэнтры Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі.

Дзяржаўная ветэрынарная служба Беларусі аператыўна ўводзіць забарону на ўвоз свіней, мяса, а таксама кармоў з рэгіёнаў, дзе зафіксаваны вірус. Інфармацыя аб такіх рэгіёнах пастаянна абнаўляецца на афіцыйным сайце міністэрства (http://mshp.minsk.by/veterenar). Дагаворы ж на пастаўку тавараў, якія былі заключаны раней, прадпрыемствы абавязаны тэрмінова скасаваць. Мясцовыя ўлады, у сваю чаргу, павінны правесці вучэнні па адпрацоўцы дзеянняў аператыўнага рэагавання на выпадак успышкі захворвання.

Для чалавека вірус свіной афрыканскай чумы не ўяўляе небяспекі. Аднак ён можа нанесці немалы эканамічны ўрон. У прыватнасці, урон ад чумы ў Расіі летась склаў больш як 8 млрд рублёў. На жаль, сродкаў для прафілактыкі і лячэння гэтага захворвання пакуль няма.

Надзея ДРЫЛА.

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 3 (714) аддзел рэкламы тэл. 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ 3-пакаёвая кааператыўная кватэра з гаражом, агародам у р/ц Гарадок (2-і паверх, 65 м²) танна, растэрміноўка, або абмен на любое жыллё ў Мінску, прыгарадзе. Варыянты.
Тэл. 8 029 2900710.

❒ Хата 11х7 м, можна на знос. Вёска Галынь Навагрудскага р-на.
Тэл. 8 01597 71479, МТС 2533569.

❒ Дача (садаводства), курортнае месца на возеры Лосвіда, выгоды.
Тэл. 8 029 2900710.

❒ Кажух муж. натур. б/в, у добрым стане, п. 50—52, танна.
Тэл. 80172082878, МТС 7921278.

❒ Новы нямецкі акардэон «Вальтмейстар» за 500 тыс. бел. руб.
Тэл. 8 0214 477085.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже земельного участка гражданам Республики Беларусь в частную собственность

Адрес объекта и его наименование	- Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома, расположенный по адресу: Минская область, Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Снежково, ул. Прудная, 17 площадью 0,1500 га (кадастровый № 621384612601000186). **Начальная цена 16 251 840 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 15 % от предыдущей цены. - Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома, расположенный по адресу: Минская область, Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Снежково, ул. Савиновская, 7 площадью 0,1479 га (кадастровый № 621384612601000182). **Начальная цена 774 879 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 15 % от предыдущей цены.
Порядок оплаты	Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с формированием земельного участка и его государственной регистрацией. Расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и объявления в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона.
Сумма задатка	**10 %** от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис».
Продавец	Ижский сельский исполнительный комитет.
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-Сервис» г. Молодечно, ул. Мира 15.
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение 10% задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Конечный срок и адрес приема заявок	**13.02.2012 г., до 16.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, **8 044 710 74 60.**
Дата, время и место аукциона	**14.02.2012 г. в 15.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

ЛОТ № 1	
Адрес объекта и его наименование	- корпус 16Б (инв. № 16-00044) общей площадью 1216,1 м², год постройки 1987, двухэтажное здание, стены кирпичные, перекрытия ж/б. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67. **Начальная цена: 722 925 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис».
Сумма задатка	10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис».
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме.
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-Сервис».
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Конечный срок и адрес приема заявок	**02.02.2012 г. до 16.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60.
Дата, время и место проведения аукциона	**03.02.2012 г. в 15.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис».

УВАЙСЦІ ЦАРАМІ

На Шчодры вечар карэспандэнты «Звязды» ўзялі ўдзел ва ўнікальным калядным абрадзе

...Мы крочым за дзіўнымі царамі-салдатамі, што пад гармонік і барабан строем маршыруюць па вясковай вуліцы. Цямнее, і замест самаробных шабляў «цары» бяруць факелы... Міжволі адчуваеш, што гэты абрад — не проста прыгожы перфоманс, «пазычаны» ў продкаў, якія яшчэ ў мінулым стагоддзі так абыходзілі семежаўсія хаты. (Абрад цалкам адноўлены па запісах старажылаў, якія ўзгадалі, як на Каляды па вёсцы хадзілі «цары»). Для семежаўцаў — гэта ці не галоўнае свята. За «царамі» ўвязаўся вялікі натоўп. Бабулькі, якія памятаюць яшчэ «цароў» са сваёй маладосці, натхнёна запэўніваюць усіх, хто пытаецца пра абрад: «У нас цары хадзілі, ходзяць і будуць хадзіць!». Нехта заўважае цікаўную дзятву: «А вось і будучыя цары». «А то, пару гадкоў падрасцём і таксама будзем хадзіць», — пагаджаюцца хлопчыкі... Дарэчы, у гэтым годзе па аграгарадку Семежава цары хадзілі двума калектывамі. У другі склад увайшлі мясцовыя школьнікі, якія таксама ўзяліся падтрымліваць адноўленую традыцыю. Раней так і было: па вёсцы адразу маршыравала некалькі гуртоў з маладых хлопцаў.

«Цары» апрануты ў белыя кашулі, падпярэзаныя чырвонымі семежаўскімі паясамі. Паясамі крыж-накрыж перавязаны грудзі, на шыю павязана жаночая хустка, але самае дзіўнае ў вопратцы гэтых калядных герояў — іх высокія папяровыя шапкі з розназаляровымі стужкамі. Паводле легенды, пачалося ўсё ў XVIII стагоддзі, калі ў вёсцы стаяў атрад царскай арміі. Салдаты на Каляды хадзілі па хатах, віншавалі гаспадароў, паказвалі невялікі спектакль, пасля чаго атрымлівалі пачастунак. А калі атрад пакінуў вёску, мясцовыя хлопцы пачалі апранацца ў карнавальныя касцюмы, што нагадвалі форму вайскоўцаў. Праўда, сёння ўжо ўзнікаюць і пэўныя сумненні, а ці былі тыя салдаты.

— Калі паглядзець на дыялогі, што адбываюцца паміж удзельнікамі абраду, яны амаль што тоесныя батлейцы, народнай драме «Цар Максімільян», — заўважае **старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Таццяна Кухаронак.** — Нярэдка выклікае нараканні песня «Пасею я лебяду», што падчас абраду гучыць на рускай мове. Калі і быў атрад рускай арміі, можа, ад яго толькі гэтая песня і ўзята. Астатнія ж тэксты старадаўнія, яны ёсць у батлейцы, а значыць, не могуць быць аднекуль прыўнесены. Магчыма, удзельнікі абраду некалі ўсё ж такі пазычылі песню, таму што пад яе можна маршыраваць — яны ж увесь час строем ідуць па вуліцы. Між іншым, сама гэта песня доўгая, а ў семежаўскім абрадзе выкарыстоўваецца толькі пару радкоў, ды і спяваецца ў арыгінале ад імя жанчыны — казачкі, якая чакае свайго мілага. Напэўна, абрад увабраў у сябе шмат розных рысаў. Семежава было мястэчкам, дзе ўзаемадзейнічалі розныя культуры. Тут часта ладзіліся кірмашы. Што тычыцца абраду, які ладзіцца зараз, — ён цалкам аўтэнтычны, тэксты — дакладна тое, што мы запісвалі ад старажылаў.

Але чаму такі абрад узнік толькі ў гэтай вёсцы? Чаму батлейка толькі тут ператварылася ў жывы тэатр? Магчыма, уплыў аказаў радзівілаўскі тэатр: у XVII—XVIII стагоддзях гэтае мястэчка належала Радзівілам. І нават у XIX стагоддзі тут, паводле пісьмовых крыніц, дзейнічала школа «вяроўчаных скакуноў» (канатаходцаў) і «штукароў» (жанглёраў). Акрамя таго, само мястэчка падыходзіла для вялікіх прадстаўленняў: для Семежава характэрны так званыя «пагонныя дварыны», калі пабудовы на сядзібе размяшчаліся ў адну лінію і злучаліся паміж сабой вялікімі сенцамі. Трэба заўважыць, што і сёння сенцы — адна з самых прыгожых частак дома: тут вісіць шмат тканых і вышываных рэчаў. Семежава было ткацкай сталіцай, у кожнай хаце мелася свая майстэрня. Вырабы адсюль вядомы далёка за межамі не тое што Мінскай вобласці, але і ўсёй краіны. Мясцовыя ўзгадваюць, што сюды пастаянна прыбывалі міжнародныя дэлегацыі і госці часта вывозілі адсюль розныя вырабы. Сёння гэтае рамяство адраджаецца: у аграгарадку адкрыты цэнтр ткацкага мастацтва, дзе займаюцца дзеці і моладзь.

Цікаўлюся ў Таццяны Іванаўны, чым наогул былі Каляды для беларусаў.

— Каляды — самае галоўнае зімовае свята беларускага народа. У ім «закладзена» шмат ідэй. Самая галоўная — гэта спрыянне дабрабыту, здароўю, прыцягненне ўсялякіх даброт да сваёй абшчыны, свайго роду. У адпаведнасці з міфалагічнай свядомасцю (і гэта было яшчэ ў канцы 19 стагоддзя), быццам было два светы — гэты і «той». У «тым» жылі продкі, якія ў час святаў маглі патрапіць у гэты свет. І ў адпаведнасці з міфалагічнай свядомасцю калядоўшчыкі лічыліся прадстаўнікамі таго свету. Казалі: «Дзе каза ходзіць — там жыта родзіць». Людзі верылі, што ў хаце, дзе пабывалі калядоўшчыкі, усё будзе добра. І з такой ахвотай калядоўшчыкаў адорвалі, бо, лічылася, што ўсе дары трапяць продкам. Дарэчы, падчас Каляд забаранялася працаваць. Лічылася: калі свята пакрыўдзіць, яно будзе помсціць. Не працавалі, каб пазбегнуць калецтва дзяцей і жывёлы, якая ў хуткім часе народзіцца. Пасля Каляд (а раней яны пачыналіся 25 снежня) сонца паварочвала на лета. Таму праводзіліся пэўныя рытуальныя дзеянні з разлікам на новы земляробчы год, спрыянне будучаму ўраджаю. Увесь народны каляндар пабудаваны на чаргаванні будняў са святамі. Пасля такога працяглага посту, калі абмежаванні датычыліся не толькі ежы (для моладзі існавала забарона на спевы і танцы), пачыналася свята. І гэта быў самы вясёлы перыяд ва ўсім народным календары, сапраўдны выбух весялосці. Моладзь кожны дзень ладзіла танцы, гульні. Так, адной з функцый абраду «Калядныя цары» было ўсталяванне дашлюбных адносін паміж маладымі людзьмі. Хлопцы, якія ўдзельнічалі ў абрадзе, у першую чаргу хадзілі ў тыя хаты, дзе былі дзяўчаты на выданне. На сабраныя дары два дні ладзіліся вячоркі...

Сёння семежаўцы жартуюць, што ў свет яны ўвайшлі «царамі». Гэта першы і пакуль адзіны беларускі абрад, які рашэннем Міжурадавага камітэта ЮНЕСКА патрапіў у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Дарэчы, адраджацца абрад пачаў у канцы 90-х. Дырэктар Капыльскага раённага краязнаўчага музея Валянціна Шуракова ўзгадала, як тры гады таму, калі ладзіліся «Калядныя цары» быў моцны мароз. Абрад не сталі зацягваць, і некаторыя жыхары крыўдзіліся, што «цары», якія нясуць дабрабыт, да іх у хаты не завіталі. Звычайна, калі «цары» сыходзяць, у хаце накрываецца стол і пачынаецца свята.

Наогул, сам аграгарадок 13 студзеня, калі ладзіцца абрад, ажывае. Прычым яшчэ да таго, як «цары» пачнуць хадзіць па вуліцах. Пасля таго як абрад быў прызнаны на высокім узроўні, у аграгарадку пачалі ладзіцца святы. Калі мы прыбылі ў Семежава, тут гудзеў калядны кірмаш. Амаль увесь аграгарадок у гэты час высыпаў на вуліцы, амаль увесь рыхтаваўся да свята, усміхаўся падчас яго. Разам з прадстаўнікамі мастацкай самадзейнасці пускаліся ў пляс і старыя, і малыя. Гаспадынькі, што частавалі блюдамі нацыянальнай кухні, зацягнулі прыпеўкі. Тутэйшыя і госці, якіх шмат прыехала на свята, далучаліся да гульняў і варажбы...

— Такіх вялікіх святаў раней не было. Іх пачалі ладзіць пасля таго, як абрад адрадзіўся. І, дзякуй Богу, сёння яго заўважылі на сусветным узроўні. Семежава сёння вядома ва ўсім свеце. І людзі гэтым ганарацца. Калі да нас прыязджаюць замежныя госці, то заўсёды здзіўляюцца, як мы маглі ўсё зберагчы да сённяшніх дзён, — заўважае загадчык адзела культурна-масавай і метадычнай работы Капыльскага раённага цэнтра культуры Любоў Галубовіч. — Лічу, што Беларусь адметная сваімі традыцыямі. Тут шмат раёнаў, якія маюць нешта сваё, унікальнае. Можна ўзгадаць і троіцкія, і купальскія абрады. Хацелася б, каб і яны жылі і сталі вядомымі ў свеце.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Усходні гараскоп на тыдзень

Шалям трэба берагчы рэпутацыю, а Скарпіёнам — скараціць да мінімуму зносіны з начальствам

ВАЕН. Будзе часам здавацца, што ўсё немагчымае магчыма, а вы трапілі ў цудоўны свет уласнага дзяцінства. У аўторак вы, хутчэй за ўсё, апыняцеся ў патрэбны час у патрэбным месцы, і праблема, якая ўзнікла нядаўна, будзе знятая з парадку дня. На працы пастаўцеся з увагай да сваіх абавязкаў, не выпускайце з-пад увагі дробязі. У выхадныя дні адпачніце ад мітусні і не адмаўляйцеся ад жадання навакольных вас трохі папесціць.

ЦЯЛЕЦ. Вазьміце сабе за правіла пісаць на тыдзень расклад неабходных да выканання спраў. Ну, або проста напішыце яго хоць на гэты — усё, што не будзе зафіксавана на паперы і вывешана на самым бачным месцы, можна загадзя лічыць нязробленым. Калі першая палова тыдня абяцае вельмі пазітыўныя паказчыкі ў шматлікіх галінах, то ў чацвер і пятніцу лепш не прадпрымаць нічога кардынальна новага і тым больш — глабальнага.

БЛІЗНЯТЫ. Вы толькі выйграеце, калі праявіце такія якасці, як паблажлівасць і цярпенне. У аўторак вы здольныя адным махам расправіцца з мноствам назапашаных неадкладных папяровых спраў. У сераду прадбачлівасць дазволіць пашырыць гарызонты магчымасцяў. У суботу спакойна выслухайце прэтэнзіі з боку блізкіх людзей і паспрабуйце знайсці канструктыўнае выйсце са становішча, якое склалася.

РАК. Такіх інтэнсіўных перажыванняў, як на гэтым тыдні, вы даўно не адчувалі. Добра б яшчэ ўтрымаць іх у тайне або хоць бы не дэманстраваць першым сустрэчным. У аўторак і сераду ўсё, чаго можна было дасягнуць і чаго дамагчыся, вы атрымаеце, а першарадная задача — утрымаць каштоўныя набыцці, каб не шкадаваць пра ўпушчаныя магчымасці. У пятніцу варта надаць пільную ўвагу эстэтычнаму боку справы, бо гэты аспект не толькі палепшыць настрой, але і адкрые перад вамі новыя магчымасці.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні славалюбівыя задумы могуць увасобіцца ў жыццё, калі атрымаецца дзейнічаць вельмі акуратна і прытрымліваць язык — хоць бы на людзях. У сераду не перакладайце рашэнне жыццёва важных пытанняў на чужыя плечы. Калі дзейнічаць дыпламатычна, то ў чацвер вы зможаце ўгаварыць начальства на што заўгодна. Загадзя падрыхтуйцеся да верагодных няўдач у суботу. У нядзелю адкладзіце хатнія клопаты і дазвольце сабе адпачыць.

ДЗЕВА. Залішняя ўразлівасць і спазненні могуць з'явіцца прычынай непрыемных сітуацый, і ўсведамленне таго, што менавіта вы іх ствараеце, вас чамусьці не ўзрадуе. Вядома, таленты і выдатнае валоданне словам — гэта дадатныя якасці, але гаварыць з'едліва ў прысутнасці начальства ўсё ж не варта. Гэта можа прывесці да канфліктнай сітуацыі. Пажадана перайсці на ашчадны рэжым; паспрабуйце ўпісвацца ў рэгламентаваны працоўны графік. Перш чым штосьці змяняць у сваім жыцці, трэба ўзважыць усё «за» і «супраць».

ШАЛІ. Вам неабходна ўмацоўваць свой аўтарытэт і берагчы рэпутацыю. Безумоўнае яднанне нават з разважлівымі і разумнымі людзьмі можа завесці вас у неймаверныя нетры. У чацвер або пятніцу не спрабуйце нікому навязваць уласную думку, гэтым вы толькі адштурхняце ад сябе адданых вам людзей. У пачатку тыдня смелыя распрацоўкі і новыя ідэі будуць адзначаны начальствам, а вынікам можа стаць павышэнне па службе.

СКАРПІЁН. Вы маглі напрыдумваць сабе залішне грандыёзных планаў, можа быць, лепш іх скараціць да рэальнага аб'ёму? Верагодныя камандзіроўкі, якія дазволяць вам адцягнуцца ад некаторых праблем. Зносіны з начальствам па магчымасці скараціце да мінімуму, інакш вашы не ў меру дасціпныя выказванні могуць пацягнуць за сабой канфліктную сітуацыю. У пятніцу да вас могуць завітаць нечаканыя госці.

СТРАЛЕЦ. Не варта здзяйсняць гераічных учынкаў. Не ацэняць. Лепш паспрабуйце справіцца з назапашанымі дробнымі праблемамі. У першай палове тыдня вас можа захліснуць струмень сустрэч, званкоў і папяровай працы, верагодныя і дадатковыя клопаты, звязаныя з арганізацыйнымі мерапрыемствамі. Некаторыя прадстаўнікі вашага знака могуць стаміцца настолькі, што давядзецца экстранна сыходзіць у адпачынак. У пятніцу асцерагайцеся блытаніны ў маёмасных справах.

КАЗЯРОГ. Атрымаеце шанц ва ўсёй красе праявіць свае здольнасці, паказаўшы сябе з лепшага боку. Гэта дапаможа заваяваць заступнікаў. Паспрабуйце пачаць увасабленне ў жыццё сваіх задум, не выключана, што гэтыя пачынанні будуць паспяховыя. Верагодна, што дзякуючы ініцыятыве сяброў вы пяройдзеце на больш прэстыжную і высокааплатную працу.

ВАДАЛЕЙ. У пачатку тыдня верагодная цікавая дзелавая паездка, якая дазволіць пашырыць круг зносін і абяцае новыя магчымасці ў будучыні. Цяпер трэба вучыцца слухаць і чуць навакольных — так вы даведаецеся з гутарак шмат цікавага і станеце мудрэй. Магчыма паляпшэнне ў прафесійных справах. Спрыяльны час для дзелавых здзяйсненняў. Паспрабуйце па-філасофску паставіцца да ўнутранай напругі, бо яна будзе толькі пабочным эфектам сабранасці, якая спатрэбіцца вам для дасягнення мэтаў.

РЫБЫ. Тыдзень можа пацешыць не толькі цікавымі знаёмствамі, але і цёплымі сустрэчамі са старымі сябрамі, якіх вы, магчыма, даўно не бачылі. Вы можаце апынуцца ў эпіцэнтры разнастайных падзей, на шчасце — пераважна радасных. У пачатку тыдня магчыма абвастрэнне адносін з начальствам, і як вынік — згубленае на ўвесь тыдзень жаданне працаваць. Паспрабуйце падрыхтавацца да запланаванай сустрэчы, каб вам было чым пусціць пыл у вочы. У пятніцу інтуіцыя будзе настолькі моцная, што вы зможаце абысціся без высноў, хоць і не варта прытрымлівацца гэтай парады літаральна.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

Моцная бура на моры | Горад у Эстоніі | Балет С.Пракоф'ева «*** і Джульета» | Вельмі заможны чалавек | Супраць-запаленчы сродак | Галінка рабіны з кветкамі або ягадамі

Частка належнай выплаты | Мяккая скура для ботаў | Асаблівы жанр літаратуры | Міні-краіна ў Еўропе | Міфічны правадыр арганаўтаў

Паўзун з доўгім целам | Ядавітая змяя з аспідаў | Рыхлы глыбінны лёд | Буйны прадуктовы магазін | Гармата навясна-га агню | Дзяржанне ў прыладах працы | Сушаны бязнасенны вінаграў

Жаночае футравае паліто | Т.зв. манільская пянька | Сібірскі алень | Цыркавая пляцоўка | Адзін з бакоў свету

Суша, прасунутая ў мора | Рака на Пскоўшчыне | У мусульман: 5-разовая малітва

Месца для рознічнага гандлю | Буйная вымерлая птушка (да 3 м) | «Дзікая ***» — фільм рэжысёра У. Чэха

Біблейскі першачалавек | Плод касавай пальмы

Насценная лямпа | Страва з бульбы ў сібіракой | Японская складовая азбука

Простая грузазахопная прылада | Вострaў у Інданезіі | Драпежнік з лясоў Амерыкі | Кандытарскі выраб: какава з цукрам

Садовая кустовая культура з ягадамі чорнымі, чырвонымі, белымі

6		7	4				3	
	5				6			
	2	8						
7		1		2			9	
		9				2		
	8			5		1		6
						6	1	
			5				7	
	9				7	8		2

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўторaў.

І зноў выратаваў апавяшчальнік

Вясковы жыхар параўнальна нядаўна купіў апавяшчальнік, і прыбор выратаваў яго жыццё. Аб тым, што гарыць цагляны дом у вёсцы Адаменкі Лёзненскага раёна, а дзясятай гадзіне вечара пажарным паведаміў сусед пагарэльца. Гаспадар, пенсіянер 1949 года нараджэння, жыве з жонкай, якая на момант пажару знаходзілася ў суседзяў. Мужчына ў час пажару спаў, але, пачуўшы сігнал апавяшчальніка, прачнуўся і пабег да суседа, які і выклікаў выратавальнікаў. У пакоі былі пашкоджаны сцены і ложак. Мяркуецца, што прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі ацяпляльнага абсталявання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

І ў ход пайшла табурэтка...

У вёсцы Махро Іванаўскага раёна знойдзена цела 51-гадовага чалавека ў яго ўласным доме. Побач валялася табурэтка. Экспертыза ўстанавіла, што смерць наступіла ад моцнага ўдару па галаве. Пад падазрэнне трапіла 43-гадовая сужыцелька няшчаснага, якая адразу чамусьці прапала. Кабету зараз вышукваюць міліцыя.

Яна СВЕТАВА.

АДКАЗЫ на сканворд + судоку

Па гарызанталі: Штором. Катагог. Хром. Рагі. Эга. Шуга. Замя. Сабэа. Мыс. Манто. Іса. Намаз. Рынак. Балеро. Бра. Адам. Арах. Гумі. Кана. Кашалот. Сумятня. Гаючкі. **Па вертыкалі:** Мамба. Стрэп. Тарту. Гастранаом. Рамаа. Мінамёт. Кроз. Асада. Шаакал. Шанкі. Алтэя. Моа. Ясон. Абака. Мадагаскар. Арэна. Гронка. Захад. Гаспадыня. У табэлях.

2	5	8	7	4	3	6	9	1
4	7	9	1	6	5	2	3	8
3	1	6	8	9	2	5	7	4
6	4	1	2	3	8	9	5	7
7	9	3	5	1	4	8	6	2
1	8	2	6	7	9	4	1	3
9	3	4	1	5	7	2	8	6
8	6	5	9	2	1	3	4	7
5	2	7	4	8	6	1	9	3

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.19	17.21	8.02
Віцебск —	9.14	17.04	7.50
Магілёў —	9.09	17.11	8.02
Гомель —	8.58	17.15	8.17
Гродна —	9.33	17.38	8.05
Брэст —	9.26	17.45	8.19

Месяц

Апошняя квадра 16 студзеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Апанаса, Архіпа, Арцёма, Карпа, Марка, Ніканора, Радзівона, Сцяпана.*

К. *Антаніны, Антона, Генрыха, Мар'яна, Расціслава, Юльяна, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Дзве даты

17 студзеня

1600 год — нарадзіўся Казімір Семяновіч, беларускі мысліцель-гуманіст, інжынер, тэарэтык артылерыі. Ён належаў да роду дробных князёў і называў сябе «шляхціч-ліцьвін». Бацькі хацелі, каб іх сын займаўся палітыкай, але ён пачаў спасцігаць таямніцы вайсковай службы, асабліва артылерыю. Дзеля гэтага вывучаў шматлікія навукі: арыфметыку, геаметрыю, механіку, архітэктуру, людвісарства (майстэрства адліўкі гармат), а таксама разьбярства па дрэве і метале. Неўзабаве Казімір дамагаецца прыкметных поспехаў і ўдзельнічае ў вайне Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай і татарамі. Пасля Семяновіч выязджае ў Нідэрланды, дзе прымае ўдзел у Трыццацігадовай вайне. Там ён атрымлівае новы вопыт, знаёміцца з нідэрландскімі фееверкерамі і гарматнікамі. Неўзабаве Семяновіч адважваецца пачаць уласныя эксперыменты. У Нідэрландах у яго была добрая магчымасць пазнаёміцца з еўрапейскай літаратурай па артылерыі і піратэхніцы, з кнігамі па гісторыі і культуры. Аўтар трактата «Вялікае мастацтва артылерыі. Частка першая», у якім апісаў канструкцыі і выкарыстанне гармат і ракет, тэхналогію вытворчасці пораху і іншых матэрыялаў для артылерыі, а таксама ўпершыню прапанаваў ідэю шматступеньчатай ракеты, ракетных батарэй і стабілізатараў да ракет (з дадаткам чарцяжоў). Яго навуковыя пошукі і эксперыменты на многія гады наперад абазначылі шляхі развіцця еўрапейскай артылерыі. Прытрымліваўся гуманістычнага светапогляду, войны лічыў найвялікшым бедствам чалавецтва. Памёр пасля 1651 года.

1847 год — нарадзіўся Мікалай Ягоравіч Жукоўскі — «бацька рускай авіяцыі», заснавальнік сучаснай гідра- і аэрамеханікі. У 1902 годзе пад яго кіраўніцтвам была збудаваная адна з першых у свеце аэрадынамічных труб, а ў 1904-м — створаны першы ў Еўропе аэрадынамічны інстытут. У 1898 годзе ў сваёй прамове «Аб паветраплаванні» ён прадказваў: «Чалавек не мае крылаў і па адносінах вагі свайго цела да вагі мускулаў у 72 разы слабейшы за птушку. Але я думаю, што ён паляціць, абапіраючыся не на сілу сваіх мускулаў, а на сілу свайго розуму».

Цытата дня:

«Дзіўная ўсё-такі рэч інтуіцыя: і адмахнуцца ад яе нельга, і растлумачыць немагчыма».

Агата Крысці (1890—1976), англійская пісьменніца.

Усміхнемся

У 2012-м годзе чакаецца тры пятніцы 13-га і адзін канец свету. Месцамі пахмурна.

☺

Чужы мужык, калі п'яны, такі вясёлы і цікавы, а свой — дурань дурнем!

☺

— Дарагі, ну чаму, калі сусед сваю жонку фатаграфуе, яна падобная на Брыджыт Бардо? А калі ты мяне — атрымліваецца нейкая бамжыха, хоць цяпер у турму саджай!

— Таму што сусед скончыў аператарскі факультэт, а я — Акадэмію МУС па крыміналістычнай экспертызе.

☺

Майму гору не было мяжы, калі я даведалася, што дзверы ў гандлёвым цэнтры адчыняюцца не сілай маёй думкі, а аўтаматычна...



Віншую сватоў **Міхайлу ХРЫСЦЕНКА** з г. Барысава і **Аляксандра АГУРЦА** з г/п Карэлічы з днём нараджэння! Жадаю ім шчасця, здароўя, доўгага жыцця і шмат радасці.

Лугаўская Тамара Мікалаеўна.

Віншуем дарагога пляменніка **Андрэя Паўлавіча ЕМЯЛЬЯНАВА** з 16-годдзем! Здароўя, кахання, поспеху ў вучобе, удачы і ўсяго самага найлепшага.

Цётка Лена і яе сям'я.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 228. Нумар падпісаны ў 19.30 16 студзеня 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12